Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

20 ЛЮТАГА 2016 г. СУБОТА № 33 (28143) Кошт 2100 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

Журналісты — у экстрэмальнай сітуацыі

СТАР. 5–6

Партрэт Міхася Дрынеўскага

СТАР. 9

Навошта мяняюць імёны?

СТАР. 13

ЦЫТАТА ДНЯ

Уладзімір АМАРЫН, міністр фінансаў:

«Дзяржаўны доўг Беларусі на 1 студзеня 2016 года склаў Br328,6 трлн, або 32,5% ВУП пры парогавым значэнні 45%. Летась краіна своечасова і ў поўным аб'ёме выканала ўсе абавязацельствы, звязаныя з абслугоўваннем і пагашэннем дзяржаўнага доўгу. Знешні дзяржаўны доўг склаў $12,4 млрд, або 22,7% ВУП пры парогавым значэнні 25%, унутраны — Br97,4 трлн, або 9,8% ВУП (парогавае значэнне — 20%). Паказчыкі эканамічнай бяспекі, звязаныя з дзяржаўным доўгам, на 1 студзеня 2016 года знаходзяцца ў межах парогавых значэнняў, устаноўленых Праграмай сацыяльна-эканамічнага развіцця Беларусі на 2011—2015 гады».

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 20.02.2016 г.

Долар ЗША	21683,00	▲
Еўра	24091,00	▲
Рас. руб.	283,70	▼
Укр. грыўня	808,31	▼

ISSN 1990 - 763X

■ Да чаго дайшоў прагрэс...

«НЯМА ЗА ШТО» АД БАРЫСА І СЭЛФІ АД ТЭСПІЯНА

Карэспандэнт «Звязды» навучыў гаварыць па-беларуску нават робата





Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

І гэта зусім не жарт. Робат Эрбот, якога ў народзе празвалі Барысам, сапраўды, перадаў прывітанне чытачам «Звязды» па-беларуску. Адбылося гэта на інтэрактыўнай выставе «Баль робатаў», якая распачалася ў Мінску. Летась робаты з усяго свету ўжо гасцілі ў нашай краіне. Але, як кажуць арганізатары, асноўная частка экспанатаў «Балю-2016» — новая, а значыць, новыя і ўражанні. Мы вырашылі пераканацца ва ўсім на свае вочы. І завіталі на баль, дзе не толькі пагутарылі з робатамі, але пагулялі з імі ў тэніс і баскетбол...

СТАР. 3

■ 50+: жыць цікава

ЗАЛАТЫЯ ДЗЯНЬКІ

Ці можна быць шчаслівым на пенсіі?

У нас прынята думаць, што жыццё пенсіянера — гэта невысокая пенсія, хваробы, хаджэнні па ЖЭСах і паліклініках, а з радасцяў толькі тэлевізар. Мы чамусьці перакананыя, што жыць актыўна і цікава — гэта прывілея маладых. А вось даследаванні нямецкіх сацыёлагаў паказваюць, што больш за 40% жыхароў Германіі лічаць, што пасля 50-ці надыходзіць самы шчаслівы перыяд іх жыцця. Можа, у гэтым меркаванні ёсць свая рацыя? Несумненна, лічыць псіхолаг ТЦСАН Кастрычніцкага раёна г. Мінска Вольга ЗУЕВА. А сакрэт шчаслівага жыцця на пенсіі насамрэч просты — трэба карыстацца ўсімі перавагамі старэйшага ўзросту і старацца ўхіляцца ад праблем.

Вопыт — гэта вялікае багацце

— У нашай краіне яшчэ няма вобразу шчаслівай старасці. У беларусаў вялікі вопыт пакут, бед, войнаў, разрухі і аднаўлення. І ў многіх з нас ёсць страх сурочыць тое добрае, што ёсць, — кажа Вольга Зуева. — Але я сказала б, што апошнім часам пажылыя людзі ўсё больш «абуджаюцца». Гляджу на тых, хто наведвае наша аддзяленне для пажылых: яны актыўныя, зацікаўленыя, ім няма калі сумаваць! І гэта радуе і падбадзёрвае. Я бачу, што пажылыя людзі хочуць жыць цікава. Яны ўжо шмат што ўмеюць і дзеляцца гэтым, і атрымліваюць падтрымку адно ад аднаго. Прыходзяць да нас самі і прыводзяць з сабой сяброў, суседзяў, знаёмых: «Хадзем, там будзе цікава!»

З таго добрага, што прыносіць з сабой старэйшы ўзрост, псіхолаг у першую чаргу называе час і наша стаўленне да яго. Выхад на пенсію пазбаўляе чалавека ад шматлікіх правілаў і абавязкаў. Можна развітацца са шкоднай вытворчасцю, грамадскім транспартам у час пік, неабходнасцю рана ўставаць, канфліктамі ў калектыве, указаннямі начальства, бояззю звальнення... Нарэшце з'яўляецца вольны час, і тут вельмі важна правільна ім распарадзіцца. Можна прысвяціць яго любімаму занятку і ўсяму, да чаго раней не даходзілі рукі: пачаць вырошчваць ружы або новы гатунак агуркоў, давязаць світар ці асвоіць як след камп'ютар. Вялікіх матэрыяльных затрат пры гэтым не патрабуецца.

СТАР. 7

ПАДРАБЯЗНА — АБ ГАНДЛІ

Адбылася тэлефонная размова прэзідэнтаў Беларусі і Азербайджана Аляксандра Лукашэнкі і Ільхама Аліева, паведамілі ў прэс-службе беларускага лідара.

У кантэксце абмеркавання стану і перспектыў двухбаковых адносін кіраўнікі дзяржаў пацвердзілі іх стратэгічны характар, адзначыўшы, што ўзаемадзеянне дзвюх краін заўсёды выбудоўвалася ў духу дружбы і ўзаемаразумення.

Падрабязней прэзідэнты спыніліся на супрацоўніцтве ў гандлёва-эканамічнай сферы, выказаўшы гатоўнасць значна актывізаваць узаемны гандаль. Размова ішла ў тым ліку аб вытворчай кааперацыі. Беларускі бок, у прыватнасці, гатовы разгледзець магчымасць разгортвання сумесных вытворчасцяў у Азербайджане па ўсіх напрамках узаемадзеяння з выхадам у перспектыве з агульнай прадукцыяй на рынкі трэціх краін.

АСАБЛІВАЯ КАШТОЎНАСЦЬ ІНФАРМАЦЫІ

Сродкі масавай інфармацыі краіны павінны нарошчваць нацыянальны кантэнт у інфармацыйнай прасторы

Пра гэта заявіла міністр інфармацыі Лілія АНАНІЧ на пашыраным пасяджэнні калегіі галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Мінгарвыканкама, перадае карэспандэнт БЕЛТА.

«У Беларусі дастаткова інфармацыйных крыніц: больш за паўтары тысячы нацыянальных друкаваных СМІ, распаўсюджваецца звыш 200 замежных тэлеканалаў, у кіёсках «Саюздрука» па падпісцы даступна больш як 4 тысячы замежных перыядычных выданняў. Таму неабходна, у тым ліку рэгіянальным СМІ, нарошчваць нацыянальны кантэнт у інфармацыйнай прасторы», — сказала Лілія Ананіч. Паводле яе слоў, у сучасным свеце нельга недаацэньваць ролю і значэнне СМІ. «Сёння асаблівую каштоўнасць набывае аператыўная і дакладная інфармацыя, шчырая размова з людзьмі. У гэтым заключаюцца галоўныя задачы работы ўсіх нас — прадстаўнікоў сфер культуры, ідэалогіі, моладзі», — звярнула ўвагу кіраўнік ведамства.

РЭГІСТРАЦЫЯ ПА «ЭЛЕКТРОНЦЫ»

Сёлета ў першым паўгоддзі Дзяржаўны камітэт па маёмасці плануе падрыхтаваць прапановы па змяненні Закона аб дзяржаўнай рэгістрацыі нерухомай маёмасці

Аб гэтым паведаміў старшыня Дзяржкаммаёмасці Андрэй ГАЕЎ. Паводле яго слоў, цяпер спецыялісты камітэта рыхтуюць адпаведны законапраект. Новаўвядзенні будуць звязаны з напрацоўкамі па электроным дакументаабароце, з магчымасцю вызначэння шырокага кола аўтарызаваных пасярэднікаў. Менавіта ў гэтых аўтарызаваных структурах, пасля адпаведнага звароту, кліенты змогуць атрымліваць гатовыя дакументы ўжо і без дадатковага наведвання падраздзяленняў Дзяржкаммаёмасці.

А потым далейшае ўкараненне электроннага дакументаабароту пачне максімальна выціскаць папяровую сістэму ў межах камітэта, лічыць Андрэй Гаеў. «Сёння мы развіваем магчымасць дзяржаўнай рэгістрацыі маёмасці ў электронным выглядзе. Цяпер тыя, у каго ёсць электронны лічбавы подпіс, могуць звяртацца па ажыццяўленне рэгістрацыйных дзеянняў, і ў гэтым выпадку не трэба выходзіць з офіса або дома», — удакладніў сітуацыю старшыня Дзяржкаммаёмасці.

Холдынг дзяржаўнай маёмасці

Цяпер спецыялістамі камітэта дапрацоўваецца Канцэпцыя кіравання дзяржаўнай маёмасцю, якую плануецца зацвердзіць да канца 2016 года, паведаміў **першы намеснік старшыні Дзяржкаммаёмасці Беларусі Аляксей ВАСІЛЬЕЎ.**

«Самі дапрацоўкі будуць нязначныя, таму гэты дакумент абавязкова да канца года павінен быць зацверджаны», — падкрэсліў Аляксей Васільеў.

Ён нагадаў, што першапачаткова канцэпцыя прадугледжвала стварэнне ўнітарнага прадпрыемства па рэспубліканскай уласнасці ў Дзяржкаммаёмасці і па камунальнай уласнасці — у камунальных арганізацыях. Але каб не сутыкаліся інтарэсы рэспубліканскіх і камунальных органаў, цяпер эксперты Дзяржкаммаёмасці прапануюць стварыць акцыянернае таварыства на базе камітэта, куды ўвойдуць і камунальныя ўнітарныя прадпрыемствы. «Атрымаецца холдынгавая структура, дзе будуць улічвацца інтарэсы і абласных камунальных службаў, і рэспубліканскіх органаў», — удакладняюць сваю пазіцыю ў камітэце.

Аптымізацыя межаў усіх раёнаў зойме тры гады

Наступным маштабным праектам камітэта стане аптымізацыя межаў усіх раёнаў краіны да 2019 года, паведаміў Андрэй Гаеў. Ён нагадаў, што летась эксперты камітэта завяршылі пілотны праект па аптымізацыі межаў у Смалявіцкім раёне. Плануецца, што сёлета будзе наведзены парадак з межамі ўсіх раёнаў Мінскай вобласці, а да 2019 года падобная аптымізацыя будзе праведзена па ўсёй краіне. Паводле слоў старшыні Дзяржкаммаёмасці, у Смалявічах змены закранулі каля 40% працягласці раёна. «У выніку тэрыторыя раёна зменшылася на 52 гектары», — адзначыў ён. Андрэй Гаеў растлумачыў, што неабходнасць такой работы наспела ўжо даўно. Межы адміністрацыйных адзінак вызначаліся досыць даўно, многія — у сярэдзіне мінулага стагоддзя. Зараз ёсць сітуацыі, калі шэраг межаў праходзіць пасярэдзіне поля або лесу. Гэта не зусім лагічна, таму цяпер спецыялісты пачнуць «прывязваць» межы да цвёрдых контураў — дарог ці ліній электраперадачы.

Сяргей КУРКАЧ. *kurkach@zviazda.by*

■ Парламенцкі дзённік

УДАСКАНАЛІЦЬ ВЯДЗЕННЕ СТАТЫСТЫКІ І ПАКАРАЦЬ НЕПЛАЦЕЛЬШЧЫКАЎ ПАДАТКАЎ

Дэпутаты абмяркоўваюць законапраекты да веснавой сесіі

На пашыраным пасяджэнні Пастаянная камісія Палаты прадстаўнікоў па бюджэце і фінансах разгледзела два законапраекты, што ўносяць змяненні і дапаўненні ў некаторыя законы па пытаннях дзяржаўнай статыстыкі і ў Закон «Аб дэклараванні фізічнымі асобамі даходаў і маёмасці». Гаворачы пра першы законапраект, яго куратар Людміла ДАБРЫНІНА, старшыня Пастаяннай камісіі, выказала думку, што статыстыка — люстэрка эканомікі.

— Як працуе эканоміка, адлюстроўваецца ў статыстычных звестках, — аргументавала парламентарый.

На абмеркаванне законапраекта, які тычыцца дзяржаўнай статыстыкі, былі запрошаны прадстаўнікі Нацыянальнага статыстычнага камітэта. **Першы намеснік старшыні гэтага ведамства Ірына КАНГРО** расказала, што ў нашай краіне двойчы прысутнічала місія спецыялістаў-статыстыкаў з розных краін, перш за ўсё з еўрапейскіх — Вялікабрытаніі, Германіі, Швейцарыі.

— Калі зыходзіць з міжнароднай практыкі, нацыянальная статыстычная сістэма любой краіны можа ініцыяваць правядзенне глабальнай ацэнкі для таго, каб эксперты маглі вызначыць, ці адпавядае вядзенне статыстыкі ў краіне тым прынцыпам і падыходам, тым стандартам, якія ёсць у галіне статыстычнай дзейнасці, — патлумачыла Ірына Кангро. — Гэта стандарты адпаведнай камісіі Арганізацыі Аб'яднаных Нацый і ў пэўнай ступені — Еўрапейскага саюза.

У адказ на пытанне Людмілы Дабрынінай пра ацэнку, якую далі нашай статыстычнай сістэме замежныя эксперты, прадстаўніца Нацыянальнага статыстычнага камітэта паведаміла, што характарыстыка была добрай.

— Арганізацыя вядзення статыстыкі ў нашай краіне забяспечвае выкананне стандартаў, што існуюць у гэтай галіне, — паведаміла Ірына Кангро. — Якасць афіцыйнай статыстычнай інфармацыі дастаткова высокая. Разам з тым спецыялісты пры падрыхтоўцы справаздачы выпрацавалі шэраг рэкамендацый, каб дазволіць нашай нацыянальнай статыстычнай сістэме і надалей развівацца ў збліжэнні з міжнароднымі стандартамі.

Сёння ў краіне вытворцамі афіцыйнай статыстыкі з'яўляюцца больш за 20 дзяржаўных органаў — гэта і Нацыянальны банк, і Міністэрства фінансаў, і Дзяржмаёмасць, і Міністэрства адукацыі, і Міністэрства аховы здароўя... Адной з рэкамендацый ад групы міжнародных экспертаў стала ўзмацненне ролі кантралюючага органа ў сферы статыстыкі.

У цэлым жа мэта законапраекта аб статыстыцы — забеспячэнне ўсіх карыстальнікаў — ад органаў улады да фізічных асоб — якаснай і дакладнай афіцыйнай інфармацыяй.

Што тычыцца дакумента, які ўносіць змяненні і дапаўненні ў Закон «Аб дэклараванні фізічнымі асобамі даходаў і маёмасці», то трэба сказаць: пералік нерухомай маёмасці, абавязковай для дэкларавання, дапоўніўся машына-месцам.

— Цяпер у маёмасць, якая падлягае ўліку, уключана і машына-месца — раней гэтага не было, — патлумачыў журналістам **дэпутат Валерый БАРАДЗЕНЯ, член Пастаяннай камісіі па бюджэце і фінансах.** — Калі гэты аб'ект там з'явіўся, то адпаведна, яго ўключылі і ў гэты праект закона. Мы ведаем, што ў Мінску, іншых буйных гарадах машына-месца можа мець дастаткова высокі кошт.

У цэлым жа, па меркаванні дэпутата, Закон «Аб дэклараванні фізічнымі асобамі даходаў і маёмасці» чакаюць дастаткова істотныя змены.

— Нарматыўны акт будзе рэгуляваць тыя сітуацыі, калі ў падатковай інспекцыі, іншых органаў узнікнуць падазрэнні, што ў чалавека выдаткі значна вышэйшыя за даходы. Установлены дакладны тэрмін — 30 дзён, — на працягу якога чалавеку даецца магчымасць самастойна патлумачыць, чаму ў яго такія разыходжанні.

Калі чалавек не патлумачыў падатковым службам на працягу гэтага часу, адкуль узяў «лішнія» грошы, або даў няпоўныя тлумачэнні, то ён павінен будзе заплаціць падатак у 16%.

— Гэта правільны шлях, — лічыць парламентарый, — ва ўсім свеце так і робіцца — калі ў чалавека выдаткі значна перавышаюць даходы, калі ён набывае некалькі машын, кватэру, некалькі машына-месцаў, не маючы адпаведных даходаў, то дзяржава просіць яго патлумачыць, як так атрымалася.

Святлана ШАЎЧЭНКА, намеснік міністра па падатках і зборах, якая таксама прыняла ўдзел у пасяджэнні камісіі, паведаміла, што ў мінулым годзе падатковыя органы нашай краіны спагналі 44 млрд беларускіх рублёў з грамадзян, у якіх выдаткі былі большыя за даходы.

— Праведзена 12 тысяч праверак, парушэнні выяўлены ў 5 тысяч чалавек, — расказала Святлана Шаўчэнка.

Надзея ЮШКЕВІЧ. *yushkevich@zviazda.by*

■ Тры пытанні да ўлады

ЯК РАЗВІВАЕЦЦА САЦЫЯЛЬНАЯ СФЕРА ГОРАДА АТАМШЧЫКАЎ?

На пытанні карэспандэнта «Звязды» адказвае старшыня Астравецкага райвыканкама, член Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі Адам КАВАЛЬКА.

— Не паспеем азірнуцца, а першая чарга Беларускай АЭС будзе ўведзена ў эксплуатацыю. Ці не адстае ад вытворчай сацыяльная сфера ў Астраўцы, што ў гэтым кірунку зроблена і якія аб'екты з'явяцца ў перспектыве?

— Да 2020 года колькасць жыхароў ў горадзе павінна павялічыцца прыкладна ўтрая — да 25 тысяч чалавек. З улікам іх патрэбнасцяў і развіваем сацыяльную сферу. Летась сетка ўстаноў адукацыі папоўнілася гімназіяй і дзіцячым садам, зараз будуецца новы лячэбны корпус раённай бальніцы. За сродкі абласнога бюджэту нядаўна пабудавалі дом сямейнага тыпу, дзе справіла ўваходзіны шматдзетная сям'я. А ў супрацоўнікаў прадстаўніцтва Белдзяржстраха па Астравецкім раёне з'явіліся новыя службовыя памяшканні.

У планах на бягучы год — будаўніцтва ў гарадскім мікрараёне № 2 дзіцячага сада, а таксама фізкультурна-аздараўленчага комплексу з плавальным басейнам. Згодна з даручэннем кіраўніка дзяржавы, дадзеным падчас яго візіту ў Астравец, прапрацоўваем пытанне будаўніцтва ў горадзе стадыёна. Дарэчы, разлік не толькі на грошы Дзяржаўнай інвестыцыйнай праграмы. Напрыклад, на рамонт сярэдняй школы № 1 у райцэнтры плануем прыцягнуць сродкі Сусветнага банка развіцця.

— Зразумела, што прадпрыемства, установа не будуць паспяховымі без кампетэнтных спецыялістаў. Што робіцца, каб забяспечыць сацыяльную сферу належным кадравым патэнцыялам?

— Вельмі прыемна, што за апошнія тры гады на Астраveччыну прыбылі, каб распачаць свой працоўны шлях, 409 маладых спецыялістаў. У тым ліку летась — 202, сярод якіх 86 — менавіта ў сацыяльную сферу. Сёлета на працу ва ўстановы адукацыі, аховы здароўя, культуры і іншыя чакаем яшчэ 88 выпускнікоў вышэйшых і сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў.

Хачу адзначыць, што мы шмат робім для замацавання маладых спецыялістаў на першым рабочым месцы. Напрыклад, тыя з іх, хто прыбыў у раён на работу па размеркаванні не па месцы жыхарства бацькоў, могуць, згодна з прэзідэнцкім Указам, атрымаць ільготны крэдыт на набыццё хатняй маёмасці і тавараў першай неабходнасці. Гэтым правам за апошнія тры гады скарысталіся 44 маладыя спецыялісты. Акрамя таго, у калектыўных дагаворах прадпрыемствы і арганізацыі прадугледжваюць меры матэрыяльнай падтрымкі моладзі — пры ўступленні ў шлюб, нараджэнні дзіцяці.

Але галоўнае для маладога спецыяліста — гэта дах над галавой. У гэтым пытанні ў нас ёсць свае напрацоўкі. Напрыклад, сёлета райвыканкам прыняў рашэнне перадаць былы будынак Белдзяржстраха на баланс раённай бальніцы. Зараз там завяршаюць рамонт з перабсталяваннем пад інтэрнат, хтосьці ўжо нават засяліўся. Другі прыклад — у аграгарадку Варняны. На вольных плошчах у былым будынку вучэбна-вытворчага камбіната арганізавалі інтэрнат для работнікаў адукацыі, дзе могуць пражываць дванаццаць, а пры неабходнасці і больш маладых спецыялістаў.

І яшчэ. У канцы 2015-га як навагодні падарунак для ўсіх спецыялістаў сацыяльна-культурнага комплексу раёна падпісаны Указ № 524 Прэзідэнта Беларусі, які дае падставу для выдзялення жылля з фонду РУП «БелАЭС» педагогам, медыкам, спартсменам і работнікам культуры.

— Ці зацікаўлены інвестары ў будаўніцтве ў горадзе атамшчыкаў сацыяльных аб'ектаў?

— Лічу, што ў нашым раёне створаны спрыяльныя ўмовы для развіцця малога і сярэдняга бізнесу. І многія дзелавыя людзі гэтым ужо скарысталіся. Напрыклад, дзякуючы інвестыцыям турэцкай кампаніі ў Астраўцы будуюць гасцініцу. У міжнародным пагранічным пункце пропуску «Катлоўка» з'явілася аўтазаправачная станцыя, у планах — будаўніцтва стаянкі і станцыі тэхабслугоўвання аўтамабіляў, гатэля. Адкрытае акцыянернае таварыства «Гроднажылбуд» плануе пабудаваць дом з далейшым продажам у ім кватэр.

Варта адзначыць, што інвестараў найбольш цікавяць гандлёвыя аб'екты. Пры гэтым ад буйных сеткавых кампаній не адстаюць і нашы мясцовыя інвестары. Прыкладам можа служыць комплекс «Талер», дзе пяцёра астравецкіх прадпрымальнікаў на плошчы больш за 1000 квадратных метраў арганізавалі 15 гандлёвых аб'ектаў. Добра зразумеў выгады інвеставання ў Астраўцы і Ашмянскі мясакамбінат. Гэтае прадпрыемства ўжо прадстаўлена ў нас кавярняй і шэрагам крамаў як у старым горадзе, так і ў новых мікрараёнах.

Барыс ПРАКОПЧЫК.

■ Грамадскае жыццё

Абмяняцца вопытам

Камянецкі актыў наведаў штаб-кватэру «Белай Русі»

Такія сустрэчы кіраўніцтва арганізацыі з актывістамі «Белай Русі» з розных рэгіёнаў краіны даўно сталі традыцыяй. За апошнія некалькі гадоў галоўны офіс аб'яднання наведалі прадстаўнікі амаль 30 раённых падраздзяленняў.

Аляксандр РАДЗЬКОЎ, старшыня Рэспубліканскага грамадскага аб'яднання «Белая Русь», традыцыйна знаёміць гасцей са структурай арганізацыі, а таксама яе напрацоўкамі.

— Немагчыма вырашыць пытанні без Камянца ці без Брэста, без Віцебска ці без Гомеля, Мінска, бо гэта праблемы станаўлення дзяржавы, развіцця грамадства, асабліва грамадзянскага яго складніка, — сказаў ён гасцям з Камянецкага раёна. — Вы — удзельнікі гэтых усіх працэсаў.

Людміла ЖУРАЎЛЁВА, галоўны спецыяліст па справах моладзі аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Камянецкага райвыканкама, старшыня раённай арганізацыі «Белай Русі», прызналася, што актывісты раёна вельмі рады запрашэнню наведаць Мінск.

— Мы прыехалі даведацца нешта новае, вызначыць перспектывы развіцця, а таксама падзяліцца ўласным вопытам працы, — сказала яна журналістам. — Гэты год абраны Годам культуры, і мы плануем наведаць музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны і Нацыянальную бібліятэку.

Як расказала старшыня Камянецкай раённай арганізацыі «Белай Русі», у іх раёне рэалізуюцца такія акцыі аб'яднання, як «Белая Русь» на ўборцы збожжавых», «З «Белай Руссю» — у першы клас».

— У нас, дарэчы, аснову аб'яднання складаюць педагогі — гэта 42% нашых членаў, — паведаміла Людміла Жураўлёва. — У нашай раённай арганізацыі 538 чалавек, якія ўваходзяць у 38 пярвічак. Мы бачым свой рэзерв у членах БРСМ, хацелася б іх усіх забраць да сябе.

Наталля ВОРАНАВА, намеснік старшыні Цэнтральнай раённай арганізацыі Мінска РГА «Белая Русь», адзначыла высокі ўзровень працы актыву «Белай Русі» на Камянеччыне.

— Актыў Камянецкага раёна праяўляе сябе вельмі ярка, добра зарэкамендаваў сябе падчас выбарчай кампаніі, — заявіла яна. — Гэта тая раённая арганізацыя, вопыт якой дастойны вывучэння.

Віталь ДЗЕМІРАЎ, член аналітычнай групы «Белай Русі», адзначыў, што важнасць падобнага кшталту сустрэч падкрэслівалася і на мінулым рэспубліканскім савеце грамадскага аб'яднання.

— У якасці ключавога ставілася пытанне аб умацаванні ўзаемадзеяння цэнтральнага апарата «Белай Русі» і рэгіянальных арганізацый, — звярнуў увагу малады аналітык.

Надзея ЮШКЕВІЧ. *yushkevich@zviazda.by*

■

ДА МОВЫ — ПРАЗ КАХАННЕ

Учора ў Міністэрства замежных спраў завіталі кіраўнікі і прадстаўнікі дыпламатычных місій у нашай краіне, каб... пачытаць вершы беларускіх паэтаў. Незалежна ад краіны, з якой яны прыбылі, і ўзроўню валодання мовай, творы агучваліся выключна па-беларуску. Такім чынам дыпламаты ўганаравалі свята Дня роднай мовы, абвешчанага ЮНЕСКА. Мерапрыемства прымеркавалі да 100-годдзя з дня вянчання беларускага песняра — Янкі Купалы — з Уладзіславай Станкевіч.

— Мова, культура, традыцыі, нацыянальныя каштоўнасці — гэта падмурак, без якога немагчыма існаванне і народа, і дзяржавы, — упэўнены **Уладзімір МАКЕЙ, міністр замежных спраў Беларусі**. — Гэта наш скарб, якім мы павінны ганарыцца. Сам час патрабуе ад нас не толькі звярнуцца да нашых вытокаў, але і паглыбляць знаёмства з нашым краем, традыцыямі і фальклорам. Для нас гэты дзень мае асаблівае значэнне. Бо кожны дыпламат павінен ведаць і шанаваць не толькі родную мову, але і мову той краіны, дзе ён працуе.

Па словах кіраўніка МЗС, для беларусаў Янка Купала — гэта сімвал любові да сваёй радзімы, краю, народа. Таму было асабліва прыемна пачуць ад прадстаўнікоў дыпмісій у Беларусі вершы айчынных паэтаў на мове арыгінала. Уладзімір Макей лічыць, што такога кшталту мерапрыемствы садзейнічаюць узаемаразуменню і збліжэнню паміж народамі і дзяржавамі. Ён прызнаўся, што вельмі любіць беларускую паэзію, і прачытаў санет Янкі Купалы «Я люблю».

Дырэктар Дзяржаўнага літаратурнага музея Янкі Купалы Алена ЛЯШКОВІЧ упэўнена, што творца, якому прысвечана сустрэча, — самы вядомы беларускі паэт. «Творы Янкі Купалы перакладзены амаль на сто моў свету. Ён самы ўганараваны беларус у свеце. Помнікі яму стаяць у адным з паркаў у Нью-Ёрку, на Кутузаўскім праспекце ў Маскве, у ізраільскім горадзе Ашдод на плошчы, якая носіць імя Янкі Купалы. Гэтым мерапрыемствам мы працягваем справу шанавання памяці беларускага песняра», — такую думку выказала Алена Раманаўна.

Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Кітайскай Народнай Рэспублікі ў Беларусі Цуй ЦЫМІН прызнаўся карэспандэнту «Звязды», што яму даспадобы такое свята. «Кітайскі народ высока паважае беларускую культуру, асабліва мову і літаратуру. Шмат хто з вашых пісьменнікаў і мастакоў добра вядомы ў Кітайскай Народнай Рэспубліцы. Напрыклад, Янка Купала і Марк Шагал. Апошнім часам урад КНР удзяляе гэтай сферы асаблівую ўвагу»,— падкрэсліў дыпламат.

Мерапрыемства прайшло ў рамках праекта «У дыялогу культур», арганізаванага МЗС сумесна з Дзяржаўным літаратурным музеем Янкі Купалы. У ім бралі ўдзел кіраўніцтва Міністэрства замежных спраў, прадстаўнікі шэрагу дыпламатычных місій, акрэдытаваных у Рэспубліцы Беларусь, а таксама творчая інтэлігенцыя. Падчас імпрэзы прагучалі творы народнага паэта Беларусі Янкі Купалы ды іншых, а таксама была адкрыта выстава графічных работ «Яна і я».

Вераніка ПУСТАВІТ. *pustavit@zviazda.by*

«НЯМА ЗА ШТО» АД БАРЫСА І СЭЛФІ АД ТЭСПІЯНА

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Баскетбольны выклік ад Кукі і блэндар на колах

Так, упершыню сваім талентам беларусаў будзе здзіўляць Кука. Гэты прамысловы робат ужо зарэкамендаваў сябе на такіх маштабных аўтамабільных вытворчасцях, як «БМВ», «Мерседэс». Але, як таленавіты чалавек таленавіты ва ўсім, так і робат Кука праяўляе свае здольнасці не толькі ў працоўны час. Напрыклад, на выставе з ім можна паспаборнічаць у закідванні мяча ў баскетбольнае кольца. Калі шчыра, я — не аматар баскетбола. Тым больш спаборнічаць з Кукам бессэнсоўна: ён трапляе ў кольца з зайздроснай дакладнасцю. Але затое я з задавальненнем пагуляла з робатам у настольны тэніс. Гэта цудоўны трэнажор для навічкоў, і выратаванне для тых, хто прагне пагуляць, а няма з кім... Праўда, робат можа толькі падаваць мячыкі.

На «Балі робатаў» мы пазнаёміліся таксама з робатам-мастаком, робатамі-танцорамі і нават пакаштавалі смузі, прыгатаваны робатам. Дакладней, каб прыгатаваць смакоце, давялося крыху паднапружыцца. Справа ў тым, што робат-блэндар прымацаваны да багажніка веласіпеда. Каб прывесці яго ў дзеянне, трэба пакруціць педалі не адну хвіліну. Па шчырасці, ідэя мне прыйшлася даспадобы, бо яна чарговы раз даказвае народную мудрасць: «Хто не працуе — той не есць».

Пра жалезную няньку і тэрапеўтычнага цюленя

Але найбольш мяне здзівіў і парадаваў Барыс. Ён аказаўся не толькі самым ветлівым, але і надзвычай кемлівым робатам. Калі я запыталася ў яго па-беларуску «Як справы?», Барыс адразу ж скеміў і адказаў: «Отлично». «Барыс, скажы «прывітанне», — папрасіла робата перадаць прывітанне чытачам «Звязды» па-беларуску. І што вы думаеце, ён, на маё здзіўленне, адказаў: «Дзень добры». А на сваё радаснае «дзякуй», пачула «няма за што».

— Барыс — робат-нянька, — **распавядае экскурсавод Арцём ВАРАНКОЎ**. — Вы яго можаце спакойна пакінуць з маленькім дзіцем, а самі ад'ехаць па справах. У яго на лбе ўсталявана камера, такім чынам вы можаце дыстанцыйна кіраваць робатам і назіраць, чым займаецца вашае дзіця.

Яшчэ адзін мілы робат, які абавязкова спадабаецца і дзецям, і дарослым, выглядае, як дзіця грэнландскага цюленя. Цела Паро шчодра ўсеяна разнастайнымі датчыкамі і сэнсарамі (вядома, іх не відаць звонку), таму ён імгненна рэагуе на кожны дотык. Здольны паказаць такія эмоцыі, як здзіўленне, радасць і гнеў. Адгукаецца на імя. Калі яго пагладзіць, пачне ў адказ ад задавальнення зажмурваць вочкі і «муркаць» голасам грэнландскіх цюленяў.

Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

— Паро занесены ў Кнігу рэкордаў Гінеса як «самы лячэбны робат». Ён задумваўся для тэрапеўтычнага эфекту, каб выклікаць станоўчыя эмоцыі ў пацыентаў дзіцячых бальніц і дамоў састарэлых, дзе нельга трымаць хатніх жывёл, — удакладняе Арцём. — А галасы цюленяў японскі інжынер запісаў у Канадзе і затым заклаў у Паро.

Яшчэ мне вельмі спадабаўся робат па мянушцы Дзеравяка. Магчыма, таму, што ён выраблены з дрэва і нечым нагадвае дамавёнка Кузю ці Нафаню. Быў прыдуманы да 700-годдзя Сергія Раданежскага, для таго, каб збіраць ахвяраванні з прыхаджан на развіццё храма. Дзе ён толькі ні збіраў міласціну, кажуць, нават у Дзярждуме Расіі. Са словамі «Помогите, люди добрые» выпрошвае грошы, і толькі пасля таго, як вы кінеце ў вузенькую адтуліну-кішэньку манетку, пачынае расказваць анекдоты і іграць на катрынцы. «У нас няма манет. Трэба было крыху пазней прыехаць, калі ў нас увядуць металічныя грошы», — пажартавала я. І што вы думаеце, пасля гэтых слоў Дзеравяка злітаваўся і сыграў для нас задушэўную мелодыю.

«Робат таксама чалавек»

Але больш за ўсё прыхільнікаў збірае побач з сабой акцёр Тэспіян. Гэты англійскі эмацыянальны робат здольны не толькі выказваць эмоцыі, але і па-тэатральнаму чытаць Пушкіна, спяваць Лепса, танчыць. Ён вельмі любіць «кантактаваць з дзеткамі і сімпатычнымі дзяўчатамі, калі крыху скача электрычнасць, гэта козытна, і калі раніцай мяне дастаюць з каробкі». Таксама абажае фатаграфавацца, але пасля абавязкова падкрэсліць сваю папулярнасць «Это моё тысячное сэлфи на сегодня». Любіць ён і пахваліцца. Маўляў, «мой родной язык английский, но я могу говорить на любом языке мира». Калі спрабую падлавіць і прашу сказаць што-небудзь па-беларуску, ставячы ў прыклад Барыса, хуценька дае рады і пачынае спяваць «До чего дошёл прогресс... Вкалывают роботы, а не человек». Затым уздыхае, кажа, што стаміўся: «Давай прервёмся. Роботы ведь тоже люди».

Паводле слоў спецыяліста па сувязях з грамадскасцю «Балю робатаў — 2016» у Мінску Веранікі ЮРАНКОВАЙ, робаты Сацыябот, Бакстэр, Кука з'едуць крыху раней — таму спяшайцеся наведаць мерапрыемства, каб атрымаць максімум уражанняў! Выстава праходзіць у сталічным гандлёвым цэнтры «Тытан» да 27 сакавіка.

Надзея ДРЫНДРОЖЫК. *dryla@zviazda.by*

■ Спорт-тайм

КАЛІ НАДВОР'Е — НЕ ПЕРАШКОДА

У Раўбічах сёння пройдзе этап Кубка свету па фрыстайле

Рэспубліканскі цэнтр алімпійскай падрыхтоўкі па зімовых відах спорту прымае міжнародныя спаборніцтвы лыжных акрабатаў. Там выступіць больш за паўсотні спартсменаў з 11 краін свету, сярод іх лідары сусветнага фрыстайла Дэвід Морыс, Дэніэл Скот, Эшлі Колдуэл і Аляксандр Абраменка. Беларусь на 6-ым этапе Кубка свету прадставяць Максім Гусцік, Аляксандра Раманоўская, Ганна Гуськова, Станіслаў Гладчанка і Арцём Башлакоў.

Асноўнай праблемай перад пачаткам спаборніцтваў было надвор'е — адсутнасць снегу і пакрыццё трамплінаў хвалявала не толькі спецыялістаў, спартсменаў, але і заўзятараў. Аднак перад пачаткам турніру **афіцыйны прадстаўнік Міжнароднай федэрацыі лыжнага спорту Райнхард КРАМПФЛ** запэўніў, што ўсё гатова да правядзення адказнага старту.

— Мне прыемна знаходзіцца ў Беларусі, тут я ўжо трэці раз. Ваша краіна — гэта адно з самых важных месцаў для правядзення спаборніцтваў па фрыстайле. Мы ўбачым сёння грандыёзнае шоу, таму што разгорнецца барацьба за перамогу ў агульным заліку, — адзначыў ён.

Пасля выступлення ў Раўбічах спартсмены планавалі адправіцца на заключны, 7-ы этап Кубка свету ў Іспанію, але з прычыны анамальна цёплага надвор'я на Пірэнеях яго адмянілі. Такім чынам, па выніках спаборніцтваў у Беларусі вызначацца пераможцы і менавіта нашы заўзятары ўбачаць іх першымі. Дарэчы, сёння для аматараў спорту ў Раўбічах арганізаваны зоны грамадскага харчавання, забаўляльная праграма і падрыхтавана сувенірная прадукцыя — сумаваць не прыйдзецца. Ды і айчынныя спартсмены гатовы парадаваць родную публіку, наша краіна на заключным этапе Кубка свету прадстаўлена наймацнейшым складам, у зборнай няма толькі Дзяніса Осіпава, які атрымаў траўму на спаборніцтвах у ЗША.

— Асабіста мне прасцей выступаць за мяжой, — адзначае лідар мужчынскай зборнай Беларусі Максім Гусцік, *— бо дома, перад роднымі заўзятарамі з'яўляецца дадатковая адказнасць. У гэтым годзе ў нас былі праблемы з падрыхтоўкай: непаладкі ўзніклі і ў комплексе, праблем дадало надвор'е. Тым не менш я спадзяюся на добрае выступленне, дагнаць і перагнаць лідара агульнага заліку Аляксандра Абраменку ў мяне яшчэ ёсць шанц, для гэтага проста трэба быць першым.*

Нагадаем, агульны залік Кубка свету ў лыжнай акрабатыцы ўзначальвае Аляксандр Абраменка з Украіны (265 ачкоў). Другое месца ў кітайца Гуангпу Кі (226 балаў), на трэцім радку — расіянін Пётр Мядуліч (218 ачкоў). Найлепшы з беларусаў Максім Гусцік займае чацвёртае месца (196 балаў). У жаночым заліку Кубка свету лідзіруе Эшлі Колдуэл з ЗША (309 ачкоў). Беларуска



Аляксандра Раманоўская займае 11-е месца (146 ачкоў), а Ганна Гуськова на 12-й пазіцыі (140 ачкоў).

Спаборніцкая праграма ў жанчын стартуе ў 9.40, у мужчын — у 12.00.

Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ. *lobazhevich@zviazda.by*

■

■ Насуперак стэрэатыпам

Каб размаўляць па-беларуску...

зусім не абавязкова быць настаўніцай

Я размаўляю па-беларуску больш як 10 гадоў. З таго самага дня, як прыехала ў Мінск паступаць на факультэт журналістыкі. Некаторыя пытаюцца: «Вы, напэўна, настаўніца беларускай мовы і літаратуры?» Прыйшоў час зламаць стэрэатып. Каб размаўляць па-беларуску, не абавязкова быць настаўніцай. Гэта на ўласным прыкладзе пацвярджаюць нашы сённяшнія героі. Іх прафесіі непасрэдна не звязаны з беларускай мовай. Тым не менш яны карыстаюцца ёй штодзень: дома, у краме, кавярні, на працы...

Андрэй ВІТУШКА, дзіцячы доктар:

«ДА ТРОХ ГАДОЎ МЫ СВЯДОМА АДМЯЖОЎВАЛІ СЫНА АД РУСКАЙ МОВЫ»

— Андрэй, як даўно вы размаўляеце на беларускай мове?

— Даволі даўно, дзесьці з 1998 года. Усе пакаленні маёй сям'і не саромеліся размаўляць па-беларуску. Бабуля паходзіць з Вязынкі. Адпаведна ў яе надзвычай сакавітая мова, вельмі блізкая да Купалавай. Я з дзяцінства яе чуў. Для мяне гэта было так натуральна. Бацькі, калі была магчымасць, таксама ахвотна размаўлялі па-беларуску.

— Наколькі ведаю, вы не толькі размаўляеце, але і ўсю дакументацыю на працы ведзяце па-беларуску. Як рэагуюць калегі?

— Я працую анестэзіёлагам-рэаніматолагам у аддзяленні рэанімацыі нованароджаных у Рэспубліканскім навукова-практычным цэнтры «Маці і дзіця» з 2001 года. Зразумела, спачатку не абышлося без складанасцяў. Калегі казалі, што ім цяжка чытаць тое, што я пішу. Але я патлумачыў незразумелыя тэрміны. З часам усе адаптаваліся. Больш за тое, у лексіконе калег пачалі з'яўляцца беларускія слоўцы. Ну, напрыклад, у размове часта ўжываецца: «Эта перспектива, по-моему, тебя не «вабіць». Два дактары з нашага аддзела наогул размаўляюць са мной толькі па-беларуску.

— А пацыенты?

— Справа ў тым, што я працую з нованароджанымі дзеткамі. Што тычыцца іх бацькоў, то яны рэагуюць звычайна прыхільна — некаторыя нават пачынаюць мне адказваць па-беларуску. За ўвесь час (хутка 15 гадоў, як працую дзіцячым доктарам) можа быць два разы мне сказалі, што ёсць нейкія праблемы ў камунікацыі. Хоць бацькі знаходзяцца ў стрэсе, бо іх дзеці цяжкахворыя. Калі людзі хочуць паразумецца, то мова не можа быць перашкодай. Бацькі мяне хочуць разумець, бо я кажу часам не дужа прыемныя, але заўсёды важныя рэчы.

— Андрэй, раскажыце, як у вас з'явілася беларускамоўная мянушка?

— Аднойчы пераводзіў дзіця пасля перфарацыі кішэчніка з рэанімацыі ў хірургічны стацыянар. У медычных дакументах яго была такая фраза: «Вольнае паветра ў чэраўнай паражніне не вызначаецца». Наступны раз, калі я прыехаў у гэты стацыянар, мяне радасна сустракалі і цытавалі гэтую фразу. Яна ім так спадабалася, што нейкі час мяне называлі «вольным паветрам».

— Чула, што вас, як беларускамоўнага доктара, запрасілі на тэлебачанне весці праграму для дзетак «Дабраранак» на канале Беларусь 3?

— Прапанова была даволі нечаканая, але прыемная. Я вельмі люблю сваю працу, але надзвычай цікава паглядзець, як працуюць прафесіяналы ў іншых сферах. У нейкі спецыяльны вобраз не ўваходжу. Я — дзіцячы лекар, люблю дзяцей. Гэта маё, я такі па жыцці. І з мядзведзікам Топам размаўляю, як з дзіцём 3-4 гадоў. Пра тое, як захаваць здароўе ў розных сітуацыях, што трэба рабіць, каб жывот не балеў, каб не паслізнуцца на вуліцы, пра вітаміны... Гэта не праца, а нейкае суцэльнае задавальненне. Мая жонка жартоўна назвала гэты праект «Плюшавая педыятрыя». Вельмі цікавы досвед і, спадзяюся, карысны для дзетак. Прынамсі майму 11-гадоваму сыну першы выпуск спадабаўся, сказаў, што я прыстойна выглядаў *(смяецца)*. Гэта натхняе на далейшую творчасць. Па меры сваіх сіл спрабую ўдзельнічаць у праекце. Нягледзячы на тое, што пакуль складана ўсё сумяшчаць. Я ж рыхтуюся да абароны дысертацыі.

— На якую тэму?

— Папярэджанне цяжкіх пашкоджанняў мозга ў глыбока неданошаных дзетак. Абараняць яе збіраюся па-беларуску.

— Андрэй, некаторыя маладыя бацькі не выхоўваюць дзіця па-беларуску, бо баяцца. Маўляў, калі падрасце, на трасянцы будзе размаўляць. Што можаце сказаць, абапіраючыся на свой досвед?

— Так, у майго сына родная мова — беларуская. Базавыя прынцыпы выхавання дзіцяці вызначылі разам з жонкай (яна мае педагагічную адукацыю). Што датычыцца трасянкі, то да 3 гадоў мы імкнуліся, каб Мірон чуў больш менавіта беларускую мову. Таму што ёсць такая заканамернасць, што калі блізкароднасныя мовы блытаюцца да трох гадоў, то яны будуць блытацца і надалей. У выніку, безумоўна, запас у Мірона рускіх слоў быў трохі бядней шы, чым у некаторых дзяцей яго ўзросту. Але літаральна ў 2 класе ўсё зраўнялася. Ён ходзіць у беларускую гімназію, найлепшы вучань на сваёй паралелі. Нават алімпіяду ў школе выйграваў па рускай мове. Зараз ён адзін з любімых вучняў у настаўніцы рускай мовы і літаратуры. Піша сачыненні, вершы як па-руску, так і па-беларуску. Карысць, каб будучым беларусам гаварыць па-беларуску, не ў тым, каб ведаць яшчэ адну мову. А ў тым, каб неяк сімвалічна, праз слова, намацаць свае карані, адчуць грунт пад нагамі, жывіцца энергіяй сваіх продкаў, шматлікіх людзей, якія тут жылі, стваралі. Думаю, што ў Мірона гэта натуральна адбываецца.

Кастусь ЛАРКОЎ, пекар:

«ХЛОПЧЫК І ЛЁТЧЫК» — ПЕРШЫ ВЕРШ, ЯКІ Я ВЫВУЧЫЎ НА ПАМЯЦЬ»

— Кастусь, ты неяк сказаў «добрых пекараў у нас шмат, а беларускамоўны — адзін я». Раскажы, калі ты пачаў размаўляць па-беларуску, што натхніла?

— Добра памятаю, што маім першым вершам, вывучаным на памяць у дзіцячым садку, быў «Хлопчык і лётчык». Не памятаю, каб я ў свае 5 гадоў дакучаў пытаннямі кшталту «а на якой мове гэты верш?», пэўна, ужо тады мова для мяне чужой не была. На шчасце, цяпер я далёка не адзіны беларускамоўны пекар, ёсць адмыслоўцы і акрамя мяне, з якімі магчыма абмеркаваць нешта прафесійнае на роднай мове. Што да беларускамоўнага асяродку, то ён ствараецца дастаткова хутка: пачніце размаўляць і вас падтрымаюць.

— Як рэагуюць калегі па працы, бацькі?

— Гэта збольшага надумана, што людзі адварочваюцца ад мовы. І на старой, і на новай рабоце (Кастусь не так даўно пераехаў працаваць у Мінск загадчыкам пякарні. — **Аўт.**) я сутыкнуўся з тым, што людзі, пачуўшы знаёмыя словы, імкнуцца падкрэсліць лагоднае стаўленне да яе. Што да бацькоў, то ад гутаркі на любой мове я на іх тварах бачу толькі задавальненне! *(усміхаецца)*. Іншы раз пераходзіць на рускую даводзіцца, бо калі ведаеш абедзве, кантраляваць сябе падчас імклівых думак пры размове складана. Але затое, якое ўнутранае задавальненне адчуваеш, калі разумееш, што твой мозг у першую чаргу спрацоўвае па-беларуску. Раю кожнаму прыкласці намаганні, каб адчуць гэты момант шчасця.

— На сваіх караваях ты змяшчаеш беларускамоўныя выказванні. Як прыйшла ідэя? Наколькі карыстаюцца попытам караваі з такімі надпісамі?

— Не магу пахваліцца тым, што надпісы на боханах хлеба — гэта мая ідэйка. Здарылася так, што аднойчы мяне папрасілі да нейкага свята зрабіць некалькі караваяў з надпісамі і ў якасці падказкі прапанавалі шэраг рускіх прымавак. Вось тут мне і стала крыўдна, што на хлебе, узгадаваным на роднай зямлі, будзе красавацца няроднае слова. Тады я і вырашыў, ні з кім не раячыся, унесці свае карэктывы ў заданне. І ніхто на мяне за самавольства не пакрыўдзіўся. Хутчэй наадварот.

— Якой ты бачыш сваю місію? Можа, марыш адкрыць сваю беларускамоўную міні-пякарню?

— Вядома, цуды здараюцца і бывае так, што мары пачынаюць здзяйсняцца. Пэўна, я быў бы шчаслівы, калі б меў сваю беларускамоўную пякарню, але на гэты момант задаволены значна меншым. Калісьці я вырашыў для сябе, што маё жыццё павінна быць з водарам хлеба, то дзякуй лёсу, што ад хлеба мяне далёка не адштурхоўвае.

Надзея ДРЫЛА.
dryla@zviazda.by

■ Выпрабавана на сабе

БІЛІНГВІЗМ НА КАРЫСЦЬ

У сеціве блукае сацыяльная рэклама. У ёй члены нібыта клуба ананімных карыстальнікаў беларускай мовы па чарзе расказваюць пра свой вопыт: як даўно размаўляюць, з кім, з чаго ўсё пачалося і навошта яны ўвогуле гэта робяць. Дык вось, я размаўляю па-беларуску ўжо два гады, а, можа, і болей. І не стала б пра тое казаць, калі б выкарыстанне мовы кардынальна не змяніла маё жыццё ў лепшы бок.

УПЛЫЎ НА ІНТЭЛЕКТ

Гэта адчуваецца адразу. Першыя месяцы практыкі пайшлі на тое, каб навучыцца размаўляць без рускіх слоў, выключна па-беларуску. Да гэтага пісьмовую мову яшчэ ў школьныя часы мне добра паставілі, таму справа заставалася за невялікім. Але штодзённа мозг супраціўляўся, галава так і «закіпала» ад нежадання напружыцца і запомніць новыя слоўцы. Пасля колькіх месяцаў патугаў, сесія, якую было вырашана здаваць цалкам на беларускай мове, аказалася найлепшай па адзнаках за тры папярэднія гады навучання. І першая за ўсе тры курсы выдатная!

Як сцвярджае Таццяна Дзьячэнка, рускі псіхолаг, якая жыве апошнія гады ў Амерыцы, білінгвізм карысны для развіцця мозга. Даследаванні паказваюць, што ў людзей, якія валодаюць і актыўна карыстаюцца дзвюма мовамі, больш гібкае мысленне, вышэйшая канцэнтрацыя ўвагі, больш развітыя агульныя маўленчыя здольнасці.

Вывучэнне яшчэ адной мовы стымулюе памяць, рост і выжыванне новых клетак мозга. Даследаванні ў Ізраілі, праведзеныя з людзьмі ва ўзросце 80 гадоў і старэйшымі, дэманструюць станоўчы ўплыў мультылінгвізму на запаволенне працэсу старэння. Людзі, якія валодаюць некалькімі мовамі, маюць вышэйшы каэфіцыент інтэлекту, і іх душэўнае здароўе значна лепшае, чым у тых, хто гаворыць толькі на адной мове. Вывучаючы і выкарыстоўваючы другую мову, мозг вырошчвае зусім новую, дадатковую сістэму нейронаў, якая апрацоўвае інфармацыю ўжо па-іншаму. А гіпакампус, адказны за памяць, стымулюе іх рост. Аб'ём некаторых участкаў мозга ў прамым сэнсе расце.

Сапраўды, акрамя таго, што за час карыстання беларускай мовай значна палепшылася памяць, таксама стала лягчэй успрымаць інфармацыю, выкладаць свае думкі вусна і на паперы.

АСОБА БІЛІНГВАЎ

З цягам часу, калі беларуская мова была вывучана, а амаль забытая за гэты перыяд руская згадана, я стала разумець, што калі гавару то на адной, то на другой мове — адчуваю сябе па-рознаму. Як высветлілася, калі мы валодаем дзвюма або больш мовамі, то можам думаць рознымі спосабамі, таму што кожная з іх мае ўласныя законы мыслення, логіку, граматыку, сінтаксіс, семантычныя палі і структуру слоўніка, што адлюстроўваецца на пэўных асаблівасцях нацыі.

Напрыклад, на фанетычным узроўні беларуская мова больш мілагучная, напэўная, на ёй нават складана павысіць голас. Разумею, што так адбылося не толькі з-за мовы, хоць і не без яе ўдзелу, але маё жаданне канфліктаваць з навакольным асяроддзем амаль цалкам сышло на нішто. Наш дом, які раней поўніўся па-італьянску эмацыянальнымі выказваннямі і гутаркамі, стаў прытулкам спакою і шчырых размоў.

Мае здагадкі пацвярджаюць праведзеныя даследаванні, якія паказваюць, што адказы на пытанні псіхалагічнай анкеты могуць залежаць ад таго, на якой мове яны падаюцца. Напрыклад, калі кітайска-англійскіх білінгваў прасілі запоўніць анкету на кітайскай мове на тэму пачуцця ўласнай годнасці, яны давалі адказы, якія сведчылі пра больш нізкую ступень самапавагі, чым калі тую ж самую анкету ім прапаноўвалася запоўніць па-англійску. Прычына гэтаму — культурныя адрозненні. Чытаючы пытанні на англійскай мове, бікультурныя рэспандэнты наладжваюцца на амерыканскую хвалю самасцвярджэння, але калі бачаць пытанні на кітайскай — праяўляюць традыцыйную ўсходнюю сціпласць.

НОВЫЯ ЭМОЦЫІ І СЭНС

Некаторыя словы ў беларускай мове маюць яшчэ больш адценняў і значэнняў, чым у рускай. Напрыклад, праз пераклад слова «чай» я даведалася, што тое, што заварваюць у пакеціку, так і называецца. Калі выкарыстоўваюць ліставую заварку ці дадаюць зёлкі — гэта ўжо «гарбата». Яна засыпаецца ў імбрык і заліваецца кіпнем з чайніка. За сталом пад гарачы напой вядуцца гутаркі, размовы, бяседы. Яшчэ болей развіваюць фантазію і эмпатыю беларускія дзеясловы. Акрамя таго, што з'явілася розніца, кахаеш ты (хлопца) ці любіш (маці), новыя сэнсы атрымала слова цешыцца, шкадаваць, шчыраваць... На ўсё сваё слова і эмоцыя! Але гэта толькі вяршыня айсберга.

Калісьці, блукаючы па прасторах Facebook, адшукала запіс, апублікаваны мужчынам, што родам з Палесся: «Палескі жаночы ген перадаецца праз слова «гараваць». Палескі мужчынскі ген перадаецца праз слова «змагацца». Калі я жыў у Мінску, да мяне часта прыязджаў брат, прывозіў бульбу-варэнне ад маці. На развітанне казаў: «Ну, давай, змагайся». Маўляў, я табе дапамог, чым мог, далей цягніся да сонца сам. А потым тэлефанавала маці: «Трэба гараваць. А як ты думаў — што ўсё лёгка будзе?»

Аўтар сцвярджае, што гэтыя два словы не перакладаюцца на рускую мову. На Палессі яны татэмныя, складаюць своеасаблівую структуру «інь і ян», у якой гараванне стрымлівае змаганне. Мужчынская энергія стрымліваецца жаночай. Стрымліваецца не для знішчэння, а для захавання». У гэтым, маўляў, і ёсць філасофія беларускай мовы, а не ў вызначэнні дробных значэнняў.

P.S. *Аднойчы падзялілася з калегай, Валянцінай Доўнар, якую добра ведаюць чытачы «Звязды», што часам напішу слова, перачытаю і не разумею, што яно значыць. Праверу ў слоўніку — і высвятляецца, што яго выкарыстанне ў гэтым сказе самае трапнае. Чаму так? «Гэта голас продкаў унутры вас падказвае», — смяецца Валянціна Аркадзеўна. І, напэўна ж, мае рацыю. Ёсць штосьці чароўнае ў тым, што патрэбныя беларускія словы прыходзяць нібыта з паветра. Бо незалежна ад таго, карыстаемся мы імі ці не, яны прыродай упісаны ў генетычны код беларусаў, які хоцькі-няхоцькі ўздзейнічае на характар, жыццё і лёс кожнага з нас.*

Вераніка ПУСТАВІТ. *pustavit@zviazda.by*

ПЛАЦДАРМ
Сумесны праект рэдакцыі газеты «Звязда» і Міністэрства абароны Рэспублікі Беларусь
Выпуск № 2 (53)

Ваенная дынастыя Андрыеўскіх налічвае пяць пакаленняў і амаль стагоддзе бесперапыннай воінскай службы

■ Гонар краіны

Афіцэры заўжды афіцэры

Увайшоўшы на кафедру аператыўнага мастацтва факультэта Генеральнага штаба Узброеных Сіл, трапляеш быццам у музей. Кабінетныя сцены ўпрыгожваюць шматлікія ўзнагароды, воінскія значкі, халодная зброя — гэтыя «экспанаты» прафесар кафедры Канстанцін Андрыеўскі збіраў не адзін год. Частка калекцыі для яго асабліва каштоўная: па фотаздымках родных, змешчаных побач, нескладана здагадацца, што гэтымі ордэнамі і медалямі ўзнагароджвалі дзеда і некалі яго самога. Бацька Канстанціна Уладзіслававіча калекцыю сына, які беражліва захоўвае гісторыю сваёй сям'і, папаўняць пакуль не збіраецца, але ахвотна дзеліцца з ім рарытэтнымі дакументамі.

Ваенная дынастыя Андрыеўскіх налічвае пяць пакаленняў. Распачаўшы службу яшчэ ў Чырвонай Арміі, Франц Андрыеўскі, ветэран Вялікай Айчыннай вайны, сышоў у адстаўку ў званні генерал-маёра. Яго сын — Уладзіслаў Францавіч — у афіцэрскай кар'еры дасягнуў бацькавага поспеху. Унук Канстанцін, да якога мы завіталі ў госці, сышоў на пенсію ў званні палкоўніка, а яго родны брат Пётр — падпалкоўніка. Сёння па афіцэрскім шляху крочыць праўнук родапачынальніка дынастыі. Пакуль Канстанцін носіць лейтэнанцкія пагоны, але, хто яго ведае, магчыма, менавіта ён перасягне ў званні свайго легендарнага продка.

СПЕЦКАМАНДЗІРОЎКА... НА ФРОНТ

Ваенная кар'ера Франца Андрыеўскага пачалася ў 1925 годзе, калі ён паступіў у Кіеўскую артылерыйскую школу. Адслужыўшы там пасля заканчэння камандзірам узвода, камандзірам батарэі, начальнікам штаба, памочнікам начальніка штаба палка, Франц вучыўся ў Ваеннай артылерыйскай акадэміі, што ў Ленінградзе. У адну з начэй 1937 года практычна ўвесь прафесарска-выкладчыцкі састаў і частку слухачоў арыштавалі. Астатніх размеркавалі па воінскіх часцях і ваенных навучальных установах.

Паколькі Франц Андрыеўскі вывучаў французскую і іспанскую мовы, яго накіравалі давучвацца ў Ваенную акадэмію імя Фрунзэ. Меркавалася, што ён паедзе ваенным саветнікам у Іспанію, дзе якраз ішла вайна. Дабіраліся туды на параходзе. Іх, колішніх выпускнікоў, пераапранулі ў грамадзянскую вопратку, далі замежныя пашпарты, дзе былі ўказаны іншыя імёны. Але да Іспаніі не даехалі — вайна скончылася.

Затым была служба на Далёкім Усходзе, дзе ў складзе 1-й асобнай Чырванасцяжнай арміі Франц і сустрэў Вялікую Айчынную вайну. Афіцэраў адтуль на фронт не адпраўлялі — у любы момант чакалі нападзення японцаў.

— Я памятаю, як дзядуля расказваў, што маральна гэта было не лягчэй, чым тым, хто быў на фронце, — гаворыць Канстанцін Андрыеўскі. — Яны пастаянна былі ў напружанні. Дзядуля казаў, што лепш было б, каб усё пачалося, чым чаканць. Побач з ім знаходзіліся жонка і трое дзяцей.

Канстанцін, Пётр *(уверсе злева направа)*, Уладзіслаў і Франц АНДРЫЕЎСКІЯ.

Тым не менш усе хацелі трапіць на фронт! У 1944 годзе Франц паехаў служыць у Войска Польскае начальнікам аператыўнага ўпраўлення галоўнага штаба. У асабістай кніжцы Андрыеўскага гэтая паездка запісана як спецкамандзіроўка.

СЯБРАВАЎ З МАРЭСЬЕВЫМ І ПАЛЯВАЎ З РАКАСОЎСКІМ

У 1945 годзе сям'я пераехала ў Прыбалтыку. Нягледзячы на тое, што вайна скончылася, час быў няпросты. Кіруючы склад рэгулярна атакавалі нацыяналісты. «Бацька расказваў, як аднойчы ён хаваўся ад невядомых людзей, якія прыйшлі па яго ў гімназію, каб забіць як сына чырвонага камандзіра, — успамінае Канстанцін Уладзіслававіч. — На дзядулю напалі, калі ён ехаў у машыне. Забілі кіроўцу і ад'ютанта. Двух бандытаў напаткалі дзедавы кулі».

У 1951 годзе Франца Андрыеўскага накіравалі спачатку намеснікам камандуючага ваеннай акругі, а потым камандаваць акругай у Польшчу. Міністрам нацыянальнай абароны гэтай краіны якраз тады быў Канстанцін Ракасоўскі. У калекцыі ўнука захоўваецца дакумент дзеда з подпісам маршала. Ёсць і фотаздымак, на якім Франц Андрыеўскі, начальнік Генеральнага штаба Войска Польскага Корчыц, Жукаў, Булганін і іншыя вядомыя военачальнікі слухаюць дакладчыка. Якога — на фатаграфіі не відаць, але вядома, што тады перад імі выступаў Ракасоўскі.

— Дзядуля быў заўзятым паляўнічым, і Ракасоўскі таксама, — расказвае ўнук. — Яны палявалі разам, ездзілі на рыбалку. Сябраваў ён і з легендарным Марэсьевым. Калі дзядуля выйшаў на пенсію, шмат займаўся ветэранскай дзейнасцю. Як толькі Марэсьеў па ветэранскіх справах прыязджаў у Рыгу, ён заўсёды браў мяне на гэтыя сустрэчы.

Іх перапіска з Марэсьевым, а таксама ўзнагароды дзядулі-генерала — ордэн Леніна, два ордэны Чырвонага Сцяга, тры ордэны Айчыннай вайны і пяць польскіх узнагарод — займаюць пачэснае месца ў калекцыі прафесара.

ПЛЕЯДА АРТЫЛЕРЫСТАЎ

Бацька Канстанціна Андрыеўскага — таксама артылерыст. Скончыў 1-е гвардзейскае Маскоўскае мінамётна-артылерыйскае вучылішча, якое тэрытарыяльна размяшчалася ў Калінінградзе. Вучыліся страляць на «Кацюшах».

Ужо будучы камандзірам батарэі, Уладзіслаў Андрыеўскі паступіў у акадэмію Фрунзэ. Пасля вучобы паехаў у Ерэван, дзе працаваў у аператыўным аддзеле штаба дывізіі, а потым у Тбілісі служыў у аператыўным упраўленні Закаўказскай ваеннай акругі. Закончыў службу ў Маскве, у Галоўным штабе сухапутных войск намеснікам начальніка арганізацыйна-мабілізацыйнага ўпраўлення.

Сёння генерал-маёру ў адстаўцы 85 гадоў. Ён жыве ў Маскве разам са сваім старэйшым сынам, які, дарэчы, таксама насіў афіцэрскія пагоны. Пётр скончыў Тбіліскае вышэйшае ваенна-камандное артылерыйскае вучылішча і сышоў у адстаўку ў званні падпалкоўніка.

У ДЫНАСТЫІ — ПЕХАЦІНЕЦ

Малодшы сын генерал-маёра пасля заканчэння сярэдняй школы ў Тбілісі паступіў у Бакінскае вышэйшае агульнавайсковае камандное вучылішча. Пехацінец! Як успамінае Канстанцін Андрыеўскі, падчас сямейных сустрэч родныя не ўпускалі магчымасці па-добраму пажартаваць з таго, хто абарваў плеяду артылерыстаў.

Пасля заканчэння вучылішча Канстанцін Андрыеўскі ўсяго паўгода праслужыў у Адэскай ваеннай акрузе, як раптам — незапланаваная камандзіроўка... «Аб гэтым услых не казалі, але мы здагадваліся, куды едзем», — успамінае ён. У Афганістан разам з таварышамі прыехалі ў студзені 1980 года. Служыў камандзірам роты ў горна-стралковым батальёне 70-й асобнай мотастралковай брыгады. За баявыя дзеянні ў Афганістане Канстанцін Андрыеўскі быў узнагароджаны двума ордэнамі Чырвонага Сцяга. Нагадваюць аб тых нялёгкіх гадах і іншыя ўзнагароды.

«ШЧАСЦЕ ЖЫЦЬ У БЕЛАРУСІ!»

У Беларусь Канстанцін Андрыеўскі прыехаў пасля службы ў Закаўказскай ваеннай акрузе і вучобы ў Ваеннай акадэміі Венгерскай народнай арміі. Гэта быў 1989 год. Ён — начальнік штаба 339-га гвардзейскага мотастралковага палка 120-й дывізіі.

(Заканчэнне на 6-й стар.)

■ Выпрабавана на сабе

ЗАДАЧА — ВЫЖЫЦЬ!

Як журналісты «Звязды» ратаваліся ад «тэрарыстаў» і аказвалі медыцынскую дапамогу ў экстрэмальнай сітуацыі

Звычайны працоўны дзень. Скончылася мерапрыемства, і журналістаў запрасілі папіць кавы. З задавальненнем смакуючы гарачае пітво з духмяным печывам, мы абмяркоўваем апошнія падзеі ў краіне і свеце, дзелімся прафесійнымі штучкамі, некаторыя, адасобіўшыся ад іншых, гавораць пра нешта асабістае. Раптам чуюцца стрэлы, і людзі ў масках урываюцца ў пакой...
Зашыўшыся пад сталом, я з замiраннем сэрца назіраю за тым, што адбываецца вакол. Каця з партала Tut.by у паніцы мітусіцца па памяшканні. Люда і Віталік з «Советской Белоруссии» ў разгубленасці — не могуць зразумець, што здарылася. Раміль, фотакарэспандэнт Беларускага тэлеграфнага агенцтва, спрабуе дапамагчы параненаму, а Сяргей, мой калега са «Звязды», увогуле недзе знік. Апрытомнеўшы, я кідаюся ў бок аптэчкі, якую заўважыла яшчэ загадзя, і, схапіўшы адтуль рулон бінту, бягу да скурчанага ад болю «параненага». Як умею, бінтую яго акрываўленую руку і разам з пацярпелым перабягаю ў іншы пакой. Пераканаўшыся, што мы ў небяспецы, дапамагаю накласці павязку яшчэ аднаму «параненаму». Нехта з калег выклікае «хуткую».

Гэта не здымкі блокбастара і, дзякуй Богу, не эпізод з жыцця. У сітуацыі, набліжанай да рэальнасці, журналісты айчынных медыя апынуліся падчас азнаямляльнага курса «Асновы аказання першай дапамогі ў экстрэмальных умовах прафесійнай дзейнасці прадстаўнікоў СМІ», які для нас арганізавалі ў Цэнтры спецыяльнай падрыхтоўкі.

Як паказваюць апошнія падзеі ў свеце, каб трапіць у экстрэмальную сітуацыю, карэспандэнту неабавязкова ехаць на вайну. Ён можа браць інтэрв'ю ў кафэ або працаваць у прэс-цэнтры, калі можа здарыцца такое, што трэба будзе не толькі як мага хутчэй уцякаць, а і дапамагаць рабіць гэта іншым. А калі ёсць параненыя, яшчэ і аказваць першую дапамогу. Ды і наўрад ці ў надзвычайнай сітуацыі згадаеш, як гэта рабілі на школьных занятках па АБЖ, а потым на медыцынскай падрыхтоўцы ў інстытуце. У баявых умовах спыніць крывацёк і накласці павязку часта неабходна спадручнымі сродкамі. А калі ж пад бокам яшчэ ёсць і аптэчка, трэба правільна абысціся з яе змесцівам.

Занятак №1.
Спыніць крывацёк і накласці павязку

Перш чым пачаць заняткі па тактычнай медыцыне, нас папрасілі азнаёміцца з тэхнікай бяспекі і паставіць свой подпіс у патрэбнай графе. У мяне адразу ўзнікла пытанне: навошта здымаць пярсцёнкі і іншыя ўпрыгажэнні? Спецыялісты імгненна зрэагавалі і патлумачылі, як гэтымі бяскрыўднымі на першы погляд рэчамі чалавеку можна нанесці шкоду. Пярсцёнкам, напрыклад, папросту парэжаш палец, завушніцамі — парвеш мочкі вушэй, а ланцужок увогуле пры пэўных умовах можа справакаваць удушша.

Курс пачаўся з лекцыі. Уважліва слухаючы спецыялістаў, асноўнае мы занатоўвалі ў блакнот. Самае галоўнае ў экстрэмальнай сітуацыі — выжыць. Ва ўмовах, калі чалавек пакутуе ад ранення або траўмы, якія пагражаюць яго жыццю, няма часу на выклік урача. Ды і наўрад ці гэта магчыма ва ўмовах, калі страляюць. Галоўнае ў такім выпадку — сысці ў бяспечнае месца, а толькі потым аказваць дапамогу таварышу і, калі патрэбна, сабе.

— Калі табе правільна аказалі першую медыцынскую дапамогу, то, адпаведна, і шансаў на выжыванне значна больш, — тлумачыць **начальнік аддзела навукова-метадычнага забеспячэння Цэнтра спецыяльнай падрыхтоўкі Ігар ГРЫГАРОВІЧ.** — Першае, што трэба зрабіць, — спыніць крывацёк або папярэдзіць удушша. Пасля таго, як вы аказаліся ў небяспечным месцы, трэба паправіць або замяніць павязку, якая была накладзена пад агнём. Каб не прапусціць іншыя раненні, варта ўважліва агледзець чалавека: часам маленькая драпіна можа прывесці да вялікай бяды.

Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

Своечасовае аказанне першай медыцынскай дапамогі дае больш шанцаў на выжыванне.

(Заканчэнне на 6-й стар.)

■ Вярнуць з небыцця

УЛЮБЁНЕЦ ПАРТЫЗАНАЎ

Мацвей Марусік удзельнічаў у баявых аперацыях пад камандаваннем Васіля Варанянскага і вучыўся разведцы ў самога Ваўпшасава

Калі ўпраўленне КДБ па Гродзенскай вобласці прадаставіла мне асабовыя справы былых разведчыкаў партызанскага руху на Беларусі, я шмат даведаўся пра работу чэкістаў у гады Вялікай Айчыннай вайны. На падставе архіўных матэрыялаў і асабістых сустрэч з ветэранамі адкрыў для сябе асобу Мацвея Марусіка.

Па нацыянальнасці ён паляк. Нарадзіўся ў 1900 годзе ў сялянскай сям'і ў вёсцы Янінуў Лодзінскага ваяводства. Служыў у польскай арміі, працаваў чорнарабочым на цэлюлознай фабрыцы ў Влацлаўску. У 1927 годзе быў прыняты ў рады Камуністычнай партыі Польшчы, працаваў сакратаром падпольнага акруговага камітэта ў Познані, Кракаве і Катавіцах. У 1933 годзе быў арыштаваны і асуджаны польскім судом да 7 гадоў турмы. Вызваліўся па амністыі напрыканцы 1936-га, працягваў займацца партыйнай работай да роспуску кампартыі Польшчы ў 1938 годзе. Пасля чаго будаваў дамы, а з пачатку 1941 года загадваў раённым аддзелам сацыяльнага забеспячэння ў Беластоку.

Калі пачалася Вялікая Айчынная вайна, Марусік у складзе Чырвонай Арміі ўдзельнічаў у баях пад Ваўкавыскам, Россю, Навагрудкам, а ў канцы чэрвеня 1941 года пад Мінскам апынуўся ў акружэнні. Гітлераўцы кінулі яго, як і іншых ваеннапалонных, у канцлагер «Дразды». Уцячы адтуль удалося ў сакавіку 1942 года з дапамогай дзвюх жыхарак пасёлка Ратамка. Ад сваіх ратавальніц ён даведаўся, што ў руднянскіх і манькольскіх лясах дзейнічаюць партызаны, вырашыў іх шукаць. Так Мацвей Марусік трапіў у партызанскі атрад «Мсцівец» пад камандаваннем Васіля Варанянскага і пасля адпаведнай праверкі (ці не правакатар?) стаў удзельнічаць у баявых аперацыях.

Як расказваў потым начальнік штаба партызанскай брыгады «Народныя мсціўцы» Віталь Яськоў, Марусіка спачатку засмучала тое, што ў яго не было вінтоўкі і падчас дзяжурства на пасту даводзілася карыстацца чужой зброяй. Неўзабаве пасля бою з гітлераўцамі на плячы Марусіка з'явілася вінтоўка, а ў руках — трафейны пісталет.

Потым ён удзельнічаў у разгроме нямецкіх гарнізонаў у мястэчках Даўгінава і Мядзел, у дыверсіях на чыгунцы, у засадах на шашы... У ліпені 1942 года Марусік па-геройску, вынаходліва праявіў сябе ў баі з эсэсаўскімі і паліцэйскімі фарміраваннямі, якія наступалі на партызанаў у валянцінаўскім лесе Плешчаніцкага раёна. Ён забраўся з вінтоўкай на вялікую яліну і знішчыў двух варожых кулямётчыкаў.

Аднойчы ў тыл праціўніка для разведвальна-дыверсійнай дзейнасці прыбыла спецыяльная група ў складзе вопытных чэкістаў-разведчыкаў, збройнікаў, падрыўнікоў, радыста, шыфравальшчыка, перакладчыка, урача. Прайшоўшы на лыжах некалькі соцень кіламетраў, яна ў сакавіку 1942-га спынілася ў лесе паблізу вёскі Валянцінава Плешчаніцкага раёна, папоўнілася байцамі і неўзабаве стала партызанскім атрадам асобага прызначэння «Мясцовыя». Каля двух з паловай гадоў ім камандаваў пад псеўданімам «Градаў» легендарны савецкі разведчык, будучы Герой Савецкага Саюза Станіслаў Ваўпшасаў.

Адной з задач спецатрада «Мясцовыя» было выкрыццё лжэпартызанскіх груп. Напрыклад, адна з іх арудавала на тэрыторыі Барысаўскага, Бягомльскага раёнаў — ніякай барацьбы з ворагам не вялі, а рабавалі мясцовых жыхароў, забіралі жывёлу, патрабавалі самагонку. Іх затрымалі, і пасля допыту Ваўпшасаў даў ім баявое заданне. Аднак тыя нічога не выканалі і працягвалі рабаваць насельніцтва. Тады лжэпартызанаў арыштавалі і сурова пакаралі па законах ваеннага часу: камандзіра, яшчэ некаторых бандытаў расстралялі, а астатніх накіравалі ў штрафную роту.

У гэтай рабоце спецатраду дапамагаў штаб брыгады Варанянскага. Менавіта там Ваўпшасаў прыкмеціў Марусіка і пачаў вучыць яго рабоце ў разведцы. Невыпадкова той пазней стаў начальнікам асобага аддзела партызанскага атрада імя Ленінскага камсамола.

— Цудоўны быў чалавек, улюбёнец усіх партызанаў. Мы маглі на яго спадзявацца, як на Бога, — казалі мне пра Марусіка партызаны Уладзімір Тарашчык, браты Аляксандр і Васіль Кандратовічы, якія жылі ў Гродне.

Дарэчы, нядаўна ў Нацыянальным архіве Беларусі я даведаўся, што пры атрадзе стварылі вучэбны ўзвод для ваеннай падрыхтоўкі байцоў з мясцовага насельніцтва. Загад падпісаў выконваючы абавязкі камандзіра атрада Мацвей Марусік.

Паводле архіўных звестак, Мацвей Марусік «загінуў 3 чэрвеня 1944 года ў баі з белапалякамі ў лесе каля вёскі Вялікія Бярозаўцы Васілішкаўскага раёна падчас выканання разведзадання». Па маёй версіі, ён ішоў на заданне па разгортванні Васілішкаўскага антыфашысцкага камітэта польскіх патрыётаў. Магчыма, з пранікненнем у другую роту 118-га паліцэйскага батальёна, што дыслацыравалася ў Васілішках, каб хтосьці перайшоў адтуль на бок партызанаў.

Мацвей Марусік пахаваны партызанамі на могілках вёскі Шынкаўцы Шчучынскага раёна. За мужнасць і гераізм у барацьбе з нямецка-фашысцкімі захопнікамі пасмяротна ўзнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі. Вядома, што начальнікам Беларускага штаба партызанскага руху Пятром Калініным ён прадстаўляўся да ўзнагароджання ордэнам Чырвонага Сцяга.

Яўген ДАЛІДОВІЧ, ветэран Вялікай Айчыннай вайны,
г. Гродна

■

Афіцэры заўжды афіцэры

(Заканчэнне. Пачатак на 5-й стар.)

— Кожны афіцэр марыў служыць у Беларусі, — успамінае прафесар. — Па тым часе Беларуская ваенная акруга была адной з перадавых у Саюзе. Заўсёды ў афіцэрскім асяродку адзначалася высокая агульная культура і чароўнасць беларускага народа. Сацыяльныя ўмовы ваеннаслужачых былі лепшымі, чым у многіх іншых рэспубліках. Пачуццё захаплення краінай засталося і дагэтуль: трэба пабываць у многіх месцах, каб ацаніць, якое шчасце жыць у Беларусі!

У 1994 годзе Канстанцін Андрыеўскі перайшоў служыць у аператыўнае ўпраўленне Галоўнага штаба, а праз сем гадоў паступіў у Акадэмію Генеральнага штаба ў Маскве. Затым ён — намеснік камандуючага Паўночна-Заходняга аператыўнага камандавання, начальнік штаба Заходняга аператыўнага камандавання. За выдатную службу з рук Прэзідэнта краіны атрымаў ордэн «За службу Радзіме» III ступені. Акрамя таго, Канстанцін Уладзіслававіч стаяў ля вытокаў стварэння факультэта Генеральнага штаба Узброеных Сіл Беларусі.

ДЫНАСТЫЯ ПРАЦЯГВАЕЦЦА

Сыну Канстанціна Андрыеўскага лейтэнанцкія пагоны даліся няпроста. Але няглядзячы на пэўныя перашкоды, яго мара спраўдзілася і ён працягнуў афіцэрскую дынастыю сваёй сям'і. Цяпер Канстанцін працуе ў Ваеннай акадэміі. Самы юны прадстаўнік дынастыі — на фотаздымках — таксама прысутнічае ў міні-экспазіцыі свайго бацькі.

Дарэчы, у калекцыі Канстанціна Уладзіслававіча ёсць і георгіеўскія крыжы. Каму яны належалі, прафесар не ведае. Затое, як яны да яго трапілі, памятае добра.

«Дзядуля быў заўзятым паляўнічым, і Ракасоўскі таксама. Яны палявалі разам, ездзілі на рыбалку. Сябраваў ён і з легендарным Марэсьевым».

— У той час я служыў на Каўказе, — расказвае ён. — А ўсходнія жанчыны, як вядома, вельмі любяць насіць упрыгажэнні, якія часта робяць сваімі рукамі. І вось я неяк убачыў у іх георгіеўскія крыжы. Яны ўжо збіраліся адразаць стужкі. Я падышоў і папрасіў не чапаць крыжы. Узамен прыйшлося падзяліцца некалькімі сярэбранымі манетамі.

* * *

Напрыканцы нашай сустрэчы спытала ў Канстанціна Уладзіслававіча, якое свята асабліва шануецца ў іх сям'і. Хоць і здагадвалася, якім будзе адказ, такога павароту не чакала. Аказваецца Дзень абаронцаў Айчыны для іх асаблівае свята яшчэ і таму, што 23 лютага адзначала свой Дзень нараджэння мама Канстанціна Андрыеўскага, а зараз святкуе яго сын — аб такім падарунку марыць кожны афіцэр!

Вераніка КАНЮТА.
kanyuta@zviazda.by
Фота з асабістага архіва Канстанціна АНДРЫЕЎСКАГА.

ЗАДАЧА — ВЫЖЫЦЬ!

(Заканчэнне. Пачатак на 5-й стар.)

Калі западозрана любое раненне канечнасці, яе трэба зафіксаваць. Зрабіць гэта можна нават з дапамогай кашулі ці світару або непашкоджанай нагі, якая можа служыць у якасці шыны для параненай. Вядома, зручней будзе з дапамогай стандартных сродкаў імабілізацыі — так званых шын. Калі чалавек без прытомнасці, трэба кантраляваць яго пульс і пакласці ў позу выратавання — такім чынам будзе забяспечана праходнасць верхніх дыхальных шляхоў. І толькі тады, калі першая дапамога аказана, выклікаецца хуткая.

У экстрэмальнай сітуацыі вельмі важна ўмець спыніць крывацёк. Элементарнае няведанне можа прывесці да самых дрэнных наступстваў. Самы распаўсюджаны метад — спыніць крывацёк з дапамогай жгута. Яшчэ са школы помніцца, што летам жгут накладваецца максімум на дзве гадзіны, зімой — на гадзіну. Але, як запэўніваюць эксперты, часам і 20 хвілін дастаткова, каб давесці канечнасць да ампутацыі. Таму са жгутом трэба быць вельмі асцярожнымі. Калі ж можна абысціся без яго, то спыніць кроў магчыма як пальцавым прыцісканнем, так і каленам — у пахавіне або ў падпашнай артэрыі, дзе спыніць крывацёк дапаможа фізічная сіла.

Хутка спыняюць крывацёк такія сучасныя медыцынскія прэпараты, як гемастопы. Рэчыва, якое трапляе на рану, выклікае хімічную рэакцыю і кроў спыняецца. Як варыянт — кігнезіўная стужка або кроваспыняльная касынка. Універсальным сродкам з'яўляюцца ізраільскія перавязачныя пакеты, якія з нядаўніх часоў можна купіць і ў нашых аптэках.

Спецыялісты прадэманстравалі асноўныя спосабы накладвання павязак. Гэта мы не раз вучыліся рабіць падчас медпадрыхтоўкі. А вось як накладваць павязку на кішэчнік, я, напрыклад, даведалася ўпершыню. У такім выпадку трэба абкласці рану бінтамі, сурвэткамі або іншымі мяккімі рэчамі (пажадана вільготнымі) і толькі потым перавязваць рану. Добра, калі на кішэчніку будзе ляжаць цэлафан.

Занятак № 2.
Прывесці ў прытомнасць і «завесці» сэрца

Для правядзення практычнага занятку па тактычнай медыцыне мы накіраваліся ў спартыўную залу. Тут нас навучылі, як аказваць дапамогу пры такіх жыццёва пагражальных сітуацыях, як кароткачасовая страта прытомнасці, кома і клінічная смерць.

— Самае галоўнае правіла выратавальніка — абарані сябе сам, — расказвае **прафесар, доктар біялагічных навук Маргарыта АГАФОНАВА.** — Перш, чым аказваць дапамогу пры страце прытомнасці, трэба ведаць свае асабістыя адносіны да выгляду пашкоджанага цела, да пахаў. Калі чалавек ведае як дапамагчы, але не можа гэтага зрабіць у сілу асаблівасцяў свайго арганізма, то ён стане наступным пацярпелым.

Апынуўшыся ў экстрэмальнай сітуацыі, журналісты механічна ўзнавілі атрыманыя веды па тактычнай медыцыне.

Асноўная прыкмета, якая дапамагае высветліць, жывы чалавек ці не — гэта пульс. Прадаўліванне соннай артэрыі дазваляе зрабіць адразу два вывады. Жывы чалавек ці не, дапаможа вызначыць наяўнасць або адсутнасць пульсу. Калі чалавеку пры гэтым балюча, то ён у стане кароткачасовай страты прытомнасці. Калі ж няма ніякай рэакцыі, то гэта стан комы. Калі ж гэта кароткачасовая страта прытомнасці, якія нашы дзеянні? Па-першае, трэба падхапіць чалавека, каб ён не атрымаў траўму, несумяшчальную з жыццём. Затым праверыць у яго пульс. Потым расшпіліць кашулю і вызваліць ад іншых непатрэбных рэчаў, падняць яму ногі. Няма нашатырнага спірту — прывесці ў прытомнасць дапаможа націсканне пальцам у ямачку пад носам.

Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

Каб правільна накласці павязку, медыцынская адукацыя не абавязковая.

Калі чалавек знаходзіцца ў стане непрытомнасці больш за 3 хвіліны, развіваецца стан комы. Кома — гэта стан працяглай страты прытомнасці, пры якім ёсць пульс і няма болевай рэакцыі. Пры гэтым расслабленыя ўсе мышцы цела. Каб папярэдзіць удушша (у такім стане задзіраецца язык і актывізуецца рвотны цэнтр), журналістаў навучылі рабіць паварот выратавання.

Калі ў пацярпелага насупіла клінічная смерць, паспрабаваць вярнуць чалавека да жыцця дапамогуць непрамы масаж сэрца або штучная вентыляцыя лёгкіх. Як гэта рабіць, патрэніраваліся на спецыяльным робаце-трэнажоры з біялагічна зваротнай сувяззю. Калі дапамога аказана правільна, у трэнажора загараюцца вочы, калі ж не — у вобласці сэрца свеціцца чырвоны маячок: так трэнажор Гоша сігналізуе, што здзейснена фатальная памылка.

— З дапамогай трэнажора на працягу адных заняткаў выпрацоўваюцца рухальныя навыкі, якія дазваляюць правільна і хутка аказваць першую дапамогу пры спыненні сэрца, — тлумачыць **старшы выкладчык аддзела тактычнай медыцыны Ігар ГЕЛЯЖУНАС.** — Пры непрамым масажы сэрца не павінна быць больш трох прыкардыяльных удараў, больш — немэтазгодна. Самая галоўная мэта лёгачна-сардэчнай рэанімацыі — выратаваць кару галаўнога мозга, якая памірае за 4-5 хвілін. Таму вельмі важна злавіць рытм.

У маіх руках сэрца трэнажора Гошы спачатку спынілася — хутчэй за ўсё, не хапіла фізічнай сілы, якой патрабуе непрамы масаж сэрца. «Завесці» матор арганізма дапамагла лёгачна-сардэчная рэанімацыя, з якой я, хоць і з цяжкасцю, але справілася.

Занятак № 3.
Справіліся паспяхова

З таго, як мы адпрацоўвалі атрыманыя веды ў абстаноўцы, максімальна набліжанай да рэальнасці, я пачала гэтую публікацыю. Скажу шчыра, калі пачаліся выстралы і навакольле заслалі клубы дыму, стала не па сабе. Да рэальнасці вярнулі крыкі «параненых», якія так натуральна выконвалі сваю ролю. Чым лепш аказаць першую дапамогу, не думала. Наклала павязкі тым, што першае трапіла пад руку, — звычайным бінтам. На пэўныя хібы звярнула ўвагу толькі тады, калі апынуліся ў бяспечным месцы. Галоўнае, што жыццю чалавека больш нічога не пагражала.

Вядома, усё гэта было не па-сапраўднаму. Але толькі ў сітуацыі, максімальна набліжанай да рэальнай, журналісты маглі ацаніць свае здольнасці па аказанні першай медыцынскай дапамогі. І трэба сказаць, не медыкі канешне, але з задачай справіліся. Аднак лепш, каб да экзамену на прафпрыдатнасць, як той казаў, не дайшло...

Вераніка КАНЮТА.
kanyuta@zviazda.by

ЗАЛАТЫЯ ДЗЯНЬКІ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Сапраўды мудрыя людзі цэняць кожнае імгненне, кажа псіхолаг. У гэтым і заключаецца перавага ўзросту: назапашаны багаж мудрасці дапамагае ўсвядоміць каштоўнасць часу свайго жыцця і імкнуцца правадзіць яго паўнавартасна. Хоць, вядома, гэта даецца не ўсім.

«Калі да мяне звяртаецца з нейкай праблемай пажылы чалавек, я заўсёды пытаюся: скажыце, у вас такі вопыт за плячыма, а раней у вас былі падобныя складаныя сітуацыі? Як вы тады спраўляліся? — расказвае Вольга. — І часта чалавек сам знаходзіць выхад і правільныя рашэнні, звяртаючыся да сябе самога і свайго досведу. Так што вопыт — гэта вялікае багацце, і ім трэба актыўна карыстацца».

Камп'ютар дапаможа быць у гушчы падзей

Шмат стэрэатыпаў існуе ў грамадстве наконт старэчай немачы. Мы нічога не ведаем пра старасць, акрамя таго, як выглядае цела — і так гэтага баімся, што стараемся пазбягаць азначанай тэмы.

Але ж галоўнае, наколькі вам удалося захаваць маладосць душы, перакананая Вольга Зуева. І гэта кожнаму пад сілу.

— Ды і фізічныя абмежаванні зусім не такія абсалютныя, як нам здаецца на першы погляд, — кажа яна. — Мы можам пачаць дрэнна чуць, але ў нас захоўваюцца іншыя функцыі. Мы заўсёды здольныя адчуваць. І можам мець зносіны з іншымі людзьмі і жыць з улікам абмежаванняў, якія накладвае на нас узрост. Галоўнае — каб у нас было жаданне нешта рабіць, да чагосьці імкнуцца, а не сядзець на месцы.

— Я сутыкаюся з тым, што многія пажылыя хочуць, напрыклад, вывучыць англійскую мову, — працягвае Вольга Зуева. — Здавалася б, навошта? Але ж гэта выдатная трэніроўка памяці, гэта магчымасць мець зносіны з цікавымі людзьмі і жыць актыўна. Адзін мужчына прыйшоў да нас запісацца на камп'ютарныя курсы, калі яму было 89 гадоў! Я яму сказала: «Цудоўна! А што вы хочаце ад гэтых курсаў атрымаць?». І ён адказаў: «Я ніколі не быў у Луўры, хачу наведаць яго віртуальна, з дапамогай інтэрнэту».

Нашы дні прадастаўляюць нам усім выдатную магчымасць, якой ніколі да гэтага не было. Часцяком дзеці або ўнукі купляюць сваім бабулям і дзядулям камп'ютар або аддаюць свой стары. Праўда, у сваякоў не заўсёды атрымліваецца навучыць пажылога чалавека карыстацца ім. Але маюцца курсы камп'ютарнай граматнасці, напрыклад, у нас у «Школе трэцяга ўзросту». І яны вельмі папулярныя, шмат людзей на іх запісваюцца, нават ёсць чарга. Многія гатовыя вучыцца на платнай аснове, заплаціць нейкую мінімальную суму абы хутчэй асвоіць новыя тэхналогіі і карыстацца магчымасцямі, якія яны даюць!

Камп'ютар дапамагае зносінам з людзьмі. У некаторых старых дзеці жывуць за мяжой. З дапамогай скайпу, яны могуць бясплатна тэлефанаваць сваім блізкім у любую кропку свету і не толькі размаўляць з роднымі, але і бачыць іх. Гэта выдатныя магчымасці, і сучасныя пажылыя людзі не хочуць іх губляць. Яны знаходзяць сваіх старых сяброў з дапамогай сайта «Аднакласнікі»... Дзякуючы камп'ютару многія адчуваюць сябе «на хвалі» нягледзячы на ўзрост, знаходзяцца ў гушчы жыцця!

Праўда, псіхолаг адзначае і адваротны бок гэтай захопленасці. Некаторыя пачынаюць актыўна чытаць у інтэрнэце навіны, а там заўсёды шмат негатыву. Начытаюцца, а потым перажываюць: падскоквае ціск, пачынае трапятаць сэрца... Але тут ужо многае залежыць ад самога чалавека і ад таго, на што ён звяртае ўвагу ў першую чаргу, да чаго цягнецца.

Дайце дзецям магчымасць жыць па-свойму

— Да мяне нярэдка звяртаюцца па дапамогу пры канфліктах з дзецьмі і ўнукамі, — распавядае Вольга Зуева. — Пажылыя людзі часта чакаюць ад іх любові і ўвагі, а на справе гэтыя чаканні не заўсёды апраўдваюцца. Маладое пакаленне занята сабой і сваім жыццём. Людзей старэйшага ўзросту часта крыўдзіць, што дзеці і ўнукі не хочуць прыслухоўвацца да іх парад. Памятаю, адзін дзядуля з горыччу казаў: «Я ж ведаю як лепш, хачу расказаць, а ён (унук) мне ў адказ грубіяніць»...

Большасць нашых дзядуляў і бабуль усё аддавалі сваім дзецям, ахвяравалі нейкімі важнымі рэчамі дзеля іх. Яны прывыклі атрымліваць, а цяпер, калі пажылыя людзі чакаюць аддачы, гэтага часта не адбываецца. Сумна.

Але псіхолаг адзначае яшчэ адну тэндэнцыю: пажылыя людзі часта ўпэўненыя, што тое, як яны жывуць, і ёсць адзіна правільна. І не разумеюць, што кожны робіць свой выбар. Трэба дазволіць сваім дзецям дзейнічаць так, як яны лічаць патрэбным.

Кожны чалавек мае права на сваё меркаванне, лічыць мая суразмоўца. Але яго не варта навязваць. Выказваць — можна і трэба, але іншы чалавек мае права выбару: прыслухацца ці не. А калі мы пачынаем пераконваць і настойваць, гэта выклікае толькі супраціўленне і раздражненне. Нельга змяніць іншага чалавека, можна толькі данесці да яго свой пункт гледжання — і ўсё. Многім людзям ва ўзросце ўласціва імкненне зберагчы ад памылкі, абараніць родных людзей. Але тут важна своечасова спыніцца. Кожны чалавек павінен назапасіць свой унікальны вопыт. Пражыць жыццё за іншага — немагчыма.

***

У кожнага з нас — сваё жыццё. І пенсія дорыць нам унікальную магчымасць заняцца сабой, даатрымаць, дарабіць, папоўніць тое, на што раней не было часу. Шмат хто кажа: я цяпер магу чытаць столькі, колькі хачу, і мне не трэба бегчы на працу... І гэта выдатна. Гэта ваша жыццё, ваш час — запаўняйце яго важнымі і цікавымі для вас рэчамі, раіць усім псіхолаг.

Святлана БУСЬКО.
busko@zviazda.by

■ Прававая гасцёўня

ДЗІЦЯ — НА ДЗЯРЖЗАБЕСПЯЧЭННЕ, БАЦЬКОЎ — НА ПРАЦУ

Хто вызначае, калі сям'я стала сацыяльна небяспечнай?

— У маёй суседкі Юлі чатыры дзіцяці ад розных мужчын. Яна замужам, дзеці абутыя-адзетыя, боек у хаце няма. Але ж дзеці ёсць дзеці. То ў школе старэйшы хлопец з кімсьці счэпіцца, то дачка-трэцякласніца ў садок за малым прыйдзе, пакуль маці з немаўлём на руках па гаспадарцы круціцца. З-за гэткіх здарэнняў Юля ўжо не раз чула ў свой адрас ад педагогаў упіканні, што яна «не даглядае дзяцей належным чынам» і «можа трапіць у катэгорыю праблемных і сацыяльна небяспечных сем'яў». Маўляў, так і дзяцей не доўга адабраць. Я вельмі абураная такім стаўленнем і лічу, што крытэрыі па прызнанні таго, што дзеці знаходзяцца ў сацыяльна небяспечным становішчы, у нас вельмі суб'ектыўныя. Чым кіруюцца чыноўнікі пры вынясенні такіх рашэнняў, як яны вывучаюць сітуацыю? Ці праўда магчыма на падставе такіх папрокаў пазбавіцца дзяцей?

Святлана Аляксандраўна, пенсіянерка, *г. Мінск.*

На пытанне адказвае **Яўгенія МІЦКЕВІЧ, кансультант упраўлення прававога рэгулявання сацыяльнай дзейнасці дзяржавы галоўнага ўпраўлення нарматворчай дзейнасці ў сферы дзяржаўнага будаўніцтва Міністэрства юстыцыі Беларусі:**

— Папрокі і заўвагі не з'яўляюцца падставай для адабрання дзяцей з сям'і. Перш чым прыняць такое рашэнне, кожны выпадак грунтоўна і ўсебакова вывучаецца. Калі ваша суседка і яе муж не п'юць і не збіваюць малых, ніхто не будзе вінаваціць іх у неналежным выкананні бацькоўскіх абавязкаў.

Разам з тым трэба памятаць, што Канвенцыя аб правах дзіцяці і беларускае сямейнае заканадаўства сведчаць пра неабходнасць аховы дзяцей ад усіх форм фізічнага або псіхічнага насілля, абразы або злоўжывання, адсутнасці клопату ці нядбайнага выхавання, эксплуатацыі з боку бацькоў ці іншых асоб, якія выхоўваюць непаўналетняга. Пры гэтым адзін з асноўных дакументаў, прызваных абараняць правы і законныя інтарэсы малых у нашай краіне, — гэта, безумоўна, Дэкрэт Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 24 лістапад 2006 г. № 18 «Аб дадатковых мерах па дзяржаўнай абароне дзяцей у праблемных сем'ях».

Згодна з ім адпаведныя дзяржаўныя органы маюць прававыя падставы неадкладна рэагаваць, калі дзеці застаюцца без бацькоўскай увагі і выхавання і знаходзяцца ў абстаноўцы, якая пагражае іх жыццю, фізічнаму і псіхічнаму здароўю. Калі ўстаноўлена, што бацькі (ці адзін з бацькоў) вядуць амаральны лад жыцця, п'юць або ўжываюць наркотыкі і неналежным чынам выхоўваюць і ўтрымліваюць дзяцей, прымаецца рашэнне аб адабранні малых з сям'і з прысваенням статусу дзіцяці, якое засталося без бацькоўскай апекі і якому патрабуецца дзяржаўная абарона. Рашэнне цягам трох дзён прымае камісія па справах непаўналетніх.

Пасля адабрання дзіця накіроўваецца на дзяржаўнае забеспячэнне ў адну з адпаведных устаноў, а бацькі, якія не працуюць, бяруцца на ўлік у органах унутраных спраў для прафілактычнага назірання і ва ўстаноўленым парадку праходзяць абавязковую дзяржаўную дактыласкапічную рэгістрацыю, пры неабходнасці забяспечваюцца дакументамі, якія сведчаць асобу, абавязкова праходзяць медыцынскае абследаванне і падлягаюць працаўладкаванню, каб кампенсаваць расходы дзяржавы на ўтрыманне іх дзяцей.

Практыка паказала абгрунтаванасць устаноўленых Дэкрэтам падыходаў да працы з катэгорыямі сацыяльна небяспечных сем'яў. У краіне створаны адносіны нецярпімасці да асоб, якія кінулі сваіх дзяцей. На прафілактычны ўлік узяты праблемныя сем'і. Павысілася зладжанасць у рабоце ўпаўнаважаных дзяржаўных органаў. Намецілася тэндэнцыя да вяртання дзяцей у сем'і пасля прафілактычных мерапрыемстваў з бацькамі.

Разам з тым распараджэннем прэм'ер-міністра Беларусі створана міжведамасная рабочая група для арганізацыі пастаяннага маніторынгу сітуацыі па выкананні Дэкрэта на месцах. Яе задача — адсочваць праблемныя моманты, забяспечваць прыняцце мер па ліквідацыі выяўленых недахопаў і ўдасканаленні механізма абароны правоў і законных інтарэсаў дзяцей у праблемных сем'ях.

Суб'ектыўнасць крытэрыяў, па якіх дзіця прызнаецца апынуўшымся ў сацыяльна небяспечным становішчы, абмяркоўваецца зацікаўленымі дзяржаўнымі органамі. Яны лічаць неабходным выпрацаваць больш дакладныя паказчыкі, якія сведчылі б пра небяспечнае для жыцця і здароўя непаўналетняга становішча. Канкрэтызацыя дазволіць па меншай меры знізіць суб'ектыўнасць у гэтым пытанні.

Таксама абмяркоўваецца неабходнасць распрацоўкі на ўзроўні ўрада комплекснага нарматыўнага прававога акта, які б ахопліваў усе асноўныя моманты працы з дзецьмі, што апынуліся ў сацыяльна небяспечным становішчы, каб ліквідаваць прычыны і ўмовы, якія прывялі да гэтага.

Запісала Ірына СІДАРОК.
sidarok@zviazda.by

Шаноўныя чытачы, калі ў вас узніклі пытанні юрыдычнага характару, дасылайце іх на наш паштовы або электронны адрас. У «Прававой гасцёўні» разам са спецыялістамі Мінюста мы будзем шукаць на іх адказы

■

ФАКТЫ ПАДЗЕІ НАВІНЫ ФАКТЫ ПАДЗЕІ НАВІНЫ

БАСЕЙН ЯК АЛЬТЭРНАТЫВА ПРЫПЯЦІ

У Жыткавічах пасля доўгага перапынку зноў пачаў працаваць крыты басейн. Цяпер ён цалкам мадэрнізаваны. Яго капітальны рамонт праводзіўся з 2012 года за кошт абласнога бюджэту ў адпаведнасці з Дзяржаўнай праграмай сацыяльна-эканамічнага развіцця і комплекснага выкарыстання прыродных рэсурсаў Прыпяцкага Палесся на 2010—2015 гады. Для горада, дзе жыве 16,5 тысячы чалавек, увядзенне такога сучаснага спартыўнага аб'екта — падзея знакавая.

Як паведамілі ва ўпраўленні спорту і турызму Гомельскага аблвыканкама, адзіны ў Жыткавічах басейн мае дзве чашы. Адна памерам 10 на 6 м — для навучання плаванню, а другая — 25 на 11 м — для навучальна-трэніровачнага працэсу і аказання платных паслуг насельніцтву. Ёсць трэнажорная зала, зала сухога плавання, адміністрацыйна-бытавыя памяшканні. У спартыўным комплексе адначасова змогуць займацца 60 чалавек.

Спартыўны аб'ект знаходзіцца ў буйным жылым мікрараёне Азёрны раённага цэнтра. Цяпер у ім будуць займацца не толькі навучэнцы дзіцяча-юнацкай спартыўнай школы, але і мясцовыя жыхары. На суму ў Br23,4 млрд была закуплена і ўсталявана новая сістэма хімічнай водападрыхтоўкі, пераабсталявана ў адпаведнасці з сучаснымі патрабаваннямі сістэма вентыляцыі, праведзена тэрмарэнавацыя вонкавых сцен, выкананы капітальны рамонт усіх памяшканняў, закуплены новыя трэнажоры, добраўпарадкавана тэрыторыя вакол будынка.

Ірына АСТАШКЕВІЧ. *iost@zviazda.by*

ПАРУШАЛЬНІКАМ БЫЎ... ВЕТУРАЧ

Браканьер, затрыманы з тушай дзіка ў Клецкім раёне, як высветлілася, працуе ветэрынарным урачом.

— Каму, як не гэтаму спецыялісту ведаць, што нават у выпадку законнай здабычы такой жывёлы, яе туша павінна быць утылізаваная ў спецыяльна адведзеным месцы. Гэта прадпісвае асаблівы рэжым, уведзены для прафілактыкі АЧС у Беларусі, — расказала прэс-сакратар Дзяржаўнай інспекцыі аховы жывёльнага і расліннага свету пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь Вольга Грамовіч. — Тым не менш, узяўшы з сабой таварыша, ветэрынар накіраваўся на незаконнае паляванне. Абодва мужчыны са стрэльбамі на тэрыторыі Клецкага лясгаса падстрэлілі сяголетка. Паляўнічых-нелегалаў затрымала рэйдавая група Нясвіжскай міжрайінспекцыі. Зараз кожнаму з парушальнікаў пагражае канфіскацыя зброі з немалым штрафам — да 21 мільёна рублёў.

Сяргей РАСОЛЬКА. *rs@zviazda.by*

КІРАВАННЕ НА АНГЛІЙСКАЙ

У Беларускім дзяржаўным універсітэце адкрылася двухгадовая англамоўная магістратура па спецыяльнасці «Кіраванне ў рэальным сектары эканомікі». Вучэбная праграма распрацавана БДУ сумесна з універсітэтам прыкладных навук горада Мітвайда (Германія), таму пасля паспяховай абароны магістарскай работы выпускнікі змогуць атрымаць беларускі і нямецкі дыпломы.

Вучэбная праграма і прадугледжвае навучанне на англійскай мове па эканамічных, тэхнічных і прыродазнаўчанавуковых дысцыплінах. Дзякуючы шматпрофільнасці падрыхтоўкі выпускнікі будуць запатрабаваныя на нацыянальным і міжнародным рынку працы ў галіне менеджменту, кантролінгу, маркетынгу, лагістыкі, праектнага менеджменту і менеджменту якасці, фінансавага аналізу і ўліку, тэхнічнай падтрымкі і абслугоўвання.

Навучанне ў магістратуры ўключае семестр вучобы ў Германіі.

Паступіць у магістратуру могуць асобы, якія атрымалі вышэйшую адукацыю I ступені. Залічэнне праходзіць па выніках здачы ўступных экзаменаў па асновах менеджменту, эканамічнай тэорыі і гутаркі па англійскай мове.

Надзея НІКАЛАЕВА.
nikalaeva@zviazda.by

Наш культурны асяродак
ЖЫРАНДОЛЯ
Выпуск № 7 (307)

■ Спадчына

Скарыну прысвячаецца

500-годдзе беларускага кнігадрукавання наша краіна адзначыць налета. Але ўжо зараз рэалізоўваюцца адметныя праекты, прысвечаныя асобе і спадчыне першадрукара Францыска Скарыны. Прадстаўлены праект Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі — серыя ілюстраваных выданняў «Мастацкая Скарыніяна».

Як распавёў **намеснік дырэктара па навуковай рабоце Нацыянальнай бібліятэкі Алесь СУША**, за апошнія сто гадоў Скарына стаў сапраўды велічнай постаццю, яго вобраз увасоблены ў творах жывапісу і скульптуры, кніжнай графікі і літаратуры. У гэтых работах Скарына паўстаў як сапраўдны геній. І дзякуючы мастакоўскаму падыходу, фактычна ўварванню асобы першадрукара ў культурную прастору краіны, мы пабачылі гэтую постаць.

Рыхтуючыся да 500-годдзя беларускага кнігадрукавання, Нацыянальная бібліятэка Беларусі распачала вялікую працу па зборы і ўліку ўсіх мастацкіх работ, прысвечаных Скарыну. Іх ужо сотні. Было вырашана не хаваць увесь гэты скарб ад публікі і распачаць кніжную серыю «Мастацкая Скарыніяна». Першымі ластаўкамі праекта сталі камплекты рэпрадукцый, прысвечаныя спадчыне асобных мастакоў.

Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

Так, ужо прэзентаваныя альбомы рэпрадукцый работ Язэпа Драздовіча, які адным з першых увасобіў вобраз Скарыны яшчэ ў 1910 годзе, і Мікалая Байрачнага — сучаснага беларускага мастака, які ілюстраваў першае выданне кнігі Анатоля Клышкі «Францыск Скарына, або Як да нас прыйшла кніга». Наперадзе — мноства новых кніг Скарыніяны, дзе будуць сабраныя рэпрадукцыі работ класікаў і сучаснікаў.

Марына ВЕСЯЛУХА.
vesialuha@zviazda.by

■ Фестывалі

ПРА ШТО КРЫЧЫЦЬ ЦЕЛА

Адзін з найлепшых перформансаў свету прывязуць на «Пластформу» з Данii

Прынамсі, пастаноўка «Сцігма» «Aben Dans Production» патрапіла ў лік дзесяці найлепшых перформансаў паводле версіі газеты New York Times у 2003 годзе. І ўсё яшчэ не страціла цікавасці. Аўтар загадкавых рухаў і іх жа выканаўца Кіт Джонс, але асаблівую ролю тут іграюць музыка (Стурэ Эрыксан, Якаб К'еркегор) і святло (ад Могенса Кэмпфа). Такім чынам, у нядзелю, на закрыцці фестывалю ў Нацыянальным цэнтры сучасных мастацтваў можна завяршыць далучэнне да таямніц мастацтва пад назвай пластычны тэатр.

Яно таго вартае, таму што толькі тут і толькі цяпер, і невядома, калі яшчэ. Акрамя гасцей з Данii чакаюцца яшчэ і тры пастаноўкі ад польскіх майстроў пластычнага тэатра. Адзін з іх — «Для тых, хто пражывае» (аўтар Хігін Дзелімат) — для нас, значыць, якія ў шматкватэрных дамах не адчуваюць, што зусім побач людзі. Самотны творца — яшчэ адна цікавая тэма. Асабліва таму, што аўтары пастаноўкі «Ніжынскі. Свята сноў» («Праект абраду мары» Art Stations Foundation) інтэрпрэтавалі гісторыю вялікага расійскага танцоўшчыка класічнага балета. Увасобіў яго на мове сучаснага танца Томаш Выгада (ён жа адзін з харэографаў), прычым пад музыку з «Вясны свяшчэннай» Стравінскага. Наогул, гісторыя людзей — іх таямнічасць — тое, што выдатна кладзецца на мову пластыкі. Нават кіно, якое ствараюць людзі. Пераканаць у гэтым паспрабуе яшчэ адна пастаноўка «Смерць 24 кадры за секунду, ці зрабі мне так, як у сапраўдным фільме» (Агата Сінярска, студыя Slodownia, Познань).

Прадстаўніцтва польскіх пластычных праектаў на фестывалі сёлета вельмі магутнае. І калі вы толькі спахапіліся, яшчэ сёння можна далучыцца да кола тых, хто спрабуе ў гэтыя дні знайсці адказ на пытанне: чаму ж пластычны тэатр — асабліва мастацтва? Не танец, не балет. Але ён можа прадставіць драму — і словы не патрэбныя. Ці візуалізаваць філасофскія тэмы. На пляцоўцы Рэспубліканскага тэатра беларускай драматургіі сёння — вечар перформансаў з удзелам гасцей з Польшчы. Януш Орлік (аўтар ідэі і выканаўца) у праекце «У полі зроку» прадстаўляе ўнутраны свет чалавека, які супрацьстаіць знешняму. Артысты з праекта Мацея Кузьмінскага «Пакой 40» наогул цікавяцца экзістэнцыяльнымі тэмамі.

У Нацыянальным цэнтры сучасных мастацтваў у гэты вечар разважаем на тэмы веры — розныя яе аспекты ў перформансе «Райская аблава» (Люблінскага тэатра танца), як гэта адчулі харэографы з Эстоніі і Нарвегіі, што працавалі ў дуэце, — Кюлі Росна і Кэнэт Флак. І нават тэма гвалту над чалавечай асобай можа быць перакладзена на мову рухаў: «Акты» Аўроры Любас створаны паводле рэальных гісторый людзей, з якімі аўтар працавала ў цэнтрах падтрымкі ахвяраў хатняга гвалту. Гэта адзіная пляцоўка сёння, дзе яшчэ можна ўбачыць пластычную творчасць нашага суайчынніка Міхаіла Камінскага і яго «Імправізацыю без сакрэтаў». Выступленні беларускіх пластычных тэатраў на фестывалі прайшлі раней. Хто не паспеў — той не спазніўся хіба што шукаць іх паказы не ў фестывальным, а ў звычайным рэжыме. Вось толькі асаблівасць: у іх ён таксама вельмі пластычны...

Ларыса ЦІМОШЫК. *tsimoshyk@zviazda.by*

■ Кінакрокі

ГАРАЖ ЯК МІКРАМАДЭЛЬ ЖЫЦЦЯ

Мы можам па-добраму смяяцца з саміх сябе

Беларуская ва ўсіх сэнсах гэтага слова карціна «ГараШ», дзе сцэнарыстам і рэжысёрам выступіў Андрэй Курэйчык, падкупляе ў першую чаргу сваёй гучнасцю. Гісторыя яе стварэння, абмеркаванне і адносны поспех у пракаце ідуць наперадзе самога твора. Пра фільм, заяўлены як трагікамедыя, мы ведаем ад самага пачатку працы над ім. Памятаем пра беспаспяховую спробу знайсці сродкі на здымкі з дапамогай краўдфандынгу. Пра рашэнне ўкласці ў праект уласныя грошы (у выніку бюджэт фільма склаў каля пяці тысяч долараў). Пра выкананне роляў рок-музыкантамі гурта Neuro Dubel Аляксандрам Кулінковічам і Юрыем Навумавым. Пра поўныя залы падчас паказу фільма ў рамках Нацыянальнага конкурсу кінафестывалю «Лістапад». Пра тое, што 11 лютага карціна выйшла ў рэспубліканскі пракат і хутка тройчы акупілася (гэта яшчэ не канец — «ГараШ» будзе ісці ў пракаце да 24-га). Але наступае момант, і доўжыцца ён гадзіну, калі нам прыходзіцца бачыць і ацэньваць сам фільм.

«ГараШ» мае прэтэнзію на беларускасць, праўда, на адлюстраванне не метафізічных катэгорый кшталту «беларускай душы», а цалкам зразумелых і відавочных — сістэмы і грамадства. Таму невыпадкова і цалкам лагічна, што сюжэт адштурхоўваецца ад ненавязлівага параўнання жыцця нашай краіны з пэўным абсалютам, што мільгае ў беларускіх стэрэатыпах, з ЗША. Віталя Барзова, ураджэнца Астраўца, дэпартавалі са Злучаных Штатаў, дзе ён жыў са сваімі сябрамі, працаваў у крутым аўтасэрвісе і фарміраваў свае «амерыканскую мару» і сістэму каштоўнасцяў. Вымушаны вярнуцца на радзіму, малады чалавек вырашае не ехаць у родны горад, а застацца жыць у сваёй бабулі ў Мінску. У пошуках працы, ды яшчэ і без пашпарта, які сам парваў, Віталь трапляе на свой апошні варыянт — аўтамайстэрню «Гараж» у Шабанах. Тут на працу яго бяруць два механікі ў выкананні Аляксандра Кулінковіча і Юрыя Навумава. Ролю Віталя сыграў акцёр Рэспубліканскага тэатра беларускай драматургіі Арцём Курэнь.

Хлопец са сфарміраваным за пяць гадоў жыцця ў Сэнт-Луісе мысленнем амерыканца трапляе ў абставіны, закліканыя на кантрасце адлюстраваць прынцыпы, асаблівасці і колеры жыцця ў Беларусі. Таму, напэўна, брудная аўтамайстэрня (затое з партрэтам Сяргея Ясеніна на паліцы) становіцца месцам дзеяння — яна выгадна для драматургіі фільма дысануе з нашымі глянцавымі адрэтушаванымі ўяўленнямі пра Злучаныя Штаты. Нарэшце шматгадовая дзейнасць Галівуда, які гэтыя карціны з зайздросным пастаянствам пастаўляў нашаму гледачу, чым дазволіў яму кампетэнтна разважаць пра заморскае жыццё, спатрэбілася для справы.

Андрэй Курэйчык, як сцэнарыст, не паглыбляецца ў складаныя катэгорыі і працуе з павярхоўнай, часам рэальнай, а калі трэба — стэрэатыпнай інфармацыяй, якая не прэтэндуе на дакладнасць. Праўда, гэта не робіць павярхоўным сам фільм. Многае з выкарыстаных стэрэатыпаў можна паставіць пад сумнеў, але тым не менш жарты з экрана лёгка счытваюцца і эмацыйна ўспрымаюцца беларускім гледачом. Злучаныя Штаты тут дарэчы. На іх месцы без страт магла б аказацца, напрыклад, Еўропа, замяніць толькі «амерыканскую мару» на «еўрапейскія каштоўнасці».

Значыць, на адным баку вобраз быццам ідэальнай і правільнай амерыканскай краіны, а з другога — ужо візуалізаваны «Гараж» у самым, як кажуць, крымінагенным раёне сталіцы (крымінальнасць якога, дарэчы, таксама можна паставіць пад сумнеў) з тыповай забудовай «постсаўка».

На фонавым супрацьпастаўленні прасторы адбываецца развіццё альбо перавыхаванне галоўнага героя Віталя, які лічыць, што рукі ў яго растуць адкуль трэба. Спачатку можа падацца (і на гэта штурхае мысленне шаблонамі кіно), што малады і саманадзейны чалавек вярнуўся ў краіну і з'явіўся ў новай для сябе сістэме, каб змяніць яе. У любым выпадку зачын прадугледжваў два шляхі развіцця сюжэта і даволі сімвалічна, што фільм пайшоў па другім сцэнарыі — не Віталь Барзоў прынёс новае дыханне ў аўтамайстэрню, а яна (і мужчыны, што тут працуюць) навучыла яго новаму жыццю.

Кірунак гэты стаў канчаткова зразумелы, калі «амерыканец» не змог выканаць тэставае заданне без спецыяльных прылад, а сапраўдны беларускі аўтамеханік вырашыў пытанне сурова, груба, нядбайна і, галоўнае, хутка і танна.

Прыемна, што на вялікім экране ў беларускім пракаце можна паглядзець фільм, у якім іранічна, яскрава і шчыльна, амаль адзін на адным, сабраны нюансы беларускага жыцця. Кожны з іх мы ведаем, разумеем, можам агучыць падчас кухонных размоў, але ўсё ж такі ў фільме фразы кшталту «У нас казіно больш, чым паліклінік», «Два дэманы — пажарнік і санэпідэмстанцыя», «Па законах працаваць нельга і не працаваць па законе нельга» рэпрэзентуюць нашу рэальнасць і аб'ядноўваюцца ў агульны вобраз. Сугучна з якім «генетычна» Беларусь, на шчасце, — не Злучаныя Штаты і не Расія, і Еўропай з'яўляецца толькі па геаграфічных параметрах. «ГараШ» мне бачыцца якраз спробай паказаць, што наша краіна — унікальная. Са сваімі, зразумела, казусамі і кур'ёзамі, але яны выклікаюць у нас замілаваную ўсмешку — чайны грыб з гарэлкай, продаж калгаснай саляркі (неразведзенай), вакальны конкурс «Люблю Беларусь» са старшынёй зорнага журы Аляксандрам С... (голас дыктара па радыё перарываецца).

Які б узровень іроніі ці сарказму ні счытваўся з экрана, фільм усё роўна падыходзіць да вобраза краіны з жыццесцвярджальнай любоўю. Невыпадковы для гэтай канвы эпізод з другарадным персанажам, што любуецца ўрбаністычным пейзажам Шабаноў: «14 мільярдаў гадоў сусвет развіваўся дзеля гэтага». Іронія, так, але і неад'емная да гэтага эклектычнага вобраза краіны прыхільнасць (ці нават адданасць). Мы маем права з пэўных выключных беларускіх з'яў кпіць і маем права з гэтага па-добраму смяяцца.

Нельга не адзначыць феерычнае «іграючае» з'яўленне Эвеліны Сакуры ў ролі супрацоўніцы «собеса», якая падпрацоўвае стрыптызёршай і называе Серабранку прыстойным раёнам. Той яшчэ вобраз, той яшчэ кантраст (толькі ўжо унутры адной сістэмы) і той яшчэ жарт.

Большасць жа рэчаў, што характарызуюць рэальнасць, была выказана ў маналогах персанажа Аляксандра Кулінковіча. Сцэнарыст увогуле захапіўся слоўнымі формамі і стратэгіяй у дзеянні, дынаміцы, жывасці. Затое беларуская кінематаграфія можа пахваліцца такой «блізкай» сучаснасці карцінай, напэўна, упершыню. Праект і прадугледжваўся злабадзённым і актуальным (я ўжо не кажу пра імкненне прадэманстраваць, што вартыя адзінкі беларускага кіно могуць здымацца без вялікага бюджэту і дзяржаўнай дапамогі). Гэтым ён і бярэ — поспех у беларускага гледача тлумачыцца простымі законамі поспеху ў цэлым — сенсацыйнасцю, блізкасцю ў часе і блізкасцю геаграфічнай. Першае забяспечвае сам Андрэй Курэйчык — так дарэчы ён валодае талентам стварэння шуму. Але і без гэтага, трэба прызнаць, «ГараШ» не можа не прыцягнуць увагу.

На фільм варта глядзець не патрабавальнымі, не прыдзірлівымі да рэжысуры вачыма. Галоўнае — ён паказвае нашу краіну з гумарам, трапнасцю і любоўю. Спроба адлюстраваць вобраз Беларусі вымушае працягнуць гэтую тэму і не толькі дапоўніць яе лакальнымі заўвагамі, але і абагульніць гэта ўсё ў суцэльную карціну. Пачатак ёсць.

Ірэна КАЦЯЛОВІЧ.
katsyalovich@zviazda.by

АБРАННІК НАРОДНАЙ ПЕСНІ

МІХАСЮ ДРЫНЕЎСКАМУ — 75!

З Міхасём Паўлавічам Дрынеўскім, мастацкім кіраўніком Нацыянальнага акадэмічнага народнага хору Рэспублікі Беларусь імя Генадзя Цітовіча, мы знаёмыя даўно, ужо больш за трыццаць гадоў. Знаёмыя блізка, на «ты». А вось бачымся рэдка, два-тры разы на год. Ды і то часцей за ўсё на розных афіцыйных мерапрыемствах, канцэртах, пасяджэннях журы. Затое сустрэчы гэтыя заўсёды шчырыя, сардэчныя. Міхась Паўлавіч — чалавек дасціпны, вясёлы, сонечны. За якія дзесяць-пятнаццаць хвілін паспее і пра тваё жыццё распытацца, і важнымі навінамі падзяліцца, і анекдот смешны расказаць. І доўга яшчэ не сыходзіць з тваіх вуснаў усмешка, а душа напоўнена гаючым святлом.

Фота Юрыя ІВАНОВА.

Даў жа Бог чалавеку талент — іскрысты, мудры, шчодры! Яго хапае на ўсё: на творчасць, на грамадскую работу, на сяброў і проста знаёмых, якім трэба нешта падказаць, нечым дапамагчы.

Міхась Дрынеўскі — адзін з тых рупліўцаў-падзвіжнікаў, хто кожны свой дзень прысвячае святой і высакароднай справе — захаванню, развіццю і ўзбагачэнню беларускай народнай песні. Сваю прафесіянальную місію ён разумее так:

— Песня — не толькі своеасаблівы музычны летапіс эпохі. Яна, і гэта вельмі важна, яшчэ і магутнейшы інструмент фарміравання грамадскай свядомасці, пабудовы сістэмы маральных каштоўнасцяў і жыццёвых арыенціраў. Таму няма больш пачэснай справы, як несці народу ягоную ж песенную, музычную і танцавальную спадчыну, радаваць людзей родным беларускім словам, песняй, музыкай.

Нястомная, плённая праца Міхася Дрынеўскага дастойна ўганаравана краінай. Ён — народны артыст Беларусі, заслужаны дзеяч мастацтваў, прафесар, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі БССР, лаўрэат прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «За духоўнае адраджэнне», кавалер ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга і ордэна Францыска Скарыны, ганаровы акадэмік Міжнароднай кадравай акадэміі.

ПЫТАЮСЯ ў Міхася Паўлавіча, ад чаго залежыць поспех, папулярнасць калектыву.

— Канешне ж, найперш ад складу, ад спевакоў, — адказвае Маэстра. — Артыст хору павінен валодаць многімі якасцямі. У першую чаргу — добрым голасам. Важны таксама тэмбр. Бывае голас моцны, але занадта рэзкі, непрыемны, ён не зліваецца з іншымі. Такі для хору, зразумела, не падыходзіць. А яшчэ трэба быць музыкантам, адчуваць інтанацыю слова. Музыкальнасць, эмацыянальнасць — далёка не апошнія рэчы ў нашай справе. А яшчэ неабходна разумець сэнс таго, пра што ты спяваеш. Ствараць вобраз, настрой. У песні кожнае слова мае значэнне. Умець вылучыць галоўнае, зрабіць на гэтым акцэнт. Прычым не абавязкова гучна, можна і шэптам.

Безумоўна, для харыста немалаважныя таксама чалавечыя якасці. Грубы, ганарысты, фанабэрысты чалавек не ўжывецца ў хоры. Ён перашкаджае не толькі дырыжору, а і ўсяму калектыву. З-за гэтага даводзіцца з некаторымі развітвацца.

Што тычыцца ідэйных якасцяў, то кіраўніка хору мала цікавіць палітычныя погляды чалавека. Галоўнае, каб любіў свой край, свой народ, родную культуру, мову. Без гэтага таксама сапраўднага артыста не атрымаецца.

Яшчэ больш высокія патрабаванні да саліста. Бо гэта артыст вышэйшай катэгорыі. Дарэчы, колькасць салістаў у хоры — велічыня не пастаянная. Усё залежыць ад рэпертуару. Ад голасу, яго сілы, спецыфікі, дыяпазону. Адна салістка гэты твор можа праспяваць выдатна, а другая яго не спяе ніколі. Адна разумее народную песню душою, а другая будзе спяваць нібыта і правільна, па нотах, але душы ў гэтым выкананні не адчуваецца. І да сэрца слухача такая песня не дойдзе.

Кажучы гэта, Міхась Паўлавіч падкрэслівае: саліст — тавар даволі рэдкі. Іх многа ніколі не бывае. Дзякаваць Богу, у хоры ва ўсе часы былі сапраўдныя зоркі. Ёсць яны, на шчасце, і цяпер. Найперш можна назваць Валянціну Крыловіч. Залаты голас, спявачка ад Бога, народная артыстка Беларусі. Нядаўна атрымала ордэн Францыска Скарыны. З вялікай удзячнасцю Маэстра гаворыць пра таленавітых спевакоў, заслужаных артыстаў рэспублікі Васіля Браіма і Уладзіміра Будая. Усё большую вядомасць і папулярнасць набіраюць салісты, лаўрэаты рэспубліканскага конкурсу беларускай песні Рыната Мацвеенка, Наталля Гарнастаева, Іван Вярбіла і іншыя.

Цікава, што артысты хору раней былі ў асноўным выхадцамі з вёскі. Цяпер, як жартуе Міхась Паўлавіч, ёсць і «асфальтныя». Асабліва моладзь, якая прыходзіць. Яна сугуба гарадская. Безумоўна, ім цяжэй пранікаць у сутнасць народнай песні. Але на тое і мастацкі кіраўнік, каб дапамагаць і накіроўваць іх развіццё ў патрэбны бок. Каб яны душою спасцігалі ўсё багацце музычнага фальклору і маглі перадаць інтанацыйна, драматургічна так, як гэтага патрабуе дырыжор.

ЖАРТАМ пытаюся ў Дрынеўскага:

— Дык што ж гэта за такая загадкавая, таямнічая прафесія — стаяць да гледачоў спінаю і махаць рукамі?

— Во, во, — весела адгукаецца Міхась Паўлавіч, — брат мой таксама смяецца: ну й работа, кажа, у цябе — галоўнае, каб не заснуць.

— Гэта, вядома, жарт, — пасмяяўшыся, кажа Маэстра. — А калі сур'ёзна, то дырыжор таксама павінен валодаць некаторымі якасцямі.

Перш за ўсё — мець добры слых. Не абавязкова абсалютны. У Дрынеўскага, напрыклад, тэмбральны слых, і гэта можа нават важней, чым абсалютны. Далей. Трэба быць педагогам, псіхолагам. А яшчэ — любіць сваіх харыстаў, дапамагаць ім.

Раней, пры савецкай уладзе, народны хор з гастролямі пабываў у многіх краінах. Пасля, калі пачалася перабудова, калектыў амаль не выязджаў. А якая сітуацыя цяпер? На гэтае пытанне кіраўнік хору адказвае па-філасофску:

— Каб сказаць, што дрэнна — не магу, але і сказаць, што нас вельмі і вельмі запрашаюць, таксама не магу. Хоць наша мастацтва людзям вельмі падабаецца. Заўсёды пасля канцэрта гледачы доўга не разыходзяцца. Ад нашых спеваў на душы лягчэй і святлей робіцца. Народу гэта патрэбна, — працягвае Міхась Паўлавіч. — І шкада, што такія сустрэчы сапраўды рэдкія. Але гэта ўжо пытанне не да нас. Але, здаецца, апошнім часам сітуацыя змяняецца да лепшага.

АЦЯПЕР давайце пракладзём масток з дня сённяшняга ў дзяцінства Міхася Дрынеўскага, на яго малую радзіму. Нарадзіўся будучы Маэстра ў вёсцы Тонеж сёння Лельчыцкага, а тады Тураўскага раёна. Гэта самая глыбінка Прыпяцкага Палесся. Харастваприроды — неапісальнае! Але ў часы Міхасёвага маленства, ды і юнацтва таксама, гэты салаўіны край быў не толькі глыбінным, але і глухім, далёкім ад выгодаў цывілізацыі. Хлопец рос, не ведаючы ні радыё, ні тэлебачання. А кніжкі даводзілася чытаць часцей за ўсё пры лучыне. Але пры гэтым была адна вельмі важная перавага: людзі былі не пасіўнымі спажыўцамі культуры, а актыўнымі творцамі. З больш чым пяцісот тонежскіх двароў не было, бадай, ніводнага, дзе б хто-небудзь не ўдзельнічаў у мастацкай самадзейнасці.

БАЦЬКІ Міхася Дрынеўскага таксама любілі спяваць. Бацька нават спяваў добра. Асабліва да жаніцьбы, хлопцам. Сябра яго, Паша Вянгура, падводзіў, а ён басаваў. Пасля ўжо, калі ажаніўся, з'явілася сям'я, вельмі любіў наладжваць музычныя вечары. З вайны бацька прывёз губны гармонік, дык вось пад гэты гармонік хлопцы (а ў сям'і іх было пяцёра) і спявалі, і танцавалі. Найлепшаму танцору бацька даваў прэмію — дваццаць капеек, а часам нават і рубель.

Іграў звычайна старэйшы брат Дзіма. Бацька давяраў каштоўны інструмент толькі яму, больш нікому не даваў. Пасля ўжо, калі за сталярку прыдбаў невялічкі акардэончык, Дзіма стаў іграць на ім, а Міхасю дастаўся губны гармонік. Праз нейкі час бацька купіў большы акардэон, а меншы перайшоў да Міхася. Іграць ён вучыўся на слых, без усялякіх нот, самавукам. Затое з надзвычайнаю ахвотай — рыпаў кожную вольную хвіліну.

Дарэчы, бацькі Міхася Паўлавіча — звычайныя сяляне. Не дужа пісьменныя. Маці наогул не чытала і не пісала, праўда, грошы лічыла выдатна. А бацька нейкія паўкласа адукацыі меў. Затое ў яго былі залатыя рукі. Умеў і бандарыць, і сталярыць. Разбіраўся ў немудрагелістай тэхніцы: мог парамантаваць швейную машынку ці дзе што зварыць.

Бацька не ўхваляў яго прафесійны выбар. Казаў: музыка мне трэба, калі я добра наемся ды вазьму чарку, але гэта не часта бывае. Словам, прафесію музыканта, як і любы вясковы чалавек, ён лічыў несур'ёзнай.

І ўсё ж Міхась паступіў у Гомельскае музычнае вучылішча і паспяхова яго скончыў. Харавое аддзяленне. Чаму харавое? А ён яшчэ ў школе кіраваў хорам, і нават не адным, а трыма — школьным і двума калгаснымі, з вёскі Тонеж і вёскі Букча, дзе канчаў дзесяцігодку. І кіраваў не без поспеху. Хор вёскі Тонеж на занальным аглядзе калектываў мастацкай самадзейнасці заняў першае месца. Паабяцалі: паедзеце ў Маскву на Сусветны фестываль моладзі і студэнтаў. Але паехаў іншы калектыў — знакаміты Тураўскі хор. Крыўдна было, ды што зробіш. Затое гэта стала хлопцу добрым урокам на ўсё жыццё: нішто не даецца так проста і лёгка, а пры няўдачы — ні ў якім разе не апускаць рукі.

У вучылішчы яго заўважыла Раіса Цімафееўна Красніцкая, выдатны педагог і цудоўны чалавек. З першага курса яна стала пераконваць Міхася, што яму абавязкова трэба рыхтавацца да вучобы ў кансерваторыі, і таму нагружала яго дай Бог. Часам нават калегі яе папракалі за гэта, але яна заўсёды адказвала: «Хлопец цягне — хай цягне. Хай развівае Боскую іскру».

І як жа Міхась Паўлавіч быў пасля ўдзячны ёй за гэтую «нагрузку», калі з лёгкасцю паступіў у кансерваторыю і ўсе гады без асаблівых праблем тут правучыўся. Праўда, не без дапамогі іншага выдатнага педагога, дацэнта Ганны Паўлаўны Зелянковай.

А Дрынеўскі ж не толькі вучыўся, але яшчэ і працаваў. У яго практычна не было ніводнага года «чыстай» вучобы. У вучылішчы — кіраваў хорам дрэваапрацоўчага камбіната, народным хорам вёскі Прыбыткі, на трэцім курсе нават даверылі праводзіць заняткі з завочнікамі. У кансерваторыі, першакурснікам, наш вядомы дырыжор-хормайстар Уладзімір Раговіч запрасіў Дрынеўскага папрацаваць з капэлаю Палаца культуры Мінскага трактарнага завода. Ад такой спакуслівай прапановы адмовіцца было цяжка. Дый капейка якая, па праўдзе кажучы, была не лішняя. Але ж, канешне, не капейка была на першым плане. Праца ў капэле Міхася Паўлавіча настолькі захапіла, што ён аддаў ёй усе пяць гадоў свайго і без таго напружанага кансерваторскага жыцця. Затое яму і сёння прыемна ўспомніць той шчаслівы час. Успомніць і паганарыцца, бо капэла МТЗ была прызнана найлепшай у Савецкім Саюзе!

У 1968 годзе ў філармоніі быў чарговы выпускны, справаздачны канцэрт. Міхась Дрынеўскі ў якасці дыпломнай работы дырыжыраваў складаным двухорным творам. Гэта калі два хоры спяваюць адзін і той жа твор, але ў кожнага свая партыя. Яны як бы спаборнічаюць між сабой. Для дырыжора гэта вельмі складаная задача — нідзе нічога не ўпусціць, дабіцца цэльнага, гарманічнага гучання. Дрынеўскаму, здаецца, удалося, бо адразу пасля канцэрта да яго падышоў Генадзь Цітовіч, павіншаваў і запрасіў у свой хор. Вось так пачалася яго кар'ера ў знакамітым калектыве і доўжыцца ўжо амаль пяцьдзясят гадоў.

Нагадваю Міхасю Паўлавічу, што некалі Генадзь Цітовіч назваў Гомельскае Палессе нечапаным куфрам, кладоўкай беларускай народнай песні. А Рыгор Шырма марыў дажыць да таго часу, калі народная песня, гэтая сялянчка, вырасце ў велікасвецкую даму. І пытаюся: як, на яго погляд, ці здзяйсняюцца спадзяванні нашых патрыярхаў?

— Адназначна адказаць складана, — разважае Маэстра. — У нечым мы сёння пайшлі наперад, а ў нечым — адступілі. Тое, што многае з народнага песеннага фальклору паспелі запісаць, апрацаваць — гэта добра. А кепска, што ў вёсках цяпер амаль не спяваюць. Яркія, самабытныя носьбіты старадаўніх песень пайшлі з жыцця, а моладзь, на вялікі жаль, далёка не ўсюды падхапіла ад іх бясцэнную эстафету. Дзякаваць Богу, у апошнія гады пачаў адбывацца прыкметны паварот да лепшага. Зноў стала з'яўляцца шмат калектываў мастацкай самадзейнасці — цікавых, таленавітых, дарослых і дзіцячых, гарадскіх і вясковых. А колькі прыемных адкрыццяў адбываецца падчас рэспубліканскіх фестываляў і конкурсаў!

УДРЫНЕЎСКАГА, як я ўжо казаў, шмат ганаровых званняў і высокіх узнагарод. Цікаўлюся, што было для яго самым дарагім, самым хвалюючым?

— Кажу як на духу, — прызнаецца Маэстра, — ніколі не працаваў на званне, на ўзнагароду. Працаваў, як мог, працаваў многа, упарта, настойліва, каб быў вынік, каб зрабіць справу. І ніколі не чакаў ніякіх узнагарод, а таму і не надаваў ім вялікага значэння. Адзначылі — добра, дзякуй. Гэта абавязвае працаваць яшчэ лепш.

Дзякую Міхасю Паўлавічу за гутарку, і мы развітваемся. Праз дзесяць хвілін у Маэстра рэпетыцыя. Шлях да зорак ляжыць праз церні штодзённай, напружанай, карпатлівай працы.

Зіновій ПРЫГОДЗІЧ.

ОАО «Амкодор-КЭЗ»

Витебская обл., Толочинский район, г.п. Коханово, Промышленная зона, ул. Промышленная, 3.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОЧЕРЕДНОГО ОБЩЕГО СОБРАНИЯ АКЦИОНЕРОВ ОБЩЕСТВА

Собрание состоится 25 марта 2016 г. в 14.00
по адресу: Витебская обл., Толочинский район, г.п. Коханово, Промышленная зона, ул. Промышленная, 3, зал заседаний Общества.

Орган, созывающий собрание:
Совет директоров ОАО «Амкодор-КЭЗ».

Регистрация участников собрания производится в день и по месту проведения собрания с 13.00 до 13.55.

Регистрация лиц, имеющих право на участии в собрании, осуществляется при предъявлении ими документов, подтверждающих их личность и полномочия.

При регистрации акционеры предъявляют документ, удостоверяющий личность; представители акционеров предъявляют документ, удостоверяющий личность, и подтверждают свои полномочия надлежащим образом оформленной доверенностью (руководители юридических лиц – акционеров – документом, подтверждающим статус руководителя.)

ПОВЕСТКА ДНЯ:

1. Отчет директора о работе общества за 2015 год. Утверждение показателей прогноза социально-экономического развития общества на 2016 год.
2. Утверждение годового отчета общества, годовой бухгалтерской (финансовой) отчетности общества, распределение прибыли и убытков общества по результатам 2015 года с учетом заключения Ревизионной комиссии и аудиторского заключения.
3. Избрание членов Совета директоров ОАО «Амкодор-КЭЗ».
4. Избрание членов Ревизионной комиссии ОАО «Амкодор-КЭЗ».
5. Определение размера вознаграждений членам Совета директоров, Ревизионной комиссии за исполнение ими своих обязанностей.

Лица, имеющие право на участие в собрании, имею право ознакомиться с информацией о деятельности общества за отчетный период, начиная с 4 марта 2016 года, а с иной информацией (документами), подлежащими представлению при подготовке к проведению собрания, начиная с 21 марта 2016 года ежедневно (кроме субботы и воскресенья) в отделе кадров ОАО «Амкодор-КЭЗ» (Витебская обл., Толочинский район, г.п. Коханово, Промышленная зона, ул. Промышленная, 3) с 9.00 до 16.00, а в день проведения собрания – по месту его проведения.

Совет директоров ОАО «Амкодор-КЭЗ»

УНП 300028841

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПЕРВЫХ И ПОВТОРНЫХ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

Организатор торгов: государственное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», 210015, г. Витебск, проезд Гоголя, 5, (0212) 42-61-62

Продавец: ОАО «Витебский комбинат шелковых тканей», 210002, г. Витебск, ул. М. Горького, 62, (029)896-47-55, (029) 714-50-17, alex-68.06@mail.ru

Лот №1. Капитальное строение с инв. №200/С-82204, по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Максима Горького, д. 66, корп. 1, площадью 380,7 кв.м, наименование: здание компрессорной, назначение: здание специализированное энергетики; дорога на промплощадке площадью 95 кв.м инв. №12007; забор кирпичный на кирпичных столбах протяженностью 140 м.п., высотой 3,3 м с воротами металлическими автомобильными дл. 6 м. инв.№12038; мостовой кран 5 т. инв. №142263-1. Имущество расположено на зем.участке с кадастровым №240100000003004246 площадью 0,3481 га. Нач.цена: 987 000 000 бел. руб. без НДС. Задаток: 98 700 000 бел. руб. Шаг аукциона – 49 350 000 бел. руб.

Лот №2. Капитальное строение с инв.№200/С-82203, по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Максима Горького, д. 66, площадью 813,8 кв.м, наименование: здание водохимочистки, назначение: здание специализированное иного назначения. Имущество расположено на зем.участке с кадастровым №240100000003004246 площадью 0,3481 га. Нач.цена: 1 900 000 000 бел. руб. без НДС. Задаток: 190 000 000 бел. руб. Шаг аукциона – 95 000 000 бел. руб.

Торги состоятся **23.03.2016 в 15.00** по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5, в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». Срок внесения задатков и подачи заявлений на участие в торгах: **с 22.02.2016 с 8.30 по 22.03.2016 до 17.30.** Задаток перечисляется на р/с 3012411521014 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Витебской обл., МФО 739, УНН 300082525. Получатель платежа: ОАО «Витебский комбинат шелковых тканей»

Продавец: ОАО «Витебский комбинат шелковых тканей», 210002, г. Витебск, ул. М. Горького, 62, (029)896-47-55, (029) 714-50-17, alex-68.06@mail.ru

Лот №1. Линия по производству геотекстильных материалов: Линия пропитки фирмы «Ontec», инв. №145052, 2012 г.в.э., Ткацкая машина фирмы «Dornier» (Дорнье), инв. №145050, 2012 г.в.э., Шпулярник фирмы «Texmer» инв. №145053, 2012 г.в.э. Нач.цена: 4 752 000 000 бел. руб. без НДС. Задаток: 475 200 000 бел.руб. Шаг аукциона – 237 600 000 бел. руб.

Лот №2. Грузовой фургон тентовый МАЗ 5336 А5-321, рег. знак АВ 8019-2, 2009 г.в., цвет белый. Нач. цена: 113 400 000 бел. руб. без НДС. Задаток: 11 340 000 бел. руб. Шаг аукциона – 5 670 000 бел. руб.

Лот №3. Прицеп тентовый МАЗ 837810-014, рег. знак 2449 АА-2, 2009 г.в., цвет светло-серый. Нач. цена: 39 600 000 бел. руб. без НДС. Задаток: 3 960 000 бел.руб. Шаг аукциона – 1 980 000 бел. руб.

Повторные торги состоятся **11.03.2016 в 15.00** по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5, в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». Срок внесения задатков и подачи заявлений на участие в торгах: **с 22.02.2016 с 8.30 по 10.03.2016 до 16.30.** Задаток перечисляется на р/с 3012411521014 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Витебской обл., МФО 739, УНН 300082525. Получатель платежа: ОАО «Витебский комбинат шелковых тканей». Объекты находятся по адресу: г. Витебск, ул. М. Горького, 62. Извещение о проведении аукционов опубликовано в газете «Звязда» 13.01.2016.

Заявления на участие в торгах со всеми необходимыми документами принимаются в рабочие дни с 8.30 до 17.30 по адресу: г.Витебск, проезд Гоголя, 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». Торги проводятся в соответствии с Законом Республики Беларусь от 13 июля 2012 г. № 415-З «Об экономической несостоятельности (банкротстве)». Лица, желающие участвовать в торгах, обязаны подать организатору заявление на участие в торгах с приложением документов: заверенного банком документа, подтверждающего внесение суммы задатка на расчетный счет, указанный в извещении; для индивидуального предпринимателя – копии свидетельства о гос. регистрации индивидуального предпринимателя; для юр. лица – доверенности, выданной представителю юр. лица (кроме случаев, когда юр. лицо представляет его руководитель), а также копии свидетельства о гос. регистрации юр. лица; для иностранного юр. лица, иностранной организации, не являющейся юр. лицом, созданной в соответствии с законодательством иностранных государств иностранным государством и его административно-территориальными единицами в лице уполномоченных органов, международной организации – легализованных в установленном порядке копий учредительных документов, выписки из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение 6 месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иного эквивалентного доказательства статуса юр.лица в соответствии с законодательством страны происхождения, документа о финансовой состоятельности, выданного обслуживающим банком; для представителя гражданина РБ, в том числе индивидуального предпринимателя, – доверенности, оформленной в соответствии с законодательством. При подаче документов на участие в торгах граждане РБ, иностранные граждане и лица без гражданства, а также граждане РБ, постоянно проживающие за пределами РБ, представители юр. лиц РБ, предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность. Имущество считается проданным лицу, которое предложило на торгах самую высокую цену. В случае если торги признаны несостоявшимися, предмет торгов продается единственному участнику, подавшему заявление на участие в торгах (либо явившемуся для участия в них) при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5%. Победитель торгов в день проведения торгов подписывает протокол. **Победитель торгов (претендент на покупку) обязан:** в течение 5 дней со дня проведения торгов: возместить затраты на организацию и проведение торгов, затраты по оценке имущества, изготовлению документации, необходимой для проведения торгов; в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов подписать договор купли-продажи; оплатить предмет торгов и НДС в размере 20% от цены продажи имущества в порядке и в сроки, установленные договором купли-продажи. Организатор торгов вправе отказаться от проведения торгов не позднее чем за 5 дней до даты их проведения. Ознакомление с объектами осуществляется в рабочие дни с 8.30 до 17.00. Имущество, выставляемое на торги, бывшее в употреблении. **Контактные тел.: (0212) 42-61-62, (029) 510-07-63, e-mail: vcm74@mail.ru, marketvit.by.**

О Б Ъ Я В Л Е Н И Е

24 марта 2016 года
в актовом зале Минского завода технологических металлоконструкций по адресу: г. Минск, ул. Радиальная, 13

СОСТОИТСЯ ОЧЕРЕДНОЕ (ГОДОВОЕ) ОБЩЕЕ СОБРАНИЕ АКЦИОНЕРОВ

ОАО «ПРОМТЕХМОНТАЖ»

Начало собрания в **14.00**.

Регистрация акционеров (по предъявлении документа, удостоверяющего личность; для представителя акционеров дополнительно – доверенность, заверенную в соответствии с законодательством) с **12.00** до **13.30**, согласно реестру акционеров ОАО «ПРОМТЕХМОНТАЖ» по состоянию на 1 марта 2016 года.

ПОВЕСТКА ДНЯ

1. Отчет Дирекции о финансово-хозяйственной деятельности Общества за 2015 год и утверждение показателей бизнес-плана Общества на 2016 год.
2. Отчет ревизионной комиссии за 2015 год. Заключение по годовым отчетам и балансу Общества.
3. Отчет Совета директоров за 2015 год.
4. Утверждение годовых отчетов и бухгалтерского баланса, отчета о прибылях и убытках Общества, распределения чистой прибыли Общества за 2015 год.
5. Об утверждении дивидендов за 2015 год и сроков выплаты дивидендов.
6. Утверждение направлений использования чистой прибыли на 2016 год.
7. Утверждение условий материального вознаграждения членов Совета директоров и ревизионной комиссии.
8. Выборы членов Совета директоров.
9. Выборы членов ревизионной комиссии.
10. О наделении Совета директоров Общества полномочиями, отнесенными Уставом к компетенции общего собрания акционеров.
11. Об утверждении новой редакции Устава ОАО «ПРОМТЕХМОНТАЖ».

С информацией о деятельности Общества за 2015 год можно ознакомиться с 3 марта 2016 года по 23 марта 2016 года, а с материалами собрания – с 17 марта 2016 года по 23 марта 2016 года в рабочие дни (понедельник-пятница) с 09.00 до 16.00 в Исполнительной администрации ОАО «ПРОМТЕХМОНТАЖ» по месту нахождения Общества: г. Минск, пер. Калининградский, 19А, а в день проведения собрания акционеров – по месту его проведения с 12.00 до 13.30.

Совет директоров

УНП 100185330

ОБЪЯВЛЕНИЕ о проведении публичных торгов по продаже имущества, принадлежащего ООО «Имельда»:

Вид выставленного на торги имущества	Недвижимость
Наименование (описание) имущества и его стоимость	**ЛОТ № 1. Капитальное строение с инвентарным номером 200/С-47503 – трехэтажное здание специализированное для производства текстильных, швейных и кожаных изделий, общей площадью 985,5 кв.м, начальная стоимость лота 1 683 225 080 рублей. ЛОТ № 2. Капитальное строение с инвентарным номером 200/С-47504 – одноэтажное здание специализированное для ремонта и технического обслуживания автомобилей, общей площадью 263 кв.м, начальная стоимость лота 395 082 243 рубля**
Принадлежность	ООО «Имельда»
Наличие обременений	Ипотека, залогодержатель ОАО «Белинвестбанк»
Местонахождение (адрес) имущества	Лот № 1: г. Витебск, ул. Зеленая, 28 Лот № 2: г. Витебск, ул. Зеленая, 28Б
Место (адрес), дата и время проведения торгов	Отдел принудительного исполнения Первомайского района г. Витебска, г. Витебск, ул. Горбачевского, 26, кабинет 9 3 марта 2016 года в 10.00
Справочная информация	Справочная информация об организации торгов: ГУЮ Витоблисполкома 210101, г. Витебск, ул. Б. Хмельницкого, 10/1 www.vitebskjust.gov.by. Заместитель начальника отдела Филипенко Олеся Петровна, тел.: 8(0212)37 46 38, +37533 616 17 79
Условия и порядок проведения торгов	1. Подать письменную заявку на участие в торгах и дать подписку об отсутствии препятствий для приобретения имущества, предусмотренных законодательством. 2. Внести задаток в размере 10 процентов от стоимости имущества на депозитный счет отдела принудительного исполнения Первомайского района г. Витебска № 3642903000315 в филиале № 200 ОАО «СБ «Беларусбанк», код 635, УНП 300002505 **не позднее 10.00 2 марта 2016 года.** Минимальная величина первого шага торгов – 5% стоимости лота. В соответствии с пунктом 1 Указа Президента Республики Беларусь от 05.05.2009 № 232 «О некоторых вопросах проведения аукционов (конкурсов)» возмещение затрат на организацию и проведение торгов осуществляется участником, выигравшим торги.

ОБЪЯВЛЕНИЕ О ТОРГАХ

Наименование (описание) имущества и его стоимость	**Лот № 1. Мини-экскаватор JCB EXCAVATORS LTD, 2005 г.в., стоимостью 140 000 000 бел. рублей**
Собственник (владелец) имущества	**ЧПТУП «ВитТермоСервис» (УНН 390380647)**
Местонахождение (адрес) имущества	**г. Витебск, ул. Шпилевского, 8**
Наличие обременений	**Залог ОАО «Паритетбанк»**
Место (адрес), дата и время проведения торгов	**09.03.2016 в 10.00 г. Витебск, ул. Б. Хмельницкого,10/1, каб. 1.4**
Справочная информация об организаторе торгов	Управление принудительного исполнения главного управления юстиции Витебского облисполкома 210015, г. Витебск, ул. Б. Хмельницкого,10/1. Судебный исполнитель Ильющенков Алексей Александрович, тел./факс 8(0212)614018, 8(033)6879145, начальник отдела Бураков Игорь Вячеславович, тел. 80336878807
Условия и порядок проведения торгов	Лицо, желающее принять участие в торгах, до начала торгов обязано: 1. Подать письменную заявку на участие в торгах и дать подписку об отсутствии препятствий для приобретения имущества, предусмотренных законодательством. 2. Внести задаток в размере 10 процентов от стоимости имущества (по каждому лоту) на депозитный счет главного управления юстиции Витебского облисполкома № 3642903001037 в 200 филиале ОАО «СБ Беларусбанк», МФО 635, УНП 300002505, **не позднее 15.00 19.02.2016.** Минимальная величина первого шага – 5% от первоначальной стоимости лота. В соответствии с частью 3 статьи 486 Гражданского процессуального кодекса Республики Беларусь возмещение затрат на организацию и проведение торгов осуществляется покупателем имущества.

Уважаемые акционеры

«Наблюдательный совет ОАО «БЭМЗ»

ИЗВЕЩАЕТ СВОИХ АКЦИОНЕРОВ О ПРОВЕДЕНИИ
24 марта 2016 года в 14 часов
в зале заседаний ОАО «БЭМЗ»
по адресу: г. Брест, ул. Московская, 202
ОЧЕРЕДНОГО ОБЩЕГО СОБРАНИЯ АКЦИОНЕРОВ

ПОВЕСТКА ДНЯ:

1. Отчет директора об итогах финансово-хозяйственной деятельности Общества за 2015 год. Утверждение ключевых показателей эффективности на 2016 год.
2. Отчет наблюдательного совета о проделанной работе в 2015 году.
3. О результатах аудита и проверки ревизионной комиссией финансовой и хозяйственной деятельности общества, распределение прибыли и убытков общества за 2015 год.
4. Утверждение годовой бухгалтерской отчетности за 2015 год.
5. Об утверждении распределения и использования прибыли (убытков). О выплате дивидендов за 2015 год.
6. Утверждение направлений распределения прибыли на 2016 год.
7. О внесении дополнений и изменений в Устав общества.
8. Об избрании членов наблюдательного совета, его составе и ревизионной комиссии общества.
9. Утверждение размера вознаграждения членам наблюдательного совета и ревизионной комиссии.

Регистрация участников собрания с 13 часов. Акционерам иметь при себе паспорт, представителям акционеров – паспорт и доверенность. Список акционеров для участия в собрании будет составлен по состоянию реестра на 1 марта 2016 года.

Ознакомление акционеров с информацией о деятельности общества, сведения о выдвигаемых кандидатах в избираемые органы общества, с материалами по вопросам повестки дня собрания: в рабочие дни (понедельник–пятница) начиная с 4 марта 2016 года в отделе кадров ОАО «БЭМЗ», 24 марта – по месту проведения собрания.

Справки по телефону: 42-75-43.

УНП 200032892

ОАО «Стройдетали»

извещает о проведении 24 марта 2016 года очередного общего собрания акционеров общества по адресу: г. Вилейка, ул. Стахановская, 134, помещение столовой.

Повестка дня:

1. Итоги финансово-хозяйственной деятельности общества за 2015 год и основные направления развития в 2016 году.
2. Утверждение годового отчета, бухгалтерской отчетности и направлений использования чистой прибыли за 2015 год.
3. Утверждение акта аудиторской проверки деятельности общества за 2015 год.
4. Утверждение акта ревизионной комиссии по результатам проверки деятельности общества за 2015 год.
5. Утверждение размера дивидендов за 2015 год и сроков выплаты дивидендов.
6. Избрание членов наблюдательного совета и ревизионной комиссии.
7. Утверждение размеров вознаграждения членам наблюдательного совета и ревизионной комиссии.

Списки акционеров на участие в собрании — по состоянию реестра на 17 марта 2016 года.

Начало собрания **в 16.00.** Время регистрации: **15.00—15.50.**

Для регистрации акционерам иметь при себе паспорт.

Представителям акционеров — паспорт и доверенность.

С информацией о деятельности общества можно ознакомиться в отделе экономики начиная **с 4 марта 2016 года.**

Справки по тел.: **(8-01771) 2-25-01, 2-25-10.**

УНП 600246748

03 марта 2016 года в 11.00
состоится внеочередное общее собрание акционеров ОАО «Брестская трикотажная фирма «Элма»

Повестка дня:

1. О сделках Общества.

Местонахождение ОАО: г. Брест, ул. Куйбышева, 13.

Место проведения собрания: г. Брест, ул. Куйбышева, 13 (кабинет директора).

С материалами, подготовленными к собранию, можно ознакомиться по адресу: г. Брест, ул. Куйбышева, 13 с 25 февраля 2016 года по 02 марта 2016 года с 9.00 до 16.00 либо 3 марта 2016 года по месту проведения собрания.

Начало регистрации участников собрания: 10.30.

Список акционеров для участия в собрании будет составлен по состоянию реестра на 24 февраля 2016 года.

При себе необходимо иметь документ, удостоверяющий личность (для представителя акционера – доверенность).

Совет директоров.

УНП 200295587

Утерянная квитанция о приеме наличных денежных средств (страховых взносов) страховой компании ЗАСО «Промтрансинвест» формы 1-СУ серии СВ №0170722 **считать недействительной.**

Свидетельство о государственной регистрации индивидуального предпринимателя ДМИТРИЕВОЙ Галины Петровны (УНП 101498151) **считать недействительным в связи с утерей.**

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ 23 марта 2016 года ТОРГОВ С УСЛОВИЯМИ ПО ПРОДАЖЕ КВАРТИР, принадлежащих ОАО «Минский домостроительный комбинат»

Сведения о предмете торгов (продаваемом имуществе)			
№	Наименование, характеристики и местонахождение продаваемого имущества	Начальная цена, бел. руб.	Размер задатка, бел. руб.
1.	Квартира № 3 по адресу: г. Минск, ул. Скрипникова, 44-3 (трехкомнатная, 1-й этаж, общая площадь – 72,2 кв. м)	1 045 432 000	104 000 000
2.	Квартира № 6 по адресу: г. Минск, ул. Академика Карского, 27-6 (трехкомнатная, 1-й этаж, общая площадь – 76,2 кв. м)	1 267 580 000	120 000 000
3.	Квартира № 104 по адресу: г. Минск, ул. Академика Карского, 27-104 (трехкомнатная, 15-й этаж, общая площадь – 75,1 кв. м)	1 323 739 000	130 000 000

Продавец имущества: ОАО «Минский домостроительный комбинат», ул. Пономаренко, 43, 220015, г. Минск.

Организатор торгов: коммунальное унитарное предприятие «Минский городской центр недвижимости», ул. К. Маркса, 39, к. 10, 220030, г. Минск.

Условие торгов: победитель торгов (покупатель) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 2 процентов от цены продажи предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торгов, в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов.

Торги проводятся в соответствии со ст.ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «Минский домостроительный комбинат», утвержденным организатором торгов.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, внесшие задаток и заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона по соответствующему предмету торгов, а также представившие организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка; документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Задаток (задатки) перечисляется на расчетный счет коммунального унитарного предприятия «Минский городской центр недвижимости» № 3012104971019 в региональной дирекции №700 ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, код 153001369, УНП 190398583 в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе.

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

В случае, если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (покупателю) при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) заключается в течение 10 рабочих дней со дня проведения торгов после предъявления копии платежных документов о перечислении вознаграждения за организацию и проведение торгов.

Оплата стоимости приобретенного имущества осуществляется победителем торгов (покупателем) в течение 30 календарных дней со дня заключения договора купли-продажи.

Расходы, связанные с государственной регистрацией договора купли-продажи и основанного на нем перехода права собственности, оплачиваются победителем торгов (покупателем).

Торги проводятся **23 марта 2016 года в 11.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются **с 22.02.2016 по 18.03.2016 включительно** в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

По вопросу ознакомления с продаваемым имуществом следует обращаться по телефонам: (017)207-20-60, (044)777-11-58.

Телефоны для справок:
(017)327-48-36 (коммунальное унитарное предприятие «Минский городской центр недвижимости»);
(017)207-20-60, (044)777-11-58
(ОАО «Минский домостроительный комбинат»).

ОАО «Трест Белстромремонт»

СООБЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ОЧЕРЕДНОГО СОБРАНИЯ АКЦИОНЕРОВ, которое состоится 11 марта 2016 года в 12.00 в административном здании по адресу: г. Минск, пер. С. Ковалевской, 61

Повестка дня:

1. Отчет о результатах работы Общества за 2015 год и об основных показателях прогноза социально-экономического развития общества на 2016 год.
2. Утверждение годового отчета бухгалтерского баланса, отчета о прибылях и убытках за 2015 год.
3. Утверждение порядка распределения чистой прибыли, остающейся в распоряжении предприятия за 2015 год, размера и даты выплаты дивидендов за 2015 год.
4. Утверждение распределения плана прибыли, остающейся в распоряжении предприятия на 2016 год.
5. Избрание членов Наблюдательного Совета и ревизионной комиссии.
6. Утверждение материального вознаграждения членов наблюдательного совета и ревизионной комиссии.

Регистрация акционеров (их представителей) начинается в 11.00.

При себе необходимо иметь паспорт (для представителя акционера – доверенность).

УНН100135597

1 СУ «Квитанция о приеме наличных денежных средств (страховых взносов)» серии КС №№ 7131532-7131536 в количестве 5 штук, в Представительстве Белгосстраха по Пуховичскому району **считать недействительными.**

УНП 600013344

РУП «Гомельский институт недвижимости и оценки» вносит изменения в извещение о проведении повторного открытого аукциона со снижением начальной цены на 50% после очередных несостоявшихся торгов по продаже объектов недвижимости – зданий, принадлежащих Открытому акционерному обществу «Ратон» на праве собственности, назначенного на 10.00 23.02.2016 г.

Внести в текст извещения следующие изменения: дата и время проведения аукциона – **26 февраля 2016 г., 10.00.**

Заявления на участие в аукционе с приложением необходимых документов принимаются по адресу: г. Гомель, ул. Артема, 23 по рабочим дням с 9.00 до 12.00 и с 13.00 до 16.00 по **25 февраля 2016 г**. включительно. Заключительная регистрация с 09.00 до 10.00 **26 февраля 2016 г**.

Первоначальное извещение опубликовано в газете «Звязда» от 11.02.2016 г. №26.

Дополнительная информация по тел. (0232) 70-46-47.

УНП 490318588

Бобруйское управление филиала «Центр «Белтехинвентаризация» оказывает услуги по:

- оценке имущества (недвижимость, транспорт, оборудование)
- организации и проведению аукционных торгов
- инвентаризации и оценке зеленых насаждений

ФИЛИАЛ «ЦЕНТР «БЕЛТЕХИНВЕНТАРИЗАЦИЯ» ИЗВЕЩАЕТ: 21 марта 2016 г. в 11.00 состоятся открытые аукционные торги (торги) по продаже имущества, принадлежащего на праве собственности ОАО «Бобруйсктранс» (продавец), в составе:
Лот № 1 (предмет торгов): Капитальное строение с инвентарным номером 710/С-42460 (компрессорная), общ. пл. 31,0 кв.м, расположенное по адресу: г. Бобруйск, ул. Гоголя, 181

Организатор торгов	Филиал «Центр «Белтехинвентаризация», УНП 102353509, ОКПО 55484006, 220034, г. Минск, ул. Чапаева, д. 4, к. 222, р/с 3012105618108 в Региональной Дирекции № 700 ОАО «БПС-Сбербанк» г. Минска МФО 153001369
Продавец предмета торгов	Открытое акционерное общество «Бобруйсктранс», УНП 700169542, ОКПО 291215757, 213830, г. Бобруйск, ул. Минская, 123/1, р/с 3012420021026 в ОАО «Белинвестбанк» ЦБУ№ 831 г. Бобруйск, ул. Пушкина, 198, код 739, р/с 3012259270013 в РКЦ № 24 ОАО «Белагропромбанк» г. Бобруйск, ул. Горького, 1, код 458
Место проведения торгов и подачи документов	ул. Чонгарская, д. 54 , г. Бобруйск, в здании Бобруйского управления Филиала «Центр «Белтехинвентаризация» в рабочие дни с 8.30 до 17.30
Начальная цена продажи и размер задатка	110 000 000 рублей с учетом НДС, задаток 10% от начальной цены – 11 000 000 рублей
Номер расчетного счета для перечисления задатка	**Получатель платежа** – Филиал «Центр «Белтехинвентаризация», р/с 3012105618108 в Региональной Дирекции № 700 ОАО «БПС-Сбербанк» г. Минска МФО 153001369, УНП 102353509
Информация о земельном участке	Объект торгов расположен на земельном участке с кадастровым номером 741000000007002243 пл. 2,6457 га по адресу: г. Бобруйск, ул. Гоголя, 181. Имущественные права на земельный участок – право постоянного пользования. Земельный участок для обслуживания предмета торгов будет выделен после приобретения объекта с торгов согласно законодательству Республики Беларусь
Характеристика предмета торгов	Здание компрессорной – одноэтажное кирпичное, фундамент – бетон., перекрытия – ж/бет.; кровля – рулонная, полы – бетонные, имеется электроснабжение
Условия продажи предмета торгов	1. При заключении договора купли-продажи между продавцом и покупателем (претендентом на покупку) на цену продажи предмета торгов будет начислен НДС по ставке 20%, который необходимо перечислить на р/с ГУ МФ Республики Беларусь по Могилевской области № 3602917010008 в ОАО «АСБ «Беларусбанк», код 795,УНП 700005949,назначение платежа 01001 за ОАО «Бобруйсктранс», УНП 700169542. 2. Здание реализуется под контролем судебного исполнителя. 3. Денежные средства, причитающиеся от реализации объектов без учета НДС, перечисляются на счет ОАО «Бобруйсктранс» № 3012259270039 в РКЦ № 24 ОАО «Белагропромбанк» г. Бобруйск, ул. Горького, 1, код 458, УНП 700169542
Срок заключения договора купли-продажи	В течение 20 (Двадцати) рабочих дней с момента подписания протокола о результатах аукционных торгов
Сроки и условия оплаты	Определяются по согласованию победителя торгов (претендента на покупку) с продавцом при заключении договора купли-продажи
Срок подачи документов, осмотра объектов и внесения задатка	по 16 марта 2016 г. включительно до 17.00

Для участия в торгах лица, заявившие о своем участии в них, должны предоставить по указанному адресу следующие документы: заявление на участие в торгах; копию платежного поручения о внесении участником торгов суммы задатка с отметкой банка об исполнении, паспорт; **для резидентов Республики Беларусь: юр. лицам** – доверенность представителю юр. лица (в случае необходимости таковой), копии и оригиналы учредительных документов и свидетельства о гос. регистрации; **представителям физ. лиц** – нотариально заверенную доверенность; **для нерезидентов Республики Беларусь: юр. лицам** – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть проведена не ранее чем за 6 мес. до подачи заявления на участие в торгах) или иное эквивалентное доказательство юр. статуса в соответствии с законодательством страны происхождения; **юр. лицам и физ. лицам** – документ о состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с заверенным в установленном порядке переводом на белорус.(рус.) язык; **представителям юр. лиц и физ. лиц** – легализованную в установленном порядке доверенность.

Порядок проведения торгов: Шаг аукциона определяется в размере от 5 до 15 процентов от начальной цены предмета торгов. Победителем торгов признается участник, предложивший наиболее высокую цену. По завершении торгов составляется протокол об итогах проведения торгов, который подписывается победителем и членами аукционной комиссии и является основанием для заключения договора купли-продажи. В случае если заявка на участие в торгах подана только одним участником, предмет торгов продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов. Задаток, внесенный Победителем торгов, будет зачтен в счет оплаты стоимости услуг Организатора торгов, разница между задатком и суммой стоимости услуг будет зачислена в счет окончательной оплаты приобретенного предмета торгов, остальным участникам будет возмещен в течение 5(пяти) рабочих дней со дня проведения торгов. Организатор торгов вправе отказаться от проведения торгов в любое время, но не позднее чем за три дня до даты их проведения

Победитель (Претендент на покупку) возмещает затраты и стоимость услуг на организацию и проведение торгов не позднее 3(трех) рабочих дней с момента подписания протокола о результатах аукционных торгов в соответствии с соглашением о правах и обязанностях сторон в размере 10% от начальной цены продажи

Получить дополнительную информацию о продаже имущества можно по адресу: г. Бобруйск, ул. Чонгарская, 54 или связавшись с нами по телефонам: 8 (0225) 72 01 32, 72 13 93, 8 (044) 710-50-85 в рабочие дни с 8.30 до 17.30.

В связи с прекращением деятельности УП «ЦЕПТЕР ИНШУРАНС» и проведением ликвидационных процедур обязательства, принятые УП «ЦЕПТЕР ИНШУРАНС» по договорам добровольного страхования, в соответствии с законодательством будут переданы ЗАСО «Промтрансинвест» по следующим видам страхования:

- добровольное страхование имущества юридических лиц;
- добровольное страхование от несчастных случаев;
- добровольное страхование гражданской ответственности владельцев квартир;
- добровольное страхование строений и домашнего имущества граждан;
- добровольное страхование наземных транспортных средств юридических лиц;
- добровольное страхование наземных транспортных средств физических лиц;
- добровольное страхование от несчастных случаев и болезней на время поездки за границу;
- добровольное страхование медицинских расходов.

Договор о передаче обязательств подписан 17.02.2016.

В течение месяца со дня опубликования настоящего уведомления страхователи вправе подать письменное заявление о расторжении заключенных с УП «ЦЕПТЕР ИНШУРАНС» договоров добровольного страхования (220034, г. Минск, ул. Платонова, 1Б – 28В). При отсутствии такого заявления обязательства по заключенным с УП «ЦЕПТЕР ИНШУРАНС» договорам добровольного страхования будут переданы ЗАСО «Промтрансинвест».

Для получения дополнительной информации предлагаем клиентам УП «ЦЕПТЕР ИНШУРАНС» связаться по телефонам: (017) 290 93 94 (95) либо посетить сайт: www.zepterinsurance.by.

УНП 80600273

Центр Промышленной Оценки

- **Организация аукционов**
- **Оценка всех видов имущества**

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

Организатор аукциона	**ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703**
Продавец	**ОАО «Газпром трансгаз Беларусь», г. Минск, ул. Некрасова, 9**

Предмет аукциона

Имущество бывшей компрессорной станции Ивацевичи, расположенной по адресу: Брестская обл., Ивацевичский р-н, д. 2, 2 км юго-западнее деревни Холопья, в составе:

Наименование	Назначение	Общая площадь	Инвентарный номер
Здание КЦ-3	Здание нежилое	2476 кв.м	122/С-2251
Составные части и принадлежности: асфальтобетонное покрытие, бетонное покрытие, покрытие из плитки, сетчатое ограждение, ворота, ворота			
Здание проходной КЦ-3	Здание нежилое	95,1 кв.м	122/С-2246
Здание санитарно-бытового корпуса	Здание нежилое	111,5 кв.м	122/С-2250
Здание котельной КЦ-3	Здание нежилое	276,9 кв.м, в т.ч. подвал	122/С-2248
Здание КТП АВО газа КЦ-3	Здание нежилое	145,5 кв.м	122/С-2249
Здание ЗРУ-10 кВ КЦ-3	Здание нежилое	389,9 кв.м	122/С-2247
Здание КНС КЦ-3	Здание нежилое	20,8 кв.м	122/С-2245
Составные части и принадлежности: подвал, КНС (сооружение): насос фекальный к60/30, задвижка стальная ф 50, кран ф50, вентилятор Ц Ц-70 (ВАО-071-4), манометр измерительный			
Система грозозащиты КЦ-3	Сооружение специализированное энергетики		122/С-15277

Передаточные устройства

внутриплощадочные электросети КЦ-3 с инв. №122/С-15271, назначение – сооружение специализированное энергетики, протяженность – 557 м

внутриплощадочные теплосети с инв. №122/С-15270, назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства, протяженность – 329,9 м

внутриплощадочные водопроводные сети КЦ-3 с инв. №122/С-15273; назначение – сооружение специализированное водохозяйственного назначения; протяженность – 1624,2 м

внутриплощадочные сети канализации КЦ-3 с инв. №122/С-15275, назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства, протяженность – 302,3 м

Оборудование

КНТП промплощадки КЦ-3, инв. № 100000030413

мостовой кран машзала электрический КЦ-3, инв. № 100000030630

тельфер электрический машзала КЦ-3, инв. № 100000030649

кран мостовой ручной КЦ-3, инв. № 100000030631

таль ручная червячная КЦ-3, инв. № 100000030650

радиоканальная система передачи извещений «Маяк» КЦ-3, инв. №100000032836

Начальная цена с НДС 20% – 5 100 000 000 белорусских рублей

Сведения о земельном участке: Кадастровый номер: 123400000001000151. Площадь (га): 3,1410.
Категория: Земли промышленности, транспорта, связи, энергетики, обороны и иного назначения.
Целевое назначение: Земельный участок для обслуживания компрессорной станции «Ивацевичи» (компрессорный цех №3). Участок предоставлен продавцу на праве постоянного пользования

Задаток 10% от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях (BYR) перечисляется на р/с № 3012343260010; нерезидентами РБ задаток может перечисляться в валютном эквиваленте по курсу Нацбанка РБ на дату платежа на в/с: в долларах США (USD) – 3012743260072; в евро (EUR) – 3012343265060; в российских рублях (RUB) – 3012743260098; в Дирекции «ОАО Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК 153001739, УНП 191021390, получатель платежа ЗАО «Центр промышленной оценки».

Срок подписания договора купли-продажи	15 рабочих дней после проведения аукциона

Условия оплаты предмета аукциона

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5%) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты за предмет аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после подписания договора купли-продажи

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **www.cpo.by**

Предыдущее извещение опубликовано в газете «Звязда» от 30.01.2016.

Дата и время проведения аукциона	**17.03.2016 в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»**
Дата и время окончания приема документов	**16.03.2016 до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»**
Контактные телефоны	**Тел.: +375 17-280-36-37; +375 29-183-69-71. E-mail: auction@cpo.by**

ОБЪЯВЛЕНИЕ О ТОРГАХ

Наименование (описание), местонахождение и стоимость имущества	**Лот №1. Витрина стеклянная одиночная в корпусе белого цвета. Первоначальная стоимость – 1 553 000 рублей.** **Лот №2. Витрина стеклянная угловая в корпусе белого цвета. Первоначальная стоимость – 1 600 000 рублей.**
Собственник (владелец) имущества	ЧТУП «Волшебная Дафина», УНП 390508062
Местонахождение (адрес) имущества	г. Орша, пр-т Текстильщиков, 35
Информация об обременениях	Без обременений
Место (адрес), дата и время проведения торгов	г. Орша, ул. Островского, 36, каб. 9 09 марта 2016 года в 11.00
Справочная информация	Отдел принудительного исполнения Оршанского района и г. Орши 211030, г. Орша, ул. Островского, 36. Зам. начальника отдела – Дубкевич Ольга Леонидовна, тел. 80216543205.
Условия и порядок проведения торгов	1. Подать письменную заявку на участие в торгах и дать подписку об отсутствии препятствий для приобретения имущества, предусмотренных законодательством. 2. Внести задаток в размере 10 процентов от стоимости имущества (по каждому лоту) на депозитный счет отдела принудительного исполнения Оршанского района и г. Орши № 3642903000794 ОАО «АСБ Беларусбанк», код 647, УНП 30002505 **не позднее 05.03.2016 г.** Минимальная величина первого шага – 5% стоимости каждого лота. В соответствии с ч. 3 ст. 401 ХПК Республики Беларусь возмещение затрат на организацию и проведение торгов осуществляется участником, выигравшим торги.

ПАШЛІ ДУРНОГА...

Не ведаю, як цяпер, а некалі перад стыпендыяй вельмі многіх студэнтаў даймаў голад...

Мы жылі ў інтэрнаце на сталічнай Паркавай магістралі (цяпер гэта праспект Пераможцаў) — хлопцы ў левым крыле, дзяўчаты ў правым, па сем, па восем чалавек у пакоі. Харчаваліся чым давядзецца: атрымлівалі стыпендыі, нейкую капейку і нейкі харч кожны прывозіў з дому. Халадзільнікаў, праўда, не было, таму ўзімку ўсе прыпасы вывешваліся знадворку на фортках і, як правіла, не псаваліся, бо... не паспявалі. Хіба што з салам пытанні былі. На яго, як вядома, дзяўчаты не дужа налягалі — стараліся фігуры трымаць, а вось мы, хлопцы, з'ядалі падчыстую — спачатку сваё, а потым і дзявочае: дзе частаваліся, дзе «пазычалі»...

І вось наступае чарговае прадвесне, грошай перад стыпендыяй кот наплакаў, сала скончылася, а есці хочацца — аж твары баляць.

Што ж прыдумаць?

Алесь, сусед па ложку (і, дарэчы, выдумшчык, якіх пашукаць) кажа:

— А давайце Васілю тэлеграму дадзім — быццам бы з дому... Ён паедзе, нечага прывязе... Згодны? Тады вываročвайце кішэні, — камандуе ён, — скідваемся, і я пабег на паштамт.

Сказана — зроблена: назбіралі мы грошай на тэлеграму, Алесь тут жа сігануў за дзверы...

Зараз самы час сказаць пра Васіля.

Родам ён быў з нейкай глухой палескай вёскі, жыў там удваіх з матуляй (мы часам пыталі: «А іншыя людзі там ёсць?» І самі ж адказвалі: «Ёсць, але дробненькія-дробненькія»).

Васіль, ну вядома ж, ездзіў да іх, дадому — на вялікія савецкія святы альбо на канікулы. І, што важна, кожны раз вяртаўся адтуль з поўнай сумкай — адмыслова прыгатаванага сала, мяса...

Якраз на гэта і быў разлік.

Атрымаў, значыць, Васіль тэлеграму з кароткім «Тэрмінова прыязджай, мама» і куляй паляцеў у дэканат — адпрасіўся з заняткаў.

Адпусцілі яго на тры дні (нікому ў галаву не прыйшло паглядзець, адкуль — канкрэтна — адпраўлена тэлеграма). А значыць нам засталося толькі пачакаць.

Дату і час вяртання сябрука мы ведалі і ў тую раніцу ўжо не спалі — проста выгляд зрабілі, што спім. І вось стук у дзверы. Алесь як быццам спрасонку праціраючы вочы (артыст пагарэлага тэатра!) адчыняе Васілю, кажа:

— А, гэта ты?.. Заходзь... Ну што ў вас там зрабілася?

Васіль нічога яму не адказвае: не скідаючы паліто, садзіцца на свой ложак, «слухае» сонную цішыню, потым рэзкім рухам ускідвае на стол сваю поўную сумку і кажа: «Наце, жарыце!..» (Усё наступнае не для друку.)

Хлопцы ўмомант падхапіліся з ложкаў, тут жа абступілі стол: як тыя крумкачы, наляцелі на палескія прысмакі...

Хай не адразу, але далучыўся да іх і Васіль. Разам з іншымі ўплятаючы гасцінцы, ён, вядома ж, радаваўся, што лішні раз наведаўся дадому, што пабачыўся з маці, нешта зрабіў па гаспадарцы...

Але ж аўтару той тэлеграмы «морду набіць» абяцаў. Ну хоць бы за тое, што неспадзеўкі ўбачыўшы сына, маці ледзьве не самлела. Спытала: «Што — двоек нахапаў?.. Выгналі дурня?..»

А высветлілася, што не — не нахапаў, не выгналі... Яго толькі паслалі. Па сала.

М. Камароўскі,

г. Орша.

ЖАХ — ГЭТА ПА-НАШАМУ?

Вам звычайна дасылаюць досыць доўгія «праўдзівыя гісторыі», а ў мяне — кароткая, можна сказаць, эпізод, хоць мы, узгадаўшы яго, кожны раз смяёмся. Нехта з чытачоў, магчыма, далучыцца?

Перш-наперш трэба сказаць, што я — дзіця гарадское, у вёсцы да 16 гадоў ні разу не была. Хіба па тэлевізары бачыла драўляныя хаты, прысады, чароды гусей... А тут маёй маме пазваніла яе былая аднакурсніца, запрасіла прыехаць — хоць на выхадныя. А можна, маўляў, і на болей, бо дом вялікі, лес-рэчка побач. І так мне захацелася ў вёску...

У дарогу я выбралася адна (маме нешта не выпала). Ехала спачатку цягніком — да райцэнтра, потым — аўтобусам да цэнтральнай сядзібы калгаса, а нарэшце, да вёскі, кіламетры з тры ішла пехатой.

І вось я на месцы. Цёця Лёля сустракае мяне, ужо прыцемкам водзіць па сялібе, хваліцца сваім кветнікам (толькі жоўтых руж там 9 гатункаў!), паказвае сад і гарод, уключыўшы святло («пульт» у верандзе), вядзе ў хлеў да каровы...

Нарэшце кажа, што так званыя «выгоды» ў яе на дварэ («У тым вунь белым дамку»), што рукі можна памыць паблізу — пад умывальнікам, а потым, маўляў, калі ласка, на веранду, за стол.

Двойчы запрашаць мяне не трэба было. Я тут жа ўключыла святло ў тым «белым дамку», адчыніла дзверы. Хацела знутры зашчапіць і не змагла. Па-першае, таму, што ніякай зашчапкі там проста не было («Ну і не трэба, — падумала, — цёця Лёля жыве адна, баяцца няма каго...») А па-другое, усё палатно дзвярэй, зверху да самага нізу, было акуратненька заклеена... этыкеткамі ад розных напіткаў: вінаў, гарэлак, каньякоў, піва... Ну цікава ж усё разгледзець!

Толькі засяродзілася, толькі прысела...

Усё здарылася ў адно імгненне: раптам патухла святло... Тут жа звонку пачуліся крокі... І — душа ў пяткі! — нехта... расчыніў дзверы. Насцеж...

— А-а-а! — нема заверашчала я.

— А-а-а! — у той жа момант закрычаў нехта...

Трошкі пазней высветлілася, што гаспадыня, спехам збіраючы вячэру, думала пра непадоеную карову і не думала (бо... забылася) пра мяне. Таму, згледзеўшы праз акно веранды, што ў прыбіральні гарыць святло, яна выключыла яго (бо трэба ж эканоміць?) і тут жа... вырашыла зайсці... Чым ледзь не да смерці спужала мяне і спужалася сама.

Зразумеўшы ўрэшце, што адбылося, хвілін з дзесяць мы рагаталі і, дзякуючы гэтаму смеху, неяк адразу пасябравалі. Ва ўсякім разе гадоў з 15 ужо цёця Лёля зрэдку прыязджае да нас у горад, а мы з мамай, маім мужам і дзецьмі прыязджаем да яе ў вёску.

Што, магчыма, цікава, дзверы таго маленькага белага дамка па-ранейшаму ўпрыгожаны «цыкеткамі» (цётчына слова), праўда, новымі. І зашчапка на іх, вядома ж, з'явілася. А вось вялікі дом не замыкаецца амаль ніколі. Дзякаваць Богу, ніхто там нічога не крадзе і нікога не палохае.

А. Усцінчык,

г. Мінск.

«ХАДЗІ, ЯК ХАДЗІЛА...»

Нешта не тое дзеецца цяпер... Нават у анекдотах. Ну згадзіцеся: жанчыны там, як правіла, ваяўніцы і тыранкі, мужчыны — слабыя, бязвольныя істоты (ці нават істоткі?).

А было ж! Я сама яшчэ помню часы, калі мужчына ў градах — гэта ганьба на ўсё сяло! Яго справа — плуг. А цяпер што? Рачкуюць, як таты Карлы...

Зрэшты, гэта хіба ўступ да гісторыі. Зараз яна сама.

Было гэта яшчэ да рэвалюцыі, непадалёк — у вёсцы Турск. Вёска, што важна, стараверская. Але ж і там ці не кожны мужчына хацеў мець прыгожую жонку. А калі кахаў яе, то і шанаваў.

Дык вось — сужэнцы, сям'я. Ён, Герасім — галава, яна, Еўдакія — жонка яго і прыгажуня на ўвесь той Турск: што пастава ў яе, што твар, што вочы — сіней за неба. А ўжо валасы! Сапраўдная «залатавалоска». Ні адзін сучасны салон іх, мусіць, так не завіў бы!

Нялёгка было Герасіму дабіцца, каб з усіх хлапцоў яна выбрала іменна яго. Але ж цаніў... Іначай як **Д*у*ша** мая ніколі не зваў...

А ў іх жа, у старавераў, парадкі строгія. У прыватнасці, замужняя жанчына і выглядаць павінна як замужняя — гэтакай «чарніцай»: ну, каб ніякіх там вабнотаў з-пад цёмнай сукенкі — нават намёкам, каб ніякіх кудзерак з-пад чорнага «плата» (хустка так называлася)...

Д*у*шы не па душ**ы*ы*** была гэткая мода, вось яна за ёй і не гналася. Ды і Герасім не настойваў. Ён па-ранейшаму любаваўся ёй. Тамтэйшыя мужыкі — таксама. Некаторыя нават сваім жонкам у прыклад ставілі, маўляў, ото ўжо ў Герасіма Еўдакія прыгожая!..

Як кажа Задорнаў: «во-о-сь»! Якраз вось гэта і не падабалася турскім жанчынам. Сталі яны «выступаць»: як гэта можна так выглядаць?.. І каму: не дзеўцы ўжо, а мужавай жонцы?!

Лютавала і Герасімава сям'я (адна з пяці, дарэчы, што заснавалі некалі Турск). Яны ж, маўляў, Сакаловы, найперш павінны трымацца традыцый продкаў, узорам быць, прыкладам для іншых. А тут — такая нявестка...

Герасім на гэта спачатку нічога не казаў, бо з аднаго боку — быццам грэх не згадзіцца, а з іншага...

Карацей, не вытрымаў ён шматлікіх «наездаў» і неяк, пахадзіўшы кругом ды наўкола, сказаў сваёй палавіне:

— Ты гэта... Можа, і праўда, сціплей крыху адзявайся. І валасы хавай.

Дуня пакорліва схіліла сваю прыгожую галоўку: маўляў, як скажаш, гаспадар.

На другі дзень прыйшоў Герасім з поля, вымыўшы рукі, сеў за стол — з пакояў выходзіць... Быццам бы Душа яго і не Душа — чыстая манашка: плат да самых бровак, сама ўся ў чорным...

Герасім, не данёсшы кавалак хлеба да рота, пытае:

— Што зрабілася?!

— Нічога, любенькі, — адказвае Душа. — Ты ж сказаў, што па-іншаму трэба адзявацца, дык я і паслухала.

Герасім доўга маўчаў, доўга разглядаў сваю жонку. Бачна, сумненні меў, і вялікія... Завяршыліся ж яны кароткім:

— Не, хадзі лепш, як хадзіла. Пераадзенься давай.

— Як скажаш, — зноў жа пакорліва прамовіла жонка.

І тым самым без адзінага стрэлу, як той казаў, вырашыла праблему: і мужа паслухала, і на сваім настаяла — на праве быць прыгожай.

...А ўвогуле — гэта не я сказала — мужчына можа дабіцца намнога больш, чым можа — калі побач з ім разумная жанчына.

Соф'я Кусянкова,

в. Лучын, Рагачоўскі раён.

Рубрыку вядзе Валянціна ДОЎНАР.

dounar@zviazda.by

■ Ніколі не забудзем

Подзвігу Акрэсціна прысвячаецца...

Штогод у мінскай гімназіі № 30 імя Героя Савецкага Саюза Б.С. Акрэсціна святкуюць дзень нараджэння славутага лётчыка

Фота Яўгена КОКТЫША.

Ветэраны Вялікай Айчыннай вайны — Анатоль СУЛЬЯНАЎ, Сяргей НОВІКАЎ і Анатоль АТРУБА — галоўныя госці сустрэчы.

Каб успомніць подзвіг і ўшанаваць памяць авіятара, сюды прыходзяць ветэраны Вялікай Айчыннай вайны, прадстаўнікі Ваенна-паветраных сіл і войскаў супрацьпаветранай абароны.

Барыс Сямёнавіч Акрэсцін загінуў 6 ліпеня 1944 года пры вызваленні Мінска ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Кажуць, што экіпаж камандзіра штурмавіка Барыса Акрэсціна і паветранага стралка Віктара Саладухіна ўпаў у раёне Сосnaў, што недалёка ад Мінска.

— Да 1961 года мала хто ведаў пра подзвіг гэтага экіпажа, — расказвае **кіраўнік музея баявой славы гімназіі Тамара ЛОСКУТАВА.** — Усё пачалося з таго, калі аднойчы вучні нашай школы напярэдадні 23 лютага вырашылі ўскласці кветкі на Вайсковых могілках Мінска. І калі натрапілі на помнік, прысвечаны Акрэсціну, задумаліся — а хто гэта? Сур'ёзная даследчая работа пачалася пад кіраўніцтвам тагачаснага дырэктара школы, удзельніка Вялікай Айчыннай вайны Рыгора Сівакова. Знаходзяць матэрыялы: аказваецца, Барыс Акрэсцін — масквіч, лётчык, які здзейсніў подзвіг у Беларусі.

Школьнікі настолькі захапіліся пошукавай работай, што знайшлі прозвішчы і некаторых іншых невядомых герояў. Сёння ў экспазіцыі музея баявой славы, створанага на базе гімназіі, захоўваецца памяць аб 5 лётных экіпажах і 13 лётчыках. Тут — часткі самалётаў, знойдзеныя пошукавымі атрадамі, дакументы і асабістыя рэчы лётчыкаў, фотаздымкі.

— Подзвіг Барыса Акрэсціна яшчэ вялікі тым, што на ім выхоўваюцца тысячы лётчыкаў, — лічыць **пісьменнік, генерал-маёр авіяцыі Анатоль СУЛЬЯНАЎ.** — І адзін з іх служыў на беларускай зямлі. Генадзь Елісееў загінуў пры выкананні баявой задачы, чым паўтарыў подзвіг Акрэсціна — праўда, ужо ў мірны час. Загінуць у імя Айчыны — вечны подзвіг.

Сёння аб тым месцы, дзе падчас вызвалення нашай краіны загінуў баявы экіпаж, не нагадвае нават сціплы помнічак. А варта, каб пра подзвіг лётчыкаў-герояў ведалі не толькі гімназісты.

Вераніка КАНЮТА. *kanyuta@zviazda.by*

■ Песню бярыце з сабой

САМ НЕ ЗНАЮ, НЕ ВЕДАЮ

Вясёлая песня «Сам не знаю, не ведаю» заўсёды стварае радасную атмасферу, выклікае парадаксальна-неўраўнаважаную гарэзлівасць. Аднак у песні за бесклапотнай весялосцю з гулліваэратычным падтэкстам праглядваецца спаконвечная несуладнасць у сямейных зносінах. Што рабіць, калі паўсюль не ўсе шлюбныя пары наладжваюць сямейныя стасункі ў любові і згодзе? Але як бы ні складваліся абставіны, людзі яўна ці патаемна прагнуць сямейнага шчасця, якое трымаецца на гармоніі душы і цела. Усе жадаюць адчуць і агністы позірк, і ласкавае слова, і далікатныя, поўныя кранальнай пяшчоты абдымкі...

З такім, мабыць, меркаваннем Аляксей Туранкоў падбіраў дасціпны эпізод з фальклору для оперы «Кветка шчасця». Кампазітар, 130 гадоў з дня нарадзінаў якога споўнілася ў мінулым месяцы, добра ведаў беларускую музыку (апрацоўваў народныя песні, напісаў шмат вакальных твораў на вершы нацыянальных паэтаў), яе энергетычную сілу і эстэтычнае ўздзеянне. Песня «Сам не знаю, не ведаю», у якой столькі разгульна-жыццёвай жарсці, была вельмі прыдатнай. Аляксей Яўлампіевіч напісаў музыку, блізкую да народнай, у тэксце зняў апошнюю страфу (наказ маладзіцы старому мужу) і замест яе зрабіў паўтор першай. Гэта яшчэ больш узмацніла мужчынскую тэмпераментнасць у вакальным творы і адначасова прагучала своеасаблівым быццёвым одумам. У такім выглядзе пад назвай «Песня бабыля» ён арганічна ўвайшоў у канву оперы «Кветка шчасця». Сам кампазітар Аляксей Туранкоў, якому на час яе прэм'еры мінула пяцьдзясят тры гады, выканаў песню ў спектаклі. І яна стала папулярнай у нашым краі.



САМ НЕ ЗНАЮ, НЕ ВЕДАЮ

Сам не знаю, не ведаю,
Што рабіці маю,
Людзі кажуць жаніціся,
А я і не думаю.

Ой, нашто ж мне жаніціся,
Ой, нашто ж мне жонка?
Ёсць у мяне суседачка,
Добрая прыяцелька.

Маладзіцы, удавіцы
На мяне маргаюць,
То ў нядзелю, то у свята
К сабе зазываюць.

«Прыйдзі, прыйдзі, мой міленькі,
Ка мне на хвілінку,
А я вышлю свайго дзеда
У лес па малінку.

Ідзі, стары, барадаты,
У лес па маліну.
А не пойдзеш у маліну, —
Любіці пакіну».

Апошнія два радкі кожнай страфы паўтараюцца.

Падрыхтаваў Міхась ШАВЫРКІН

НАЗЫВАЙЦЕ МЯНЕ МАРКАМ!

Людзі, якія памянялі імёны, распавялі, навошта яны гэта зрабілі

Змяненнем прозвішча ў пашпарце сёння нікога не здзівіш — гэта звычайная справа, калі дзяўчына выходзіць замуж. А вось тых, хто надумаўся змяніць сваё імя, — адзінкі. Нядаўна знаёмы распавёў пра цікавую сітуацыю. Міхась, з якім яны разам наймаюць кватэру, павесіў на лядоўні цыдулку «Цяпер тут ёсць Марк». На пытанне, «што гэта значыць?» хлопец адказаў: «Я ўжо даўно думаў узяць сабе другое імя. Бацькоў шакаваць не буду, няхай называюць Мішуткам. А вось незнаёмым людзям вырашыў прадстаўляцца Маркам. Міша — занадта мякка гучыць. Калі ў імені ёсць літара «р», то чалавека ўспрымаюць па-іншаму, як валявога, упэўненага ў сабе». Міхась, як я зразумела, афіцыйна мяняць імя пакуль не збіраецца. Проста захацеў правесці эксперымент. А вось нашы сённяшнія гераіні больш як 10 гадоў таму адважыліся на такі крок.

Аліса-Аляксандра КСЯНЕВІЧ:

«АДЧУВАЮ СЯБЕ БОЛЬШ ГАРМАНІЧНАЙ»

«Імя Аліса — вельмі гуллівае, яркае, сексуальнае. І гэта ўсё пра мяне».

— Я памяняла імя з Аляксандры на Алісу-Аляксандру ў 19 гадоў. Імя Аляксандра мне падабаецца, імя Саша (як жаночае) — не. Калі ты Аляксандра, усе клічуць цябе Сашай, Саняй. Але я заўсёды акцэнтавала ў сабе жаноцкасць, мяккасць і далікатнасць. Калі правесці аналогію з прычоскай... Ведаеш, ёсць жанчыны, якім пасуюць кароткія стрыжкі, ім такія падабаюцца. Дык вось імя «Саша» — гэта стрыжка пад хлопчыка. Мне такая не пасуе, але давялося насіць яе 19 гадоў, перш чым я здабыла гармонію ў новым імені. Усё прыйшло ў раўнавагу — тое, як я сябе адчуваю і ўяўляю ў свеце.

А пачалося ўсё з таго, што ў мамы нарадзіліся мы, трайняткі. Роды былі цяжкія, бабулі вельмі дапамагалі. І хоць першапачаткова ў мамы былі любімыя імёны, яна вырашыла даць магчымасць сваёй маці і свекрыві назваць па дзіцяці. Са сваіх любімых (Аліса, Іва, Злата) матуля абрала Злату. Бабулі выбралі імёны Ганна і Аляксандра. Мама па сваёй волі дала ім гэтую магчымасць, а не таму, што не хацела пярэчыць або яны настаялі. Але ўжо пазней, калі пачаліся размовы пра змену імені, яна сказала, што трэба было назваць усіх дзяцей так, як сама хацела і адчувала. Распавяла мне гэтую гісторыю, калі мы абмяркоўвалі дзяцей, сям'ю, і я сказала, што вельмі хацела б дачку, каб назваць яе Алісай. Тады мама і прапанавала змяніць імя. Сама я да гэтага не дадумалася б. Але цяпер вельмі ўдзячная маме! Усё ж такі вельмі важна, каб жанчына сама называла сваіх дзяцей. Мама як ніхто іншы адчувае энергетыку свайго дзіцяці і тое, якое імя яму падыходзіць. Самае цікавае, бабуля адразу перайшла на Алісу. А тата, у гонар якога яна мяне назвала Аляксандрай, трымаўся гады 2-3. Цяпер сябры, сёстры кажуць, што не ўяўляюць мяне з іншым іменем.

— Кажуць, што са зменай імені мяняецца і лёс. Ці верыш ты ў гэта?

— Думаю, мяняецца. Ці проста я з узростам мяняюся. Глядзі, у мяне падвойнае імя. Я з'ехала ў ЗША 5 гадоў таму, і цяпер у мяне быццам бы два жыцці, дзве краіны, дзве мовы. Англійская, на якой размаўляю, працую, вучуся штодня. І руская, на якой маю зносіны з сям'ёй. Імя Аліса — вельмі гуллівае, яркае, сексуальнае. І гэта ўсё пра мяне. Мне здаецца, гэтае імя актуалізавала ўва мне экстраверта і пестуна лёсу, чалавека, здольнага рызыкаваць.

Вольга-Аляксандра БЕЛЬСКАЯ:

«ШУКАЛА МОЦНАЕ ІМЯ»



Аляксандра Бельская не адгукаецца на імя Воля.

— Вольгай мяне назвалі дзядзькі — малодшыя браты маёй мамы. Потым так склалася, што ў класе, дзе я вучылася, было ажно тры Волі. Раздражняла, што, пачуўшы гэтае імя, абарочвалася палова класа. Падавалася, што ты нічым не выдзяляешся. Неяк была ў цырульніцы, і яна мне сказала, што калі ў поўным імені пяць літар (мела на ўвазе рускі адпаведнік — «Ольга»), то цяжкі лёс. Праўда ці не, але калі ў цябе нешта ў жыцці не складваецца, пачынаеш верыць у цуды. З'явілася надзея, калі памяняю імя, усё павернецца ў лепшы бок. Мама не падтрымала маё жаданне, таму я дачакалася, калі мне споўніцца 18, і прыняла самастойна рашэнне. Я доўга вывучала матэрыял пра значэнне імёнаў, шукала моцнае імя. Бо «Воля» мне падавалася вельмі мяккім, быццам бы за сябе пастаяць не можаш. «Аляксандра» мае больш моцную энергетыку. З павагі да сваякоў узяла падвойнае імя.

— Спраўдзіліся твае чаканні?

— Не магу сказаць, што жыццё перавярнулася з мінуса на плюс. Усе надзеі, якія я на гэта ўскладала, напэўна, не збыліся. Спадзяюся, што ў лепшы бок памянялася, магчыма, мацнейшай стала. У мяне ёсць жарт. Калі нешта добра атрымліваецца, значыць «Саша — малайчына, яна пастаралася». Калі нешта не ладзіцца: «Гэта Воля вінаватая».

— Як успрынялі навіну людзі, якія ўсе 18 гадоў ведалі цябе Воляй?

— Сябры з часам прызвычаіліся і сталі паважаць маё рашэнне. Сваякоў жа пастаянна даводзіцца выпраўляць, нехта прынцыпова называе мяне толькі Воляй. Мама спачатку была незадаволена. Але знайшла ўніверсальны варыянт: называе мяне Аляксашкай, быццам бы падобна на Волю, і быццам бы на Сашку. Але на гэта спатрэбілася 10 гадоў.

— Не шкадуеш цяпер?

— Не. Тое, што імя выбрана правільна, я не сумняваюся. Адзінае, варта было б спыніцца на адным варыянце. Бо асноўная маса людзей не дачытвае да другога імені. Альбо прыходзіш у паліклініку, да цябе звяртаюцца: «Бельская Вольга Аляксандраўна?». Даводзіцца ўвесь час выпраўляць: Вольга-Аляксандра Сяргееўна.

«ПЕРШ ЧЫМ НАЗВАЦЬ ДЗІЦЯ, ПРАКАНСУЛЬТУЙЦЕСЯ З ПСІХОЛАГАМ»

— Імя адыгрывае ключавую ролю ў жыцці чалавека, і калі яго даць няправільна — можна нават загубіць жыццё, — лічыць **прафесар псіхалогіі Барыс ХІГІР**, які больш за 30 гадоў займаецца вывучэннем уплыву імені на характар і лёс чалавека. — Асабліва небяспечна, калі бацькі называюць дзіця пад уплывам нейкай сваёй «ідэі фікс». Вось і мучацца потым гэтыя Аўроры, Індустрыі або Электроны, трываюць насмешкі. Рэзананс, які выклікаецца такім імем, не адпавядае ўнутраным душэўным вібрацыям чалавека. Аэліты, Эвіты і Літаніі — імёны запазычаныя... Яны не ў нашай ментальнасці, а значыць, іх уладальнікі будуць канфліктаваць з навакольным светам. Трэба выбіраць імя, улічваючы законы мілагучнасці. Напрыклад, старацца, каб апошняя літара імя не супадала з першай літарай, колькасць складоў у імені і імені па бацьку павінна адрознівацца, трэба звяртаць увагу і на паходжанне імені (пагадзіцеся, нават на слых Джазэфіна Іванаўна ўспрымаецца з іроніяй). Наогул у змене імені нічога крымінальнага няма — больш карысці. Калі людзі адчуваюць прыналежнасць да іншай камбінацыі галосных і зычных, гэта нармальна — увесці сябе ў адпаведнасць са сваім «я». У старажытным Ізраілі дзіцяці давалі імя некалькі разоў: пры нараджэнні, як пачынаў хадзіць, перад школай, пасля школы, у момант палавога выспявання і пасля жаніцьбы. Былі спецыяльныя святары — спецыялісты па імёнах. На кожным этапе выбіраўся той персанальны код, які дапамагаў чалавеку. Кожнае імя мае свой набор характарыстык, таму пры яго змене лепш за ўсё пракансультавацца з псіхолагам.

«НЕ ПАДАБАЕЦЦА» — ГЭТА НЕ АРГУМЕНТ

— Вось толькі перад вамі маладая дзяўчына, гадоў 17, прыходзіла на кансультацыю, — рэагуе на маё пытанне **кіраўнік ЗАГСа Заводскага раёна Мінска Таццяна АЛЯКСЕЕВА**. — Сказала, што ёй проста не падабаецца яе імя. Хоць яно вельмі прыгожае — Лізавета. Хоча памяняць на Яну. Мы ёй растлумачылі, што яе хадайніцтва могуць не задаволіць. Прычыны для змены імені павінны быць дастаткова важкімі. Трэба прадаставіць дакумент, які аргументуе матывацыю. Напрыклад, копіі літаратурных твораў, артыкулаў для таго, каб пацвердзіць свой творчы псеўданім. Многія хочуць афіцыйна насіць імя, дадзенае пры хрышчэнні і адрознае ад таго, якое далі бацькі. Што тычыцца Лізаветы, то заяву яна пакуль не пісала, сказала: «Пайду думаць». Магчыма, яна недзе штосьці знойдзе ў архівах, прыкладзе нейкую тлумачальную запіску. Па законе імя, прозвішча або імя па бацьку ў нашай краіне можна змяняць з 16 гадоў. Агульны тэрмін разгляду гэтай адміністрацыйнай працэдуры да 2 месяцаў. Спачатку даныя заяўніка накіроўваюцца для праверкі ў органы ўнутраных спраў, каб ўпэўніцца, што ён не знаходзіцца пад следствам. Затым матэрыялы адпраўляем у галоўнае ўпраўленне юстыцыі Мінгавыканкама, якое прымае канчаткова — рашэнне. Заяўнік, які атрымаў дазвол, павінен заплаціць за рэгістрацыю змены імені дзяржаўную пошліну — 2 базавыя велічыні (плюс па 1 базавай велічыні за кожны дакумент: пасведчанне аб нараджэнні, аб рэгістрацыі шлюбу і г.д., — які падлягае замене).

«ЗМЕНА ІМЕНІ — НЕПРЫНЯЦЦЕ СЯБЕ»

— Складана штосьці сцвярджаць адназначна, бо кожная сітуацыя індывідуальная, — кажа **псіхолаг Алена ВОСІПАВА**. — Часам імя мяняюць з-за негатыўных асацыяцый, напрыклад, са сваяком, з якім склаліся дрэнныя адносіны. Альбо ўсіх жанчын у родзе называлі Вольгамі, у іх быў нешчаслівы лёс, таму вы хочаце гэтага пазбегнуць. Часта дзяўчаты з мужчынскімі імёнамі (Аляксандра, Яўгенія) адчуваюць нейкія рамкі, якія скоўвалі іх жаноцкасць і выбіраюць больш жаночае імя. Ёсць людзі, якія такім чынам быццам бы адкрыта заяўляюць свету: «Я не такі, як усе. Вы пра мяне яшчэ пачуеце». Акрамя таго, гэта можа быць пратэст у адносінах да бацькоў. Імя — гэта наша самаідэнтыфікацыя, працяг нашай асобы. І калі вы хочаце яго змяніць, значыць, у нейкай ступені не прымаеце сябе. У большасці выпадкаў гэта сведчыць пра праблемы з самаацэнкай — завышанай або заніжанай. Людзі спадзяюцца, што незвычайнае імя дапаможа зрабіць кар'еру, стаць паспяховым, што ў іх пачнецца новае жыццё. Маўляў, з'явіцца літара «р» — і ўсё зменіцца, знікне няўпэўненасць у сабе. Але, як правіла, гэта проста спроба сысці ад рашэння ўнутраных праблем. Калі чалавек зрабіў пластычную аперацыю, выправіў форму носа, гэта ж не значыць, што ён змяніўся ўнутрана. Так і тут. Калі вы не будзеце працаваць над сабой, то праблема застанецца, незалежна ад таго, памяняеце вы імя ці не.

Надзея ДРЫНДРОЖЫК. *dryla@zviazda.by*

ФАКТЫ ПАДЗЕІ НАВІНЫ ФАКТЫ ПАДЗЕІ НАВІНЫ

84-ГАДОВАГА ДЗЯДУЛЮ ВЫРАТАВАЛІ САЛДАТЫ

Жыхар вёскі Вялаўск, што ў Петрыкаўскім раёне, сышоў у невядомым напрамку са сваёй хаты. Пра гэта паведаміла сацработнік. Яна прыйшла да пенсіянера, які мае сур'ёзныя праблемы з памяццю.

Дзядуля і раней пакідаў дом, і жыхары вёскі яго адшуквалі. На гэты раз на пошукі накіраваліся не толькі сваякі, але і супрацоўнікі МНС, а таксама 30 салдат вайсковай часці №5525 МУС Рэспублікі Беларусь. Тэрыторыю прачэсвалі ланцугом. Праз паўтары гадзіны, прыкладна за два кіламетры ад вёскі, малодшы сяржант Аляксандр Шпанькоў і яфрэйтар Багдан Удодаў у траве знайшлі пажылога мужчыну. Дзядуля не мог нічога расказаць і практычна здранцвеў ад холаду. Пенсіянера даставілі ў Асавецкую ўчастковую бальніцу, а потым — у рэанімацыю Мазырскай раённай бальніцы.

Ірына АСТАШКЕВІЧ. *iost@zviazda.by*

ПРАДАВЕЦ «ХАПНУЛА» ЗОЛАТА НА 130 млн

Супрацоўнікі крымінальнага вышуку за крадзеж ювелірных вырабаў на суму звыш 130 мільёнаў рублёў затрымалі прадаўца-кансультанта адной са сталічных крамаў.

— Да нас звярнуўся дырэктар гандлёвага прадпрыемства, які паведаміў, што падчас праведзенай інвентарызацыі было ўстаноўлена: інфармацыя на ярлыках дваццаці ювелірных вырабаў з золата не адпавядае іх рэальным характарыстыкам, — распавяла прэс-афіцэр Цэнтральнага РУУС г. Мінска Таццяна Абозная. — Як высветлілася, прадавец гэтай крамы, выбірала залатыя вырабы, здымала з іх біркі, а пасля мацавала апошнія на спецыяльна набытыя і знешне падобныя сярэбраныя ўпрыгажэнні, пакрытыя пазалотай. Сапраўдныя залатыя вырабы адносіла ў ламбард.

Сяргей РАСОЛЬКА. *rs@zviazda.by*

ОАО «ЭнКоСтрой»

УНП 191303197

(г. Минск, ул. Монтажников, 39-201)

ПРОВОДИТ ОЧЕРЕДНОЕ ОБЩЕЕ СОБРАНИЕ АКЦИОНЕРОВ ОАО «ЭнКоСтрой» в очной форме 24 марта 2016 года в 11 часов 00 мин. Место проведения собрания: ОАО «ЭнКоСтрой», г. Минск, ул. Монтажников, 39, к. 208.

ПОВЕСТКА ДНЯ СОБРАНИЯ:

1. Итоги финансово-хозяйственной деятельности общества за 2015 год и основные направления деятельности общества в 2016 г.
2. Утверждение годового отчета Общества за 2015 г.
3. Утверждение годовой бухгалтерской (финансовой) отчетности Общества за 2015 г.
4. Утверждение распределения прибыли Общества за 2015 г.
5. О материальном вознаграждении членов совета директоров и ревизионной комиссии общества.
6. Избрание членов совета директоров и ревизионной комиссии общества.

Регистрация лиц, имеющих право на участие в собрании, будет проводиться в день проведения собрания с 10.00 до 10.45 по адресу: ОАО «ЭнКоСтрой», г. Минск, ул. Монтажников, 39, к. 208.

Участники собрания должны иметь при себе документ, удостоверяющий личность (представители акционера – документ, удостоверяющий личность и доверенность).

Дата составления списка владельцев ценных бумаг для регистрации участников собрания по состоянию реестра акционеров на 03.03.2016 г.

Время и место ознакомления лиц, имеющих право на участие в собрании, с материалами по вопросам повестки дня общего собрания: с 9.00 до 9.30 в рабочие дни с 04.03.2016 г. по 24.03.2016 г. по адресу: ОАО «ЭнКоСтрой», г. Минск, ул. Монтажников, 39, к. 208.

ОАО «ЦентроСтройОфис»

УНП 191303207

(г. Минск, ул. Монтажников, 39-208)

ПРОВОДИТ ОЧЕРЕДНОЕ ОБЩЕЕ СОБРАНИЕ АКЦИОНЕРОВ ОАО «ЦентроСтройОфис» в очной форме 24 марта 2016 года в 10 часов 00 мин. Место проведения собрания: ОАО «ЦентроСтройОфис», г. Минск, ул. Монтажников, 39, к. 208.

ПОВЕСТКА ДНЯ СОБРАНИЯ:

1. Итоги финансово-хозяйственной деятельности общества за 2015 год и основные направления деятельности общества в 2016 г.
2. Утверждение годового отчета Общества за 2015 г.
3. Утверждение годовой бухгалтерской (финансовой) отчетности Общества за 2015 г.
4. Утверждение распределения прибыли Общества за 2015 г.
5. О материальном вознаграждении членов наблюдательного совета и ревизионной комиссии общества.
6. Избрание членов наблюдательного совета и ревизионной комиссии общества.

Регистрация лиц, имеющих право на участие в собрании, будет проводиться в день проведения собрания с 09.00 до 09.45 по адресу: ОАО «ЦентроСтройОфис», г. Минск, ул. Монтажников, 39, к. 208.

Участники собрания должны иметь при себе документ, удостоверяющий личность (представители акционера – документ, удостоверяющий личность и доверенность).

Дата составления списка владельцев ценных бумаг для регистрации участников собрания по состоянию реестра акционеров на 03.03.2016 г.

Время и место ознакомления лиц, имеющих право на участие в собрании, с материалами по вопросам повестки дня общего собрания: с 9.00 до 9.30 в рабочие дни с 04.03.2016 г. по 24.03.2016 г. по адресу: ОАО «ЦентроСтройОфис», г. Минск, ул. Монтажников, 39, к. 208.

ОАО «Минскэнергострой»

УНП 100008291

(г. Минск, ул. Монтажников, 39)

ПРОВОДИТ ОЧЕРЕДНОЕ ОБЩЕЕ СОБРАНИЕ АКЦИОНЕРОВ ОАО «Минскэнергострой» в очной форме 24 марта 2016 года в 12 часов 00 мин. Место проведения собрания: ОАО «Минскэнергострой», г. Минск, ул. Монтажников, 39, к. 208.

ПОВЕСТКА ДНЯ СОБРАНИЯ:

1. Итоги финансово-хозяйственной деятельности общества за 2015 год и основные направления деятельности общества в 2016 г.
2. Утверждение годового отчета Общества за 2015 г.
3. Утверждение годовой бухгалтерской (финансовой) отчетности Общества за 2015 г.
4. Утверждение распределения прибыли Общества за 2015 г.
5. О материальном вознаграждении членов наблюдательного совета и ревизионной комиссии общества.
6. Избрание членов наблюдательного совета и ревизионной комиссии общества.

Регистрация лиц, имеющих право на участие в собрании, будет проводиться в день проведения собрания с 11.00 до 11.45 по адресу: ОАО «Минскэнергострой», г. Минск, ул. Монтажников, 39, к. 208.

Участники собрания должны иметь при себе документ, удостоверяющий личность (представители акционера – документ, удостоверяющий личность и доверенность).

Дата составления списка владельцев ценных бумаг для регистрации участников собрания по состоянию реестра акционеров на 03.03.2016 г.

